Родная газета на роднай мове

ЗВЯЗДА

БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

20 СНЕЖНЯ 2008 г.
СУБОТА
№ 241
(26354)

Кошт 500 рублёў

ВЫДАЕЦЦА З 9 ЖНІЎНЯ 1917 Г.

Прэзідэнт Беларусі ўвёў мараторый на праверкі суб'ектаў гаспадарання

Адпаведны Указ № 689 «Аб некаторых мерах па ўдасканаленні кантрольнай і наглядной дзейнасці ў Рэспубліцы Беларусь» падпісаны 19 снежня. Цяпер у мэтах выканання даручэння кіраўніка дзяржавы вядзецца маштабная работа па лібералізацыі ўсіх сфераў дзелавога абароту.

Улічваючы шматлікія скаргі суб'ектаў гаспадарання на немагчымасць нармальна працаваць з-за вялікай колькасці праверак, няўзгодненасць іх правядзення кантралюючымі органамі, назначэнне праверак па фармальных падставах і паводле меркавання кантралюючых і наглядных органаў, кіраўнік дзяржавы прыняў рашэнне аб прыпыненні правядзення кантролю і нагляду за дзейнасцю юрыдычных асобаў і індывідуальных прадпрымальнікаў у форме праверак (рэвізій).

Усе праводзімыя цяпер праверкі (рэвізіі), звесткі аб правядзенні якіх ужо ўнесены ў кнігу ўліку праверак (рэвізій), павінны быць завершаны на працягу 14 дзён.

Правядзенне праверак (рэвізій) прыпынена да прыняцця спецыяльнага Указа Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь, які рэгламентуе адзіны парадак правядзення кантрольнай і наглядной дзейнасці ў рэспубліцы і забяспечвае ўпарадкаванне і скарачэнне колькасці праверак суб'ектаў гаспадарання. Для падрыхтоўкі такога дакумента ўстаноўлены шасцімесячны тэрмін.

У гэты перыяд кіраўнік дзяржавы захаваў магчымасць правядзення толькі строга абмежаванага кола праверак (рэвізій).

Па-першае, выключэнне зроблена адносна праверак (рэвізій), якія праводзяцца па ініцыятыве самога суб'екта гаспадарання, напрыклад, у сувязі з яго рэарганізацыяй або ліквідацыяй.

Па-другое, могуць быць праведзены праверкі фінансава-гаспадарчай дзейнасці юрыдычных асобаў і індывідуальных прадпрымальнікаў па ўзбуджаных крымінальных справах або пачатых адміністрацыйных працэсах у адпаведнасці з працэсуальным заканадаўствам або для спынення злачынстваў і правапарушэнняў, што ўчыняюцца. Але ў апошнім выпадку праверкі могуць праводзіцца выключна пры наяўнасці дакладных звестак аб учыняемым, учыненым злачынстве або адміністрацыйным правапарушэнні і па даручэнні кіраўнікоў толькі трох дзяржаўных органаў — Міністэрства па падатках і зборах (інспекцый па абласцях і г. Мінску), Камітэта дзяржаўнага кантролю (камітэтаў дзяржаўнага кантролю абласцей) і Дзяржаўнага мытнага камітэта.

Па-трэцяе, магчыма правядзенне наглядных праверак толькі па чатырох напрамках — на небяспечных вытворчых аб'ектах, на аб'ектах пры правядзенні дзяржаўнага санітарнага нагляду, дзяржаўнага будаўнічага нагляду і на аб'ектах за забеспячэннем бяспекі людзей. Але нават гэтыя наглядныя праверкі могуць праводзіцца адным і тым жа дзяржаўным органам не раней як праз 12 месяцаў з дня правядзення апошняй праверкі той жа юрыдычнай асобы, індывідуальнага прадпрымальніка. Незалежна ад гэтага тэрміну наглядныя праверкі могуць праводзіцца толькі ў адным выпадку — для спынення ўчыняемых правапарушэнняў і злачынстваў пры наяўнасці дакладных звестак аб такіх фактах.

Па-чацвёртае, не прыпыняецца правядзенне Нацыянальным банкам праверак дзейнасці банкаў і нябанкаўскіх крэдытна-фінансавых арганізацый пры ажыццяўленні нагляду за банкаўскай дзейнасцю.

Пры гэтым кіраўнік дзяржавы даў жорсткае ўказанне, каб новы ўказ аб парадку кантрольнай і наглядной дзейнасці ў краіне, які павінен быць распрацаваны ў шасцімесячны тэрмін, мінімізаваў правядзенне праверак, а па шэрагу напрамкаў — наогул іх выключыў.

Прэс-служба Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь.

Спрошчана працэдура арэнды памяшканняў

У Беларусі спрошчана працэдура арэнды памяшканняў. Аляксандр Лукашэнка 19 снежня падпісаў дэкрэт № 24 «Аб некаторых пытаннях арэнды капітальных пабудоў (будынкаў, збудаванняў), ізаляваных памяшканняў».

Адна з праблемаў, з якой рана ці позна сутыкаецца практычна кожны суб'ект прадпрымальніцкай дзейнасці, — гэта неабходнасць арэнды памяшкання для вытворчай дзейнасці або размяшчэння офіса. У большасці выпадкаў патэнцыяльныя арандатары сустракаюць нежаданне арэндадаўцаў заключаць дагаворы арэнды памяшканняў на працяглыя тэрміны. Пры гэтым адна з прычын адмовы ў заключэнні працяглых дагавораў арэнды — неабходнасць дзяржаўнай рэгістрацыі дагавораў арэнды, заключаных на тэрмін звыш аднаго года, і праходжання даволі забюракратызаванай працэдуры такой рэгістрацыі. Таму на практыцы ў арэнду (субарэнду) прадастаўляюцца плошчы, як правіла, толькі на 11 месяцаў.

Такое становішча, з аднаго боку, не дае магчымасці арандатарам арганізаваць стабільную работу, а з другога — з'яўляецца спрыяльнай глебай для розных злоўжыванняў.

Для вырашэння гэтай праблемы кіраўнік дзяржавы падпісаў дэкрэт, якім устаноўлены мінімальны тэрмін арэнды (субарэнды) капітальных пабудоў (будынкаў, збудаванняў), ізаляваных памяшканняў, што знаходзяцца як у дзяржаўнай, так і ў прыватнай уласнасці, — тры гады. На тэрмін менш як тры гады дагаворы могуць быць заключаны толькі са згоды арандатараў.

Дадаткова для зняцця залішніх бюракратычных бар'ераў і стымулявання суб'ектаў да заключэння доўгатэрміновых дагавораў дэкрэтам адменена дзяржаўная рэгістрацыя дагавораў арэнды, субарэнды нерухомай маёмасці і бязвыплатнага карыстання ёю, уносімых у гэтыя дагаворы змяненняў (дапаўненняў) і скасавання такіх дагавораў. Такія дагаворы будуць лічыцца заключанымі з дня іх падпісання бакамі.

На арэндадаўцаў (пазыкадавальнікаў) ускладаецца толькі адзін абавязак: праінфармаваць на працягу дзесяці дзён у адвольнай форме тэрытарыяльную арганізацыю па дзяржаўнай рэгістрацыі нерухомай маёмасці, правоў на яе і здзелак з ёю (па месцы знаходжання нерухомай маёмасці) аб заключаным дагаворы, унясенні ў яго змяненняў або скасаванні, для ўнясення запісу ў рэгістр. Пры гэтым за ўнясенне гэтага запісу дзяржаўная пошліна і (або) плата з суб'ектаў гаспадарання спаганяцца не будзе. Уся працэдура — бясплатная.

Прэс-служба Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь.

Беларускія дзеці змогуць у час канікулаў выязджаць на аздараўленне за мяжу

Аляксандр Лукашэнка 19 снежня падпісаў Указ № 688 «Аб прыпыненні дзеяння Указа Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь ад 13 кастрычніка 2008 г. № 555».

Гэты дакумент прыпыняе на перыяд калядных і навагодніх святаў (з 20 снежня 2008 года да 20 студзеня 2009 года) абмежаванні па выездзе беларускіх дзяцей на аздараўленне ў замежныя дзяржавы, з якімі да гэтага часу не заключаны міжнародныя дагаворы. Гэтыя абмежаванні былі ўведзены Указам Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь ад 13 кастрычніка 2008 г. № 555.

Кіраўнік дзяржавы прыняў у парадку выключэння названае рашэнне з улікам таго, што работа па заключэнні такіх дагавораў у поўным аб'ёме не завершана, але ёсць шэраг загадзя запланаваных паездак беларускіх дзяцей за мяжу па лініі дабрачынных арганізацый.

З просьбамі аб дазволе выезду дзяцей за межы Рэспублікі Беларусь у перыяд зімовых канікулаў звярталіся бацькі, апекуны, замежныя арганізацыі, якія займаюцца аздараўленнем беларускіх дзяцей.

Гэты крок беларускага боку, прыняты таксама насустрач адпаведным зваротам Еўрапейскага саюза і ўрадаў шэрагу дзяржаў — членаў ЕС, з'яўляецца чарговым праяўленнем добрай волі, што сведчыць аб рэальным імкненні Беларусі да развіцця супрацоўніцтва з нашымі партнёрамі ў канструктыўным ключы і стварэнні атмасферы ўзаемнага даверу.

Дзеянне Указа мае часовы характар, што павінна садзейнічаць актывізацыі работы па стварэнні належнай міжнародна-прававой базы ў галіне аздараўлення беларускіх дзяцей за мяжой.

Прэс-служба Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь.

НА ПОЎНЫМ СУР'ЁЗЕ

Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

З сённяшняга дня і да 31 снежня Мінскі Дзед Мароз і Снягурка пачынаюць не толькі вывучаць лісты з пажаданнямі сталічнай дзятвы, але і сустракаць малечу ў сваёй зімовай хатцы ў Цэнтральным гарадскім дзіцячым парку імя Горкага.

Людзей з такімі лёсамі, як у **Ганны Апанасаўны БРАТКОЎСКАЙ,** на нашай зямлі засталіся адзінкі. Ведаць пра іх абавязаны не толькі родныя дзеці і ўнукі. Падчас нямецкай акупацыі яна цудам перажыла ажно тры карныя аперацыі. Першы раз бяда прыйшла ў лясную вёску Жылін Брод на Случчыне ў кастрычніку 1942-га. Яе спалілі разам з жыхарамі. Ганне з бацькамі і сёстрамі наканавана было застацца жыць. Сям'я перабралася ў недалёкую вёсачку Беразінец, але пражыла там нядоўга — 23 лютага 1943 года накатваецца чарговая карная хваля, гарыць і гэтая вёска, і зноў гінуць у полымі людзі. Гэтым разам бяда не абмінула шаснаццацігадовую Ганну: жыўцом згарэлі маці, малодшы брат і чатырохгадовая сястрычка. Самой ёй давялося пасяліцца ў шалашы пад лясnымі шатамі. Здавалася, горшага ўжо і быць не можа. Але ў чэрвені 44-га зноў спусташальная блакада. «Сем дзён мы ляжалі ў вадзе вароніцкіх балот не паднімаючы галавы, пакуль не сціх свіст куль», — узгадвае Ганна Апанасаўна дні, калі рэшткі людзей са спаленых вёсак шукалі сабе паратунку ў непраходных багнах сярод купін, мала хто верыў, што будзе жыць. І што будуць яны сведкамі гэтага пекла.

А жыць з гэткай цяжкай і балючай памяццю ім проста наканавана. Крыўда за перажытае і перанесенае, як на злосць, ніколі не праходзіць. Перадаць жа словамі трагедыю тых горкіх дзён немагчыма. І таму замест слоў надыходзіць маўчанне і накочваюцца слёзы. Але Ганна Браткоўская ўсё роўна радуецца жыццю, як можа радавацца маці і бабуля і нават прабабуля. Бо ў яе чацвёра дзяцей, дзевяць унукаў і два праўнукі. Жыве гэтая сведка жудасных падзей у вёсцы Шантароўшчына, зусім побач з тымі мясцінамі, якія зведалі нябачнае дагэтуль ліха. На зіму пераязджае да сваёй малодшай дачкі Наталлі (на фотаздымку), улетку зноў поле грады, збірае ягады, глядзіць унукаў.

Анатоль КЛЯШЧУК. Фота аўтара.

Слуцкі раён

НАША ЗАДАЧА — СТВАРЭННЕ ЯКАСНЫХ ЗАКОНАЎ

Выступленне Старшыні Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь БАТУРЫ Б.В. на закрыцці першай сесіі Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь чацвёртага склікання

Фота БЕЛТА.

Паважаныя члены Савета Рэспублікі!

Паважаныя запрошаныя і журналісты!

Сёння завяршаецца першая сесія Савета Рэспублікі чацвёртага склікання, пры адкрыцці якой былі вырашаны арганізацыйна-кадравыя пытанні. Абрана кіраўніцтва Савета Рэспублікі, створаны Прэзідыум, утворана пяць пастаянных камісій.

Сярод нашых парламентарыяў — лаўрэаты дзяржаўных прэмій, прафесары, акадэмікі, кіраўнікі прадпрыемстваў і арганізацый, старшыні выканаўчых камітэтаў гарадскога і абласнога ўзроўню, абласных Саветаў дэпутатаў. Упэўнены, новы склад Савета Рэспублікі забяспечыць пераемнасць заканатворчасці, у аснове якой ляжыць прынцып адказнасці за лёс краіны.

На гэтай сесіі намі прыняты шэраг важных рашэнняў. Так, у сферы заканадаўства аб ахове навакольнага асяроддзя і рацыянальным выкарыстанні прыродных рэсурсаў ухвалены праект Закона Рэспублікі Беларусь «Аб ахове атмасфернага паветра». Яго палажэнні накіраваныя на захаванне і аднаўленне якасці атмасфернага паветра, а таксама забеспячэнне экалагічнай бяспекі.

У сферы сацыяльнай абароны ўхвалены Закон Рэспублікі Беларусь «Аб сацыяльнай абароне грамадзян, пацярпелых ад катастрофы на Чарнобыльскай АЭС, іншых радыяцыйных аварый». Замацаваныя ў ім нормы грунтуюцца на асноватворных пазіцыях дзейнага заканадаўства і накіраваныя на абарону правоў і інтарэсаў удзельнікаў ліквідацыі наступстваў катастрофы і іншых радыяцыйных аварый, а таксама пацярпелага ад іх насельніцтва.

(Заканчэнне на 2-й стар.)

ЗАКОН ПАВІНЕН АДПАВЯДАЦЬ ПАТРАБАВАННЯМ ЖЫЦЦЯ

Выступленне Старшыні Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь АНДРЭЙЧАНКІ У.П. на закрыцці першай сесіі Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь чацвёртага склікання

Фота БЕЛТА.

Паважаныя дэпутаты, запрошаныя, журналісты!

Першая сесія Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь чацвёртага склікання завяршае сваю работу. Праведзена 10 пасяджэнняў Палаты прадстаўнікоў, у тым ліку два сумесныя з Саветам Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, разгледжана 44 пытанні парадку дня.

Падводзячы вынікі, неабходна адзначыць, што ўсе арганізацыйныя пытанні вырашаны аператыўна і дэмакратычна: выбрана кіраўніцтва Палаты прадстаўнікоў, сфарміраваны яе Савет, пастаянныя камісіі, іншыя рабочыя органы.

З улікам неабходнасці комплекснага вырашэння задач, якія стаяць перад Палатай прадстаўнікоў, асаблівая ўвага была ўдзелена наладжванню кантактаў з калегамі з Савета Рэспублікі, выбудоўванню дакладнай сістэмы ўзаемадзеяння з Адміністрацыяй Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь, Урадам Рэспублікі Беларусь, міністэрствамі і іншымі ўдзельнікамі заканатворчага працэсу. У мэтах удасканалення заканадаўчай дзейнасці пры Савеце Палаты прадстаўнікоў сфарміравана рабочая група па арганізацыі вывучэння дэпутатамі практыкі прымянення заканадаўства і ўзаемадзеяння з мясцовымі органамі ўлады.

Усяго ў ходзе сесіі прынята 10 законапраектаў у першым чытанні, 10 — у другім, у тым ліку 3 законапраекты аб ратыфікацыі міжнародных дагавораў. Разгледжаны і прыняты па ведама 3 дэкрэты Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь.

(Заканчэнне на 2-й стар.)

ЗАРОБКІ ПЛАНАЎ НЕ ЗМЯНЯЮЦЬ

Урад, аб'яднанні наймальнікаў і прафсаюзы падпісалі Генеральнае пагадненне на 2009-2010 гады. Пры гэтым, як адзначыў першы віцэ-прэм'ер Уладзімір Сямашка, новы трохбаковы дагавор не пагаршае, а па некаторых пазіцыях нават паляпшае цяперашнія сацыяльна-эканамічныя дамоўленасці.

Паводле слоў старшыні Федэрацыі прафсаюзаў Леаніда Козіка, папярэдняе Генпагадненне аказалася выкананым цалкам. У прыватнасці, з 2006 па 2008 год сярэдняя зарплата па краіне ўзрасла з 242 да 451 долара. Пры гэтым рост рэальных, з улікам інфляцыі, заробкаў, адбываўся штогод. Як вынік, павысілася іх пакупніцкая здольнасць. Калі ў 2006 годзе сярэдняя зарплата адпавядала 209 працэнтам мінімальнага спажывецкага бюджэту, то сёлета — 274 працэнтам.

У той жа час у раскладзе на заўтра пакуль стаяць пытанні. Як адзначыў Леанід Козік, зыходзячы з магчымых уплываў сусветнага фінансавага крызісу і цяжка прагназуемай сітуацыі, прафсаюзы «адмовіліся ад узмацнення некаторых пазіцый». І ў той жа дасягнутая дамоўленасць: цяперашнія сацыяльна-працоўныя гарантыі не зменшацца.

Так, вызначана, што ў найбліжэйшы час памер дапамогі на дзіця ва ўзросце да 3 гадоў выйдзе на адзнаку бюджэту пражыткавага мінімуму, аб'ёмы будаўніцтва жылля ў 2009 годзе павялічацца да 6,0 млн, а ў 2010 годзе — да 7,5 млн квадратных метраў, захаваюцца цяперашнія віды бясплатнай медыцынскай дапамогі, колькасць «ільготных» пуцёвак для дзяцей. Апроч таго, пацверджаны намер даваць маламаёмным грамадзянам адрасную сацыяльную дапамогу. Пры гэтым «планка даплат» можа змяніцца: да 2010 года плануецца перагледзець саму структуру бюджэту пражыткавага мінімуму з улікам новых рэалій.

І яшчэ. Як падкрэсліў першы віцэ-прэм'ер Уладзімір Сямашка, ці не галоўнай мэтай на найбліжэйшы час становіцца захаванне працоўных месцаў. Для рэгіёнаў, дзе адзначаецца ўзровень беспрацоўя ў 2 і больш працэнтаў, будуць распрацоўвацца спецыяльныя праграмы занятасці.

Тым часам захаванне стабільнага рынку працы — задача невыпадковая. Пакуль тэмпы росту айчыннага ВУП не знізіліся. Аднак эканоміка Беларусі зарыентавана на экспарт і перш-наперш — на Расію. А цяпер расіяне адчуваюць наступствы фінансавай нестабільнасці спаўна. У сувязі з гэтым, паведаміў Уладзімір Сямашка, урад вызначае некалькі адметных накірункаў. Скажам, каб мець абаротныя сродкі, прадпрыемствам дадзены дазвол на продаж прадукцыі ніжэй за сабекошт. Вырашана ўтрая павялічыць бюджэтныя выдаткі на зняншэнне ставак па крэдытах вытворцам, прычым у асобных выпадках падобная льгота можа распаўсюджвацца на ўсю працэнтную стаўку. Плюс да таго, да вясны наступнага года ёсць намер стварыць нацыянальную лізінгавую кампанію для прасоўвання айчынных тавараў за мяжой.

Усё гэта павінна дапамагчы прытрымацца «экспартным» прадпрыемствам і здзейсніць шэраг буйных інвестыцыйных праектаў. У прыватнасці, гаворка ідзе аб будаўніцтве беларускай АЭС. Як паведаміў прэм'ер-міністр Уладзімір Сямашка, урад вызначае развіццё падзей будзе шмат у чым залежаць ад сітуацыі ў першым квартале наступнага года. Цалкам верагодна, што тэмпы эканамічнага развіцця могуць замарудзіцца. Разам з тым, Савет Міністраў плануе, што надалей рост паскорыцца і ў выніку ўдасца выканаць паказчыкі павелічэння ВУП за год у цэлым. Гэта дазволіць забяспечыць сацыяльныя гарантыі і павышаць зарплату. Нягледзячы на ўсе акалічнасці, паказчыкі праграмы сацыяльна-эканамічнага развіцця да 2010 года тут не адмяняюцца.

Пры гэтым узровень аплаты працы ў рэальным сектары будзе залежаць ад канкрэтных прадпрыемстваў. Што да бюджэтнай сферы, то да пытання павышэння заробкаў тут мяркуецца вярнуцца ў верасні. Разам з тым, зазначыў першы віцэ-прэм'ер, сёння ёсць усе падставы разлічваць на пэўнае зняншэнне цэнаў. І перш-наперш на прамысловую прадукцыю — у свеце таннеюць сыравіна, матэрыялы і камплектаваныя часткі.

Асобная гаворка пра тарыфы на жыллёва-камунальныя паслугі. Прагназаваць іх пакуль цяжка — застаецца невядомай цана на расійскі газ. Урад Беларусі лічыць, што павышэнне не павінна быць значным і зыходзіць з лічбы 140 долараў за кубаметр. З аднаго боку, гэта тлумачыцца шматразовым зніжэннем цэнаў на нафту на сусветных рынках. А з іншага, заўважыў Уладзімір Сямашка, ужо з'явілася інфармацыя: урад Расіі не лічыць мэтазгодным павышаць цэны на газ для ўнутраных спажыўцоў больш чым на 5 працэнтаў.

Сяргей ГРЫБ.

Аляксандр Лукашэнка возьме ўдзел у матчы паміж камандамі «Зборная зорак свету» і «Газпрам экспарт» у Маскве

Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка ўчора прыбыў у Маскву. Аляксандр Лукашэнка прыме ўдзел у хакейным матчы паміж камандамі «Зборная зорак свету» і «Газпрам экспарт», які пройдзе вечарам у Маскве.

Прэс-служба Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь.

РОЗГАЛАС

АПОШНЯЯ ІНФАРМАЦЫЯ СУТАК

ЧАЦВЁРА ВАЙСКОЎЦАЎ ЗАГІНУЛІ Ў ДТЗ

Буйное дарожна-транспартнае здарэнне, у якое трапілі вайскоўцы вайсковай часці Дзяржаўнага памежнага камітэта Беларусі, адбылося днём на дарозе паблізу Давыд-Гарадка Столінскага раёна.

На пачатку першай гадзіны дня вадзіцель аўтамабіля ГАЗ, 25-гадовы радавы кантрактнай службы, пры абгоне выехаў за межы праезнай часткі, пасля чаго машына перакулілася на абочыне. У выніку шэсць чалавек — вадзіцель, 28-гадовы капітан, 23-гадовы старшы лейтэнант (адпаведна намеснік каменданта і начальнік вузла сувязі памежнай камендатуры «Рэчыца»), а таксама 19-гадовы радавы тэрміновай службы, 21-гадовы яфрэйтар і 22-гадовы радавы — атрымалі траўмы рознай ступені цяжкасці і былі змешчаны ў бальніцу. Яшчэ чацвёра — 28-гадовы прапаршчык, 27-гадовы старшы сяржант і 21-гадовы малодшы сяржант — вайскоўцы кантрактнай службы, а таксама 23-гадовы радавы тэрміновай службы загінулі на месцы здарэння.

Ігар ГРЫШЫН.

ЗЛОЎЖЫВАННЕ ПАЦЯГНУЛА НА 3 МЛРД 200 МЛН?..

Генеральнай пракуратурай па матэрыялах Галоўнага ўпраўлення па барацьбе з арганізаванай злачыннасцю МУС узбуджана крымінальная справа ў дачыненні да 33-гадовага беспрацоўнага жыхара Жодзіна.

Раней падазроны працаваў на «БелАЗе» ў знешнегандлёвым аддзеле. У той час, з лютага па ліпень, як мяркуецца, падазроны скарыстаўшыся службовым становішчам, нанёс урон прадпрыемству ў памеры 3 мільярдаў 200 мільёнаў рублёў.

Дзмітрый СТАНКОВІЧ.

АБРЫНУЛАСЯ ПРЫБУДОВА ДА ШКОЛЫ

У чацвер вечарам у Смаргоні абвалілася прыбудова да будынка сярэдняй школы № 2, паведаміў карэспандэнту «Звязды» прэс-сакратар Міністэрства па надзвычайных сітуацыях Беларусі Віталь Навіцкі.

Здарылася гэта каля паловы дзясятай вечара, калі ў прыбудове не было людзей. Кінолагі, якія абследавалі завалы, пацвердзілі, што ніхто не пацярпеў. Віталь Навіцкі ўдакладніў, што прыбудова была ўзведзена ў 1960 годзе, а 9 снежня з-за трэшчын у сценах мясцовае ўпраўленне адукацыі забараніла яе эксплуатацыю. У двухпавярховай прыбудове абрынулася, дарэчы, цагляная кладка на плошчы 190 квадратных метраў і дах на плошчы 150 квадратных метраў.

Ігар ГРЫШЫН.

Распродажы тавараў не спыняцца з надыходам Новага года...

...калі будзе на тое жаданне вытворцаў

«Навасёлкін» рэкамендуе завяршыць рамонт да Новага года», «МЕГА-распродаж абутку», «СУПЕРцэны да 31 снежня», «Набудзь халадзільнік і атрымаеш кошык з прадуктамі ў падарунак», «Пры набыцці камп'ютара — у падарунак DVD-прайгравальнік» — такімі аб'явамі літаральна стракаціць сталічны метрапалітэн. Між іншым, калі яшчэ некалькі гадоў таму журналісты цікавіліся ў прадстаўнікоў гандлю, ці прыжывецца калі-небудзь у нас сусветная практыка арганізоўваць напярэдадні навагодніх святаў распродажы тавараў, тыя толькі разводзілі рукамі — маўляў, мы б і гатовы пайсці на зніжэнне гандлёвай надбаўкі, але ж істотна на цану мы не ўплываем. Вось калі б вытворцы пайшлі на зніжэнне адпускной цаны, але тыя, відаць па ўсім, не былі ў зніжках зацікаўленыя...

— У гэтым годзе сітуацыя кардынальна змянілася, — паведаміла на прэс-канферэнцыі ў Нацыянальным прэс-цэнтры **начальнік упраўлення гандлю і паслуг Міністэрства гандлю Рэспублікі Беларусь Людміла ПЕТРАКОЎСКАЯ.** — На працягу снежня па краіне ўжо было праведзена больш за 300 кірмашоў, арганізавана 3 тысячы распродажаў тавараў і 582 рэкламныя акцыі. Да таго ж з удзелам беларускіх вытворцаў зараз праходзяць кірмашы ў Маскве, Санкт-Пецярбургу, Смаленску, Бранску, Маскоўскай вобласці, Вялікім Ноўгарадзе — у Расіі працуюць 46 нашых гандлёвых арганізацый і 92 прамысловыя прадпрыемствы. Усяго плануецца ахапіць 31 суб'ект Расійскай Федэрацыі.

(Заканчэнне на 4-й стар.)

Прыродны і звадкаваны газ «узважаць» па-новаму

У адпаведнасці з пастановай Савета Міністраў змяніліся тарыфы на прыродны і звадкаваны газ.

З пачатку студзеня кошт 1 куб. метра прыроднага газу ў жылых дамах і кватэрах, а таксама ў садовых доміках і дачах членаў садаводчых таварыстваў (у тым выпадку, калі ўсталяваны прыборы індывідуальнага ўліку і ёсць газавыя ацяпляльныя прыборы і воданагравальнікі) у ацяпляльны перыяд складзе 219,1 рубля, а ў летні — 462. Пры адсутнасці індывідуальных газавых ацяпляльных прыбораў адпаведныя расцэнкі будуць 462 руб. за «куб». Калі лічыльнікаў няма, то пры наяўнасці газавай пліты і цэнтралізаванага гарачага водазабеспячэння альбо індывідуальнага воданагравальніка (за выключэннем газавага) штомесячныя плацяжы з аднаго жыхара складуць 3696 рублёў. Калі ёсць газавая пліта і газавы воданагравальнік (пры адсутнасці цэнтралізаванай падачы «цёпленькай»), то адпаведная сума складзе 10 626 руб. з чалавека. У тым выпадку, калі ёсць газавая пліта і няма цэнтралізаванага гарачага водазабеспячэння і газавага воданагравальніка, то існуе плацеж у памеры 6006 рублёў з чалавека.

Пры наяўнасці індывідуальных газавых ацяпляльных прыбораў у ацяпляльны перыяд неабходна будзе штомесяц выкласці 1403,2 рубля за 1 кв. метр агульнай плошчы жылога памяшкання, а ў летні — 526,2 рубля. Адзін «куб» прыроднага газу, які выкарыстоўваецца для ацяплення нежылых памяшканняў (акрамя памяшканняў, што знаходзяцца ў жылых дамах) пры ўмове таго, што ўсталяваны прыборы індывідуальнага ўліку расходу газу, каштуе 462 рублі. Без лічыльнікаў за «блакітнае паліва» для абагрэву цяпліц (збудаванняў уцепленага грунту) неабходна разлічвацца па тарыфе 13 860 рублёў за 1 кв. метр у месяц. Для гаражоў, майстэрняў і інш. адпаведная расцэнка складае 8778 рублёў.

Павялічаны расцэнкі і на звадкаваны газ. Цяпер у жылых дамах і кватэрах, дзе ўсталяваны спецыяльныя прыборы індывідуальнага ўліку расходу і ёсць газавыя абагравальныя прыборы і газавыя воданагравальнікі, у ацяпляльны сезон за 1 куб. метр неабходна выкласці 4227,9 рубля, а ў летні — 1233 рублі (апошні тарыф дзейнічае і ў тым выпадку, калі няма індывідуальных газавых ацяпляльных прыбораў). Для тых жыхароў, якія не маюць індывідуальных лічыльнікаў, расцэнкі крыху іншыя. Калі ёсць газавая пліта і цэнтралізаванае гарачае водазабеспячэнне альбо воданагравальнік (за выключэннем газавага), то штомесячныя плацяжы за звадкаваны газ на аднаго чалавека складуць 3699 рублёў. Калі ж ёсць газавая пліта і газавы воданагравальнік (пры адсутнасці цэнтралізаванага гарачага водазабеспячэння), то тарыф складае 10480,5 рубля з чалавека. Пры наяўнасці газавай пліты і адсутнасці цэнтралізаванага гарачага водазабеспячэння і газавага воданагравальніка неабходна выкласці 4932 рублі з аднаго чалавека ў месяц.

Калі ўсталяваны індывідуальныя газавыя ацяпляльныя прыборы, то ў ацяпляльны перыяд за 1 кв. метр агульнай плошчы жылога памяшкання штомесяц трэба плаціць 12683,7 рубля, а ў летні — 1233 рублі. За балон звадкаванага газу (вагой 21 кг) неабходна аддаць 33 140 рублёў.

Мікалай ЛІТВІНАЎ.

ISSN 1990 - 763X

Курсы замежных валют, устаноўленыя НБ РБ з 20.12.2008 г. (для б/н разлікаў)

1 долар ЗША	2 200,00
1 еўра	3 097,49
1 латвійскі лат	4 373,32
1 літоўскі літ	896,64
1 чэшская крона	117,25
1 польскі злоты	749,87
1 расійскі рубель	79,32
1 украінская грыўня	254,34

Курсы замежных валют для безнаяўных разлікаў

Цэнтрабанк РФ

USD	27,7351
10 UAH	30,7314
1000 BYR	12,6011
EUR	39,5475

Курс у гандлёвых кампаніях (на 19.12.2008 г.)

USD ..... 2250 / 2300

Агенцтва Уладзіміра Граўцова

Падпішыцеся на часопіс «Главный Бухгалтер. ГБ» на 2009 год у рэдакцыі па самай выгаднай цане. Тэлефон рэдакцыі: 209-69-01.

ААТ «Агенцтва Уладзіміра Граўцова» УНП 100024047 Ліцэнзія Мінсувязі № 02140/0172806 выд. 03.05.2004 да 02.05.2009

«У Беларусі будзе праведзена лібералізацыя не толькі эканомікі, але і жыццядзейнасці ўсяго грамадства»

У Еўропе ёсць разуменне таго, што патрабаванні, якія выстаўляюцца Еўрасаюзам, непрымальныя для Беларусі. Такую думку Прэзідэнт краіны Аляксандр Лукашэнка выказаў 18 снежня ў інтэрв'ю кіраўнікам вядучых беларускіх СМІ.

«Еўрасаюз нам прад'явіў для выканання 12 умоў, нават не падумаўшы, наколькі рэальна іх выкананне ў нашых умовах. Думаю, што еўрапейцы пачалі гэта разумець, — сказаў Аляксандр Лукашэнка. — Мне здаецца, яны належным чынам ацанілі нашу краіну. Разумеюць, што спакойная, стабільная Беларусь — гэта каштоўнасць для самой Еўропы».

Кіраўнік дзяржавы таксама падзякаваў як Еўрасаюзу, так і ЗША за падтрымку Беларусі ў перагаворах з МВФ. Паводле яго слоў, гэта сведчыць аб разуменні амерыканцамі необходнасці нармалізаваць адносіны з нашай краінай. У цэлым жа Беларусь настойліва выступае за іх нармалізацыю. «Хацелася б, каб новая Адміністрацыя гэта разумела», — сказаў беларускі лідар.

Прынцып «аднаго акна» рэалізаваны ў Беларусі не ў поўнай меры

«Добрая ідэя, але мы з ёй не справіліся. Таму мы яшчэ раз паспрабуем гэта зрабіць разам, паспрабуем ператварыць у сапраўднае «акно», каб людзі не мучыліся», — сказаў кіраўнік дзяржавы.

Інакш, папярэдзіў Прэзідэнт, будуць прыняты жорсткія меры. І гэта ў большай меры датычыцца Мінска, паколькі такіх працэсаў у вёсцы, у раённых цэнтрах, нават у абласных гарадах, не так многа, як у сталіцы. «Таму я вельмі часта жорстка крытыкую сталічныя ўлады. І мікшыраваць ні ў якім разе гэта нельга», — адзначыў Аляксандр Лукашэнка.

Прэзідэнт заклікаў журналістаў да большай жорсткасці і аб'ектыўнасці ў ацэнках працэсаў дэбюракратызацыі. «Не трэба нікога шкадаваць, шкадуйце грамадства, шкадуйце дзяржаву, выяўляйце, паказваючы добрае і побач дрэннае, каб людзі разумелі, што ў нас ёсць добрыя прыклады. Чаму ж кіраўнік не вучыцца там, дзе добра? Не ўтойвайце факты», — звярнуўся кіраўнік дзяржавы да сродкаў масавай інфармацыі.

«Але прынцып «аднаго акна» мы рэалізуем. Гэта дакладна», — запэўніў Прэзідэнт.

БЕЛТА.

НА КАНІКУЛЫ

У апошні дзень сваёй першай сесіі парламентарыі абедзвюх палат атрымалі ад урада адказы на самыя надзённыя пытанні і разгледзелі шэраг законапраектаў.

— Ёсць усе падставы меркаваць, што гэты год мы завяршым годна, хоць быў ён даволі складаным, — адзначыў, выступаючы ў Авальнай зале, **віцэ-прэм'ер Віктар БУРА.** — Паводле папярэдніх звестак, будуць выкананыя ўсе асноўныя паказчыкі сацыяльна-эканамічнага развіцця, за выключэннем знешнегандлёвага балансу краіны. Тэмп росту ВУП па выніках 2008 года чакаецца не ніжэйшы за 110,2 працэнта, тэмп росту прадукцыі прамысловасці — 111,7, спажывецкіх тавараў — 112, інвестыцый у асноўны капітал — 120 працэнтаў.

Пры гэтым наменсік прэм'ер-міністра прызнаў, што сітуацыя ў эканоміцы складваецца нестандартная. У выніку ўплыву сусветных працэсаў агульнай тэндэнцыяй стала апошнім часам замарудванне эканамічнага росту. Адмоўнае сальда знешняга гандлю, паводле яго слоў, ацэньваецца ў суму 3,6 млрд доларaў. Каб мінімізаваць наступствы глабальнага фінансавага крызісу на айчынную эканоміку, распрацаваны комплекс папераджальных мераў, накіраваных у тым ліку на «падтрымку банкаўскай сферы, стабільнасці на валютным рынку, скарачэнне дзяржаўных выдаткаў».

— Прыярытэтным павінен стаць прынцып захавання рэальнага сектара эканомікі, пры гэтым асаблівая ўвага засяродзваецца на аптымізацыі выдаткаў і іх скарачэнні, — падкрэсліў віцэ-прэм'ер.

У выніку «рэвізіі» дзяржпраграм, паводле слоў В. Буры, выдаткі на «другасныя патрэбы» будуць скарочаны або пакінуты да лепшых часоў. Аднак у цэлым курс эканомікі захаваецца нязменным.

Ён нагадаў, як важна ўтрымліваць традыцыйныя рынкі збыту і асвойваць новыя, развіваць сельскую гаспадарку, падтрымліваць малы і сярэдні бізнэс, пашыраць праграму будаўніцтва жылля для насельніцтва. Дарэчы, сёлета за 11 месяцаў па ўсёй краіне ўведзена ў эксплуатацыю 4,3 млн квадратных метраў жылля. Забяспечанасць насельніцтва жыллём вырасла з 18 да 23 квадратных метраў на чалавека (з 1991 года). Чакаецца, што ў 2011 годзе будзе ўзведзена 10 млн квадратных метраў жылля.

Паводле інфармацыі віцэ-прэм'ера, каля 200 тыс. гаспадароў жылых памяшканняў адмаўляюцца ад устаноўкі прыбораў для ўліку расходу вады. Таму ён звярнуўся да дэпутатаў з просьбай правесці тлумачальную работу ў сваіх акругах, асабліва ў сельскай мясцовасці. Тым больш, што грамадзян заахвочваюць рублём: тыя, хто ўсталяваў лічыльнікі сёлета, атрымаюць «20-працэнтныя скідкі з тарыфаў за ваду і каналізацыю» ў першыя два гады пасля ўсталявання прыбораў уліку.

Адным з прыярытэтных накірункаў у галіне сувязі, паводле слоў спадара Буры, з'яўляецца развіццё паслуг перадачы звестак, у тым ліку шырокапалоснага доступу ў інтэрнэт. Разлічваецца, што налета ў краіне будзе забяспечана ўкараненне сотавай рухомай электрасувязі трэцяга пакалення (3G). Дарэчы, абанентаў сотавай сувязі ў Беларусі амаль восем мільёнаў.

Адказваючы на пытанні дэпутатаў, віцэ-прэм'ер развеяў іх асцярогі наконт праблемаў з крэдытаваннем жыллёвага будаўніцтва. Для таго каб пазбегнуць іх, павялічаны статутныя фонды чатырох найбуйнейшых дзяржаўных банкаў, на долю якіх прыходзіцца каля 73 працэнтаў у агульнай структуры крэдытных устаноў.

Міністр эканомікі Беларусі Мікалай ЗАЙЧАНКА супакоіў парламентарыяў — адтоку ўкладаў няма, насельніцтва давярае банкам. Пры гэтым ён падкрэсліў важнасць набыцця айчынных тавараў. «Калі на знешніх рынках мы, безумоўна, губляем з-за сціскання гэтага рынку, зніжэння цэнаў на ім, то мы павінны максімальна падтрымаць на ўнутраным рынку», — запэўніў палітык. А закупка імпартных тавараў на фоне гэтага — не што іншае, як адток валюты з краіны. «Таму сёння мы павінны ўсе кансалідавацца», — адзначыў міністр і заклікаў «накіраваць нашы патрэбы на айчынныя тавары».

Адказваючы на хвалюючыя пытанні аб магчымым пагаршэнні сітуацыі з беспрацоўем, **міністр працы і сацыяльнай абароны Уладзімір ПАТУПЧЫК** праінфармаваў, што рэсурсаў, якія закладзены, дастаткова для таго каб вырашыць пытанні з перападрыхтоўкай спецыялістаў, выплатай дапамог і гэтак далей. На сёння на адну вакансію даводзіцца менш за аднаго беспрацоўнага. Калі нейкія праблемныя пытанні ўзнікнуць, міністэрства адэкватна на іх адрэагуе — запэўніў выступоўца. Ён таксама праінфармаваў, што ў краіне штогод працаўладкоўваецца каля чатырох тысяч людзей з абмежаванымі здольнасцямі.

Дэпутаты паспелі ўчора яшчэ і разгледзець некалькі праектаў законаў. Яны нагадзіліся з прэчаннямі Прэзідэнта адносна паправак у закон аб электрасувязі і адхілілі адпаведны законапраект. Кіраўнік дзяржавы мяркуе, што прыняцце закона, які адмяняе выключнае права нацыянальнага аператара электрасувязі на далучэнне сетак электрасувязі да сеткі электрасувязі агульнага карыстання і пропуск трафіку, дачаснае, — сказана ў заключэнні профільнай камісіі Палаты прадстаўнікоў.

Народныя абраннікі прынялі ў першым чытанні праект закона аб органах і падраздзяленнях па надзвычайных сітуацыях Рэспублікі Беларусь. Паводле яго, у тэлефонных сетках будзе ўстаноўлены адзіны нумар для перадачы паведамленняў аб надзвычайных сітуацыях — 112. Як адзначыў **Валянцін КАРПІЦКІ, першы намеснік міністра па надзвычайных сітуацыях Беларусі,** ёсць паспяховы міжнародны вопыт у гэтым плане, як напрыклад, «911» у ЗША. «Адзіны нумар больш зручны для насельніцтва», — заўважае спадар Карпіцкі. Наступная сесія чакае парламентарыяў увесну.

Ала МАЧАЛАВА.

Абзац

■ Самы кароткі дзень і самая доўгая ноч у гэтым годзе чакаюць беларусаў 21 снежня ў дзень зімовага сонцастаяння. Даўжыня дня складзе 7 гадзін 24 хвіліны. Сонца ўзыдзе ў 8 гадзін 26 хвілін, зойдзе за гарызонт у 15 гадзін 50 хвілін. Але ўжо з 26 снежня цёмны час сутак пачне пакрысе памяншацца. Астранамічная зіма закончыцца ў паўночным паўшар'і 20 сакавіка — у дзень вясновага раўнадзенства.

■ У Мінску за суткі па медыцынскую дапамогу звярнуліся 126 чалавек з траўмамі з-за галалёду. У сувязі з гэтым медыкі раяць пешаходам быць гранічна абачлівымі, не насіць абутак з гумавай падэшвай, а жанчынам — адмовіцца ад высокіх абцасаў.

■ Навукова-практычны цэнтр НАН Беларусі па бульбаводстве экспартуе ў Расію сёлета ў снежні і ў першым паўгоддзі наступнага года не менш за 350 т насеннай бульбы. Так, днямі адправіцца 40 т супер-суперэліты «Скарбу» і «Журавінкі» ў Ніжагародскую вобласць. Наша насенне купляюць не толькі буйныя сельскагаспадарчыя прадпрыемствы суседняй краіны, але і фермерскія гаспадаркі.

■ Больш за $25 тыс. канфіскавана ў валютчыкаў у Лідзе. Аперацыю правялі супрацоўнікі Лідскага міжраённага аддзела фінансавых расследаванняў КДК Гродзенскай вобласці. Затрыманы трое грамадзянаў, што ажыццяўлялі незаконныя абменныя аперацыі. Канфіскаваныя ў іх грошы былі ў розных валютах. За такое парушэнне прадугледжваецца штраф да 300 базавых велічыняў.

■ У Заслаўі ў адной з кацельняў ЖКГ, якая абслугоўвала лакаматыўнае дэпо і 12-кватэрны жылы дом, узарваўся кацёл. Пацярпелых няма. У выніку выбуху ў памяшканні кацельні вылецела шкло і абвалілася пліта перакрыцця. Прычына выбуху высвятляецца. Для забеспячэння падачы цяпла ў жылы дом была дастаўлена перасоўная дызельная кацельня.

Поўны абзац

■ У адной з галерэй Венецыі адчыняецца ўнікальная выстава малюнкаў, зробленых мустангам па мянушцы Чоя. Кошт твораў каня перавышае часам 2 тыс. фунтаў ($3 тыс.). Па меркаванні арганізатараў выставы, жывёліна не капіруе чыесьці малюнкі ці знакі, як гэта робяць, напрыклад, дрэсіраваныя слоны, а стварае свае арыгінальныя творы. Упершыню талент Чоі праявіўся чатыры гады, калі жывёліна з цікавасцю назірала, як гаспадыня бяліла агароджу. Тады муж жанчыны жартам прапанаваў аддаць каню пэндзаль. З таго ўсё і пачалося.

ЗАКОН ПАВІНЕН АДПАВЯДАЦЬ ПАТРАБАВАННЯМ ЖЫЦЦЯ

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

Адным з найбольш важных вынікаў заканадаўчай дзейнасці стала прыняцце блока законапраектаў у сацыяльнай сферы.

У галіне пенсійнага заканадаўства прыняты праект Закона «Аб унясенні дапаўненняў і змяненняў у некаторыя законы Рэспублікі Беларусь па пытаннях дзяржаўнага сацыяльнага страхавання і занятасці насельніцтва». Карэкціроўка нормаў заканадаўства ў гэтай сферы абумоўлена ўвядзеннем прафесійнага пенсійнага страхавання і прызначана вырашыць пытанні фарміравання крыніц фінансавання датэрміновых пенсій за работу ў шкодных умовах працы. Выкарыстанне пакетнага прынцыпу пры падрыхтоўцы законапраекта дало магчымасць унесці папраўкі не толькі ў базавы Закон «Аб пенсійным забеспячэнні», але і ў іншыя законы па пытаннях сацыяльна-працоўных адносінаў.

Асаблівую сацыяльную важнасць мае прыняты праект Закона «Аб сацыяльнай абароне грамадзян, якія пацярпелі ад катастрофы на Чарнобыльскай АЭС, іншых радыяцыйных аварый». У ім дакладна вызначаны катэгорыі грамадзян, на якіх распаўсюджваюцца меры сацыяльнай абароны, прадугледжана сістэмнае і комплекснае рэгуляванне льгатаў, правоў і гарантый для грамадзян, пацярпелых ад катастрофы на Чарнобыльскай АЭС, іншых радыяцыйных аварый.

У мэтах рэалізацыі канстытуцыйнага права грамадзян Рэспублікі Беларусь на добрае навакольнае асяроддзе прыняты праект Закона «Аб аховe атмасфернага паветра». Сярод яго навацый — стварэнне прававых асноў для ўкаранення і выкарыстання найлепшых даступных тэхнічных метадаў, якія даюць магчымасць забяспечыць дасягненне ўстаноўленых нарматываў якасці атмасфернага паветра, а таксама спрашчэнне сістэмы адміністравання пры атрыманні дазвольных дакументаў на выкіды забруджвальных рэчываў у атмасфернае паветра.

Сярод сацыяльных законапраектаў трэба адзначыць і прыняты ў першым чытанні праект Закона «Аб унясенні дапаўненняў і змяненняў у Закон Рэспублікі Беларусь «Аб лекавых сродках».

Аператыўна праводзілася работа над законапраектамі, накіранымі на павышэнне ўстойлівасці фінансавай сістэмы, далейшую лібералізацыю эканомікі. Размова ідзе перш за ўсё аб прынятых у першым чытанні праектах законаў «Аб унясенні змяненняў і дапаўненняў у Закон Рэспублікі Беларусь «Аб валютным рэгуляванні і валютным кантролі» і «Аб унясенні змяненняў і дапаўнення ў некаторыя кодэксы Рэспублікі Беларусь па пытаннях накладання арышту на грашовыя сродкі на рахунках, у банкаўскіх укладах (дэпазітах) і прыпыненні аперацый па рахунках». Іх нормы прызначаны садзейнічаць эфектыўнаму функцыянаванню грашова-крэдытнай сістэмы, росту інвестыцый і зберажэнняў, абароне эканамічных інтарэсаў нашай дзяржавы.

У мэтах развіцця цывілізаваных эканамічных адносінаў і фарміравання прывабнага дзелавога асяроддзя прыняты праект Закона Рэспублікі Беларусь «Аб таварных біржах». Канструктыўнай работе над законапраектам садзейнічала правядзенне Пастаяннай камісіяй Палаты прадстаўнікоў па прамысловасці, паліўна-энергетычным комплексе, транспарту, сувязі і прадпрымальніцтве выязнога пасяджэння, прысвечанага вывучэнню дзейнасці таварных біржаў.

У гэтым блоку законапраектаў неабходна таксама адзначыць прыняты ў першым чытанні праект Закона «Аб унясенні дапаўненняў і змяненняў у некаторыя законы Рэспублікі Беларусь па пытаннях інтэлектуальнай уласнасці», накіраваны на ўдасканаленне рэгулявання адносінаў, звязаных з рэгістрацыяй, прававой абаронай і выкарыстаннем таварных знакаў і знакаў абслугоўвання, абаронай правоў іх уладальнікаў і спыненнем нядобрасумленнай канкурэнцыі ў гэтай галіне.

Узмацненне эканамічнай нестабільнасці ў свеце патэнцыяльна нясе ў сабе верагоднасць росту палітычных пагроз. У мэтах іх прадухілення ў ходзе сесіі разгледжаны шэраг законапраектаў у сферы нацыянальнай бяспекі і абароны.

У другім чытанні прыняты законапраекты, накіраваныя на ўдасканаленне заканадаўства па пытаннях дзейнасці пракуратуры Рэспублікі Беларусь, дзяржаўнага і мабілізацыйнага матэрыяльных рэзерваў. Паспяхова прайшлі этап першага чытання праекты законаў «Аб органах і падраздзяленнях па надзвычайных сітуацыях Рэспублікі Беларусь», «Аб дзяржаўнай ахове», а таксама законапраекты, якія прадугледжваюць унясенне змяненняў і дапаўненняў у Закон «Аб Узброеных Сілах Рэспублікі Беларусь» і ў некаторыя кодэксы Рэспублікі Беларусь па пытаннях абароны дзяржаўных сакрэтаў.

Прадаўжалася работа над удасканаленнем заканадаўства ў галіне дзяржаўнага будаўніцтва. Дэпутаты разгледзелі і прынялі ў першым чытанні праект Закона «Аб унясенні змяненняў і дапаўненняў у Закон Рэспублікі Беларусь «Аб статусе дэпутата мясцовага Савета дэпутатаў».

Унесены ўклад і ў фарміраванне міжнароднай дагаворна-прававой базы Рэспублікі Беларусь. Прыняты рашэнні аб ратыфікацыі Мемарандума аб узаемаразуменні паміж Урадам Рэспублікі Беларусь і Урадам Дзяржавы Катар па пытаннях супрацоўніцтва ў галіне бяспекі, міжурадавага Пагаднення з Сацыялістычнай Рэспублікай В'етнам аб супрацоўніцтве ў галіне каранціну і аховы раслін, а таксама Пагаднення паміж Рэспублікай Беларусь і Камісіяй Еўрапейскіх супольніцтваў аб заснаванні, прывілеях і імунітэтах Прадстаўніцтва Камісіі Еўрапейскіх супольніцтваў у Рэспубліцы Беларусь.

У мэтах забеспячэння такога важнага напрамку дзейнасці Палаты прадстаўнікоў, як міжпарламенцкае супрацоўніцтва, у ходзе сесіі праведзена работа па фарміраванні нацыянальных дэлегацый у 12 міжнародных парламенцкіх арганізацыях. Завяршаецца стварэнне камісій і рабочых груп па супрацоўніцтве на двухбаковай аснове з парламентамі 41 дзяржавы свету.

Асноўным вынікам 35-й сесіі Парламенцкага Сходу Саюза Беларусі і Расіі, якая прайшла ў г. Мінску 16 снежня 2008 года, стала вырашэнне арганізацыйных пытанняў, звязаных з абнаўленнем дэпутацыі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь у Парламенцкім Сходзе.

Дэпутаты актыўна ўключыліся ў работу інтэграцыйных органаў на постсавецкай прасторы. Дэлегацыя Парламента прыняла ўдзел у мерапрыемствах Міжпарламенцкай Асамблеі дзяржаў — удзельніц Садружнасці Незалежных Дзяржаў, Міжпарламенцкай Асамблеі Еўразійскага эканамічнага супольніцтва і Парламенцкай Асамблеі Арганізацыі Дагавора аб калектыўнай бяспецы, якія праходзілі 24-25 лістапада 2008 года ў г. Санкт-Пецярбургу. Удзел у гэтых мерапрыемствах быў выкарыстаны для правядзення двухбаковых сустрэч з кіраўнікамі парламенцкіх дэлегацый Арменіі, Малдовы, Расіі, Таджыкістана, у ходзе якіх абмеркаваны пытанні развіцця двухбаковага ўзаемадзеяння і ўзаемнай падтрымкі ў міжпарламенцкіх арганізацыях.

Неабходна таксама адзначыць плённы ўдзел дэпутатаў Палаты прадстаўнікоў у 32-м пленарным пасяджэнні Генеральнай асамблеі Парламенцкай Асамблеі Чарнаморскага эканамічнага супольніцтва, якое праходзіла 4-5 лістапада 2008 года ў Рэспубліцы Малдова, а таксама кантактаў з Парламенцкай Асамблеяй АБСЕ, Парламенцкай структурай Цэнтральнаеўрапейскай ініцыятывы, Паўночным Саветам.

Адбыўся візіт у Рэспубліку Беларусь парламенцкай дэлегацыі Босніі і Герцагавіны на чале са Старшынёй Палаты прадстаўнікоў Парламенцкай асамблеі Босніі і Герцагавіны Ніка Лазанчычам. Праведзеныя перагаворы, як і дасягнутыя дамоўленасці, паказалі зацікаўленасць бакоў у развіцці супрацоўніцтва па ўсім спектры двухбаковых адносінаў.

У лістападзе-снежні 2008 года ў Палаце прадстаўнікоў адбылося 16 сустрэч з замежнымі парламентарыямі, палітыкамі і дыпламатамі, у тым ліку з Прэм'ер-міністрам Сірыі М.Наджы аль-Отры, Міністрам замежных спраў Ірана М.Маткакі, парламентарыямі Славакіі, паслам В'етнама, Карэі, Ірана, з кіраўніком Офіса АБСЕ у Мінску Гансам-Ёганам Шмітам, з дэлегацыямі дзелавых колаў Фінляндскай Рэспублікі і Сусветнай арганізацыі скаўцкага руху.

Асабліва хачу адзначыць работу, праведзеную ў выбарчых акругах. Менш як за два месяцы дэпутаты прынялі 2187 грамадзян, правялі больш як 370 сустрэч у працоўных калектывах. Разгледжаны 1982 звароты выбаршчыкаў. Дэпутаты прынялі ўдзел у 96 пасяджэннях мясцовых выканаўчых камітэтаў, 60 сесіях мясцовых Саветаў дэпутатаў.

І ўсё ж, паважаныя калегі, асноўная работа ў нас наперадзе. Ужо сёння на разглядзе ў пастаянных камісіях знаходзіцца 27 праектаў законаў.

У міжсесійны перыяд неабходна завяршыць работу над падрыхтоўкай шэрагу законапраектаў да разгляду ў другім чытанні. Сярод іх асабліва адзначу праект Закона «Аб унясенні змяненняў і дапаўненняў у некаторыя законы Рэспублікі Беларусь па пытаннях сацыяльнай абароны грамадзян, якія пацярпелі ад катастрофы на Чарнобыльскай АЭС».

У адпаведнасці з планам падрыхтоўкі законапраектаў у Палату прадстаўнікоў унесены праект Закона «Аб асновах дзяржаўнай маладзёжнай палітыкі». Чакаецца ўнясенне новых дакументаў. Сярод іх — законапраект, які прадугледжвае папраўкі ў некаторыя законы па пытаннях прававога становішча замежных грамадзян і асобаў без грамадзянства ў Рэспубліцы Беларусь, а таксама па пытаннях грамадзянства Рэспублікі Беларусь.

Самая сур'ёзная ўвага павінна быць удзелена ўдасканаленню грамадзянскага заканадаўства, заканадаўства аб прадпрымальніцкай, гаспадарчай (эканамічнай) дзейнасці. Нам трэба будзе разгледзець законапраекты аб унясенні змяненняў і дапаўненняў у Грамадзянскі кодэкс Рэспублікі Беларусь па пытаннях дзейнасці ўнітарных прадпрыемстваў, садоўніцтва таварыстваў, долевага будаўніцтва, у законы «Аб асновах транспартнай дзейнасці», «Аб гаспадарчых таварыствах», а таксама праект Закона «Аб электронным дакументе і электронным лічбавым подпісе».

У сферы заканадаўства аб фінансава-крэдытнай сістэме неабходна сканцэнтраваць намаганні на падрыхтоўцы новай рэдакцыі Закона «Аб дэклараванні фізічнымі асобамі даходаў, маёмасці і крыніц грашовых сродкаў».

У галіне заканадаўства аб абароне і нацыянальнай бяспецы чакаецца ўнясенне праекта Закона «Аб статусе ваеннаслужачых».

Для таго каб якасна падрыхтаваць гэтыя законапраекты, трэба ўжо цяпер, не трацячы часу, уключыцца ў работу над імі. Гэта дасць магчымасць наперад зняць многія праблемы, забяспечыць аператыўнае прыняцце запатрабаваных грамадствам прававых рашэнняў.

Насычанай будзе і міжнародная дзейнасць.

У лютым 2009 года ў г. Мінску плануецца правядзенне 36-й сесіі Парламенцкага Сходу Саюза Беларусі і Расіі.

Чакаюцца візіты ў Рэспубліку Беларусь парламенцкіх дэлегацый Арменіі, Лівана, Фінляндыі, а таксама дэлегацый ПАСЕ, Паўночнага Савета, Рабочай групы ПА АБСЕ па Беларусі. Прапрацоўваюцца візіты парламенцкіх дэлегацый Рэспублікі Беларусь у В'етнам, Іран, Украіну.

Дэпутаты возьмуць удзел у зімовай сесіі ПА АБСЕ і мерапрыемствах па лініі Міжпарламенцкай Асамблеі праваслаўя.

Плануецца правядзенне другога сумеснага семінара дэлегацыі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь у ПА АБСЕ і Рабочай групы ПА АБСЕ па Беларусі па інвестыцыйнай тэматыцы.

На заканчэнне, паважаныя калегі, дазвольце падзякаваць вам за плённую работу і павіншаваць усіх з надыходзячым Новым годам і Калядамі святамі. Жадаю вам моцнага здароўя, дабрабыту, поспехаў і ўдачы ва ўсіх справах.

НАША ЗАДАЧА — СТВАРЭННЕ ЯКАСНЫХ ЗАКОНАЎ

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

Не засталіся без увагі і эканамічныя пытанні. Палажэнні Закона Рэспублікі Беларусь «Аб таварных біржах» накіраваныя на стварэнне прававой асновы для актывізацыі біржавога гандлю краіны.

Паважаныя калегі!

У гэты час у Рэспубліцы Беларусь дзейнічае некалькі найважнейшых для нашай дзяржавы праграм: сацыяльна-эканамічнага развіцця, развіцця рэгіёнаў, малых і сярэдніх гарадскіх пасяленняў, інавацыйнага развіцця і іншыя. Нацыянальны сход ужо ўнёс свой уклад у прававое забеспячэнне механізмаў рэалізацыі гэтых праектаў. Аднак існуючая ў гэты час сітуацыя ў эканоміцы краіны абумоўлівае неабходнасць пошуку новых падыходаў да прыняцця рашэнняў. У сувязі з гэтым яшчэ большую значнасць набывае пажаданне Кіраўніка дзяржавы, выказанае ім у адрас новабраных парламентарыяў: «заканатворчы працэс павінен стаць больш дысцыплінаваным і рацыянальным на ўсіх стадыях — ад планавання законапраектаў да іх аператыўнага прыняцця». Для дасягнення гэтай мэты Савет Рэспублікі ажыццяўляе самае цеснае ўзаемадзеянне з усімі суб'ектамі заканадаўчай ініцыятывы і зацікаўленымі, прымяняе розныя формы працы — «круглыя сталы», семінары, тэматычныя, выязныя і пашыраныя пасяджэнні. За гэты невялікі перыяд праведзены пашыраныя і выязныя пасяджэнні пастаянных камісій па найважнейшых законапраектах — аб прафесійным пенсійным страхаванні, аднаўляльных крыніцах энергіі і іншых. Падрыхтаваны план такіх мерапрыемстваў на першую палову наступнага года.

У мэтах павышэння эфектыўнасці заканатворчасці пачаў працу інфармацыйна-аналітычны партал Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь. Адным з яго асноўных прызначэнняў з'яўляецца размяшчэнне на ім тэкстаў законапраектаў, разгледжаных у Палаце прадстаўнікоў у першым і другім чытаннях. Такім чынам, паважаныя члены Савета Рэспублікі, вы будзеце мець магчымасць аператыўна азнаёміцца з імі ў глабальнай сетцы «Інтэрнэт».

Важным кірункам у працы Савета Рэспублікі з'яўляецца міжнароднае і міжпарламенцкае ўзаемадзеянне. За гэты перыяд завяршылася фарміраванне прадстаўніцтваў Савета Рэспублікі ў 11 міжпарламенцкіх арганізацыях і ўтворана Нацыянальная група Рэспублікі Беларусь у Міжпарламенцкім Саюзе.

Дэлегацыя Савета Рэспублікі чацвёртага склікання ўжо ўзяла ўдзел у лістападаўскіх мерапрыемствах МПА СНД, МПА ЕўрАзЭС і ПА АДКБ, падчас якіх была закладзена арганізацыйная аснова для прадукцыйнай заканатворчай працы беларускіх парламентарыяў ў названых арганізацыях. Гэтаму ў многім будзе садзейнічаць і зацвярджаныя намі План абмену вопытам прававога забеспячэння развіцця інтэграцыі ў рамках ЕўрАзЭС і Перспектыўны план мадэльнай заканатворчасці і збліжэння нацыянальнага заканадаўства ў СНД.

У сесійны перыяд адбыліся мае сустрэчы з пасламі Ірана і Індыі. Вынікі перамоваў дазваляюць сцвярджаць, што пераемнасць у далейшым развіцці адносінаў Рэспублікі Беларусь з гэтымі краінамі захаваецца па ўсіх кірунках, у тым ліку і ў сферы міжпарламенцкіх кантактаў.

Паважаныя калегі!

Ва ўмовах глабальнага валютна-фінансавага крызісу важна не толькі праводзіць узважаную ўнутраную палітыку, але і актыўна супрацоўнічаць з замежнымі краінамі ў эканамічнай сферы. У працэсе міжпарламенцкай дзейнасці члены Савета Рэспублікі павінны ў поўнай меры садзейнічаць далейшаму развіццю такіх адносінаў. Кожная паездка за мяжу, кожная сустрэча з замежнымі дэлегацыямі тут, у Рэспубліцы Беларусь, павінна мець і практычную накіраванасць: разгляд магчымасцяў прыцягнення інвестыцый у эканоміку краіны і нарошчванне экспарту беларускай прадукцыі, супрацоўніцтва ў інавацыйнай сферы.

У сесійны перыяд дабратворнай была і праца Савета па ўзаемадзеянні органаў мясцовага самакіравання. Чарговае яго пасяджэнне праведзена на базе Бабруйскага і Асіповіцкага раёнаў Магілёўскай вобласці. Былі вызначаны шляхі ўзаемадзеяння Саветаў дэпутатаў базавага і пярвічнага ўзроўняў з выканаўчымі і распарадчымі органамі ў ходзе рэалізацыі праграмы развіцця рэгіёнаў, малых і сярэдніх гарадскіх пасяленняў.!

Спецыяльная рабочая група, створаная ў мэтах вывучэння і абагульнення станоўчага вопыту, які ўжо маецца ў гэтай сферы, падрыхтуе адпаведныя рэкамендацыі.

Устанавілася таксама больш цеснае супрацоўніцтва Савета па ўзаемадзеянні органаў мясцовага самакіравання з Кангрэсам мясцовых і рэгіянальных уладаў Савета Еўропы. Трэцяга снежня прынята рашэнне аб прадастаўленні яму статуса назіральніка ў гэтай еўрапейскай структуры, што, несумненна, будзе садзейнічаць далейшаму развіццю нашых адносінаў.

Паважаныя калегі!

Чарговы міжсесійны перыяд павінен стаць не менш эфектыўным і плённым. Пастаянныя камісіі Савета Рэспублікі і Сакратарыят Савета Рэспублікі будуць актыўна ўзаемадзейнічаць з Палатай прадстаўнікоў па падрыхтоўцы законапраектаў. Палаты парламента — гэта «два цэхі аднаго завода». Наша мэта — стварэнне канчатковага прадукту, якаснага закона. Таму, я лічу, усе пытанні, якія ўзнікаюць па праектах законаў, неабходна здымаць у рабочым парадку, каб не даводзіць іх да адхілення.

Асаблівую ўвагу кожнаму з нас варта звярнуць на працу са зваротамі грамадзян. Своечасовы, нефармальны разгляд кожнай заявы ці скаргі, вызначэнне сутнасці ўзнятых у іх пытанняў, прыняцце канкрэтных мераў па абароне законных інтарэсаў людзей — вось асноўныя складнікі дзейнасці кожнага члена Савета Рэспублікі. Акрамя таго, давяральны дыялог па найважнейшых пытаннях развіцця краіны будзе спрыяць з'яўленню новых ідэй у заканатворчасці, і дазволіць нам пазбегнуць памылак.

Прашу вас таксама больш актыўна супрацоўнічаць са сродкамі масавай інфармацыі. Матэрыялы аб рабоце Савета Рэспублікі ў газетах, на радыё і тэлебачанні дапамогуць раскрыць многія яе аспекты, што ў сваю чаргу будзе садзейнічаць павышэнню палітычнай культуры грамадства.

Дзякую вам, дарагія сябры, за зробленую працу і віншую з надыходзячымі Новым 2009 годам і Калядамі! Жадаю вам, вашым родным і блізкім добрага здароўя і шчасця!

Дзякуй за ўвагу!

ПАКЛОН ПАЭТКІ

Пайшла з жыцця цудоўная беларуская паэтка Ніна Мацяш

«Паэтка ласкаю Божай», — так гавораць пра яе невыпадкова.

Лёс нібыта ўвесь час выпрабоўваў яе. На талент. На цярпенне і цярплівасць. На дабрыню і зычлівасць...

«Хай жураўлём абернецца сініца...» — напісала Ніна ў адным з вершаў.

А можа, пяшчотна-спавядальны паэтычны дар Ніны — гэта і ёсць сапраўды чароўны Журавель, а зусім не сціплая сініца?..

Лёс мой,
лёс мой — цяжкі колас,
часам — цяжкі камень...
Мне люляць цябе да скону
кволымі рукамі...

Так атрымалася, што цяжкая хвароба ўжо дзяўчынай прыкавала Ніну да інваліднага крэсла. Але крыж свайго лёсу — «цяжкі колас», «цяжкі камень» — яна несла годна... Пра сваю вымушаную прыладу руху яна з усмешкай гаварыла: «мой вазок»...

А нарадзілася Ніна Мацяш у вёсцы Нівы Бярозаўскага раёна Брэсцкай вобласці 20 верасня 1943 года. У 1960 г. скончыла Бярозаўскую сярэднюю школу і паступіла на факультэт французскай мовы Мінскага дзяржаўнага педагагічнага інстытута замежных моў. З-за хваробы вымушана была ўзяць акадэмічны адпачынак, скончыла інстытут у 1966-м. Пэўны час працавала выкладчыцай нямецкай мовы ў Белаазёрскім вучылішчы.

Друкавацца пачала ў 1962 годзе. Аўтар зборнікаў паэзіі «Агонь», «Удзячнасць», «Ралля суровая», «Прыручэнне вясны», «Поўны келіх», «Жнівень», «Паварот на лета» (выбранае), «Шчаслівай долю назаві», іншых.

Ніна Мацяш вядомая не толькі як паэтэса, але і як драматург. Надзвычай плённа яна працавала і як перакладчык. Перакладала з нямецкай, польскай, французскай моў...

Панянькавала за свой век нямала
Мар, і памкненняў, і жаданняў я,
А заклінаю так, як заклінала:
Хай беражэ цябе любоў мая...

...Некалькі гадоў таму я прыязджала да Ніны ў Белаазёрск. Нейкай спецыяльнай нагоды не было. Проста яшчэ раз прачытала вершы, прысвечаныя маці і бацьку... ТАК, як напісала для сваіх бацькоў — і пра сваіх бацькоў — Ніна Мацяш, мабыць, не напісаў ніхто. Гэтаксама, як паэтка — перакананая! — можа сказаць бальшыня з нас.

...Мы гулялі з Нінай па прыгожым Белаазёрску — я ішла, Ніна ехала побач на сваім «вазку» — і ўсе-ўсе віталіся з паэткай. Віталіся па-беларуску. І гаварылі добрыя словы. І ласкава ўсміхаліся... А Ніна з гонарам расказвала пра сваіх землякоў. Часу хапала, два дні мы з задавальненнем гутарылі і пра паэзію, і пра каханне, пра любоў (памятаеце радкі з яе верша: «Я не кахаю вас. Я вас люблю»?..), дый увогуле — пра жыццё.

На развітанне Ніна падарыла зробленую ёю карціну з рознакаляровых птушыных пёрак — каб журавель быў не ў небе, а побач. Гэта Нініна мастакоўска-паэтычная работа — заўсёды над маім рабочым сталом. Сёння з сумам зняла яе са сцяны — каб яшчэ раз прывітацца з паэткай. І — развітацца...

Ніна Мацяш была шчырым сябрам і аўтарам нашай газеты. У пачатку гэтага года яна брала ўдзел у «Літаратурнай анкеце «Звязды» (дарэчы, здымак, які мы публікуем сёння, яна выбрала сама і даслала ў рэдакцыю па электроннай пошце, з якою была,

ПА НОВЫ ГОД Ў ВЁСКУ

Блудныя дзеці каля лімоннай ёлкі

Навагоднюю ёлку ў Нясяцкім сельсавеце ўсталявалі і ўпрыгожылі даўно: каб у літаральным сэнсе адчуваць пах свята, прасякацца адпаведным настроем і рыхтавацца да Новага года.

— Усе нашы сем'і настроеныя на тое, каб прыняць дадому сваіх «блудных» сыноў і дачок, якія жывуць і працуюць у гарадах, — усміхаецца старшыня сельсавета Анатоль Гертман. — І година іх сустрэць. Для гэтага на кожным вясковым стале будзе скварка і чарка.

Сустрэча самога Анатоля Барысавіча са сваякамі адбудзецца на глебе не толькі багатага застолля. Сапраўдны вясковы гаспадар лічыць, што для добрага свята мала паесці і папіць разам, а трэба зрабіць агульную справу. Сёлета гэтай справай будзе свіння кілаграмаў на 150. Прыгатаванне талакой традыцыйных мясных далікатэсаў дадасць Новаму году адценне сямейнай еднасці. «Толькі агульны інтарэс трымае людзей разам!» — кажа Гертман і пра сваю сям'ю, і пра вёску ўвогуле.

Пра планы на Новы год старшыня сельсавета распавядае ў кабінеце, дзе мае асабістае навагодняе дрэва. Яго ролю выконвае лімон, які ўпіраецца ў столь. Дрэва ўпрыгожылі штучнымі лімонамі і гірляндай з лямпачкамі. На стале ў Анатоля Барысавіча — каляндар ужо новага, 2009-га года.

Старшыня Нясяцкага сельсавета Анатоль ГЕРТМАН зрабіў лімоннае дрэва навагоднім.

— Мы вельмі чакаем наступнага года, таму што ён у нас будзе выбітным, — тлумачыць ён. — Паводле праграмы адраджэння вёскі, Нясята зменіць сваё аблічча і стане аграгарадком.

Добрае сэрца і пальцам пханая каўбаса

— У маім дзяцінстве так бедна было, што на ёлкі мы выразалі ўпрыгажэнні з газеты. Потым, калі пажаніліся і дзяцей нарадзілі, не ведалі, ува што апрануць малых. А цяпер кажуць, што гора. Якое гора? Толькі жыць! Добра жыць.

Так разважае жыхарка вёскі Віркаў Ганна Іванаўна Лапаціна — гаспадыня тыповага беларускага сялянскага падворка. Працалюбівая жанчына сама спраўляецца з каровай, цялём, трыма свінямі, цэлай чарадой курэй і пеўняў.

Ганна Іванаўна ЛАПАЦІНА: «Навагодні стол павінен быць спрэс застаўлены стравамі».

У яе на двары і ў хаце — ідэальны парадак. І нават дымчатыя каты на платах і аранжавыя гарбузы ўтвараюць разам маляўнічую карцінку. Да арганізацыі навагодняга застолля Ганна Іванаўна, як і да ўсяго, падыходзіць па старых звычаях — адказна і старанна. Рэпетыцыя напярэдадні свята выявіла наступную традыцыю: стол павінен быць «скрозь устаўлены» стравамі, каб няводны госць не меў шанцу застацца галодным.

Як і кожны свядомы вясковец, Лапаціна дастане з лядоўні мяса ад забітага кабанчыка, салёнае сала ды найсмачнейшыя свіныя каўбасы. Ганна Іванаўна аддае перавагу «пальцам пханай» і кансерваванай у слоіку. Потым саленні і квашанні: кіслая капуста, таматы і агуркі.

Сёлета на Клічаўшчыне выдаўся грыбны год, таму дарункі лесу ў розных варыяцыях — абавязковы пункт у святочным меню. Без салатаў таксама не абыдзецца: у вёсцы савецкі «аліўе» папросту называюць «гарошкам» паводле аднаго са складнікаў. А таксама бульба, мёд, віно, хлебная гарэлка...

Усё гэта паставіць на стол Ганна Іванаўна, калі да яе прыедуць яе пяцёра дзяцей і прыйдуць суседзі. Яны будуць віншаваць яе не толькі з Новым годам, але і з днём нараджэння, якое прыпадае акурат на 1 студзеня. У якасці падарункаў яна просіць дзяцей прывезці ёй гарадскіх ласункаў.

— Мне з маёй гаспадаркай можна за харчамі ў краму не хадзіць, але мандарыны на агародзе ў нас не растуць, і шакаладныя цукеркі ў печы рабіць я не ўмею, — усміхаецца Лапаціна.

Няхай будзе снег!

Абапал дарог цягнуцца зусім не па-зімоваму зялёныя палі. У клічаўскай глыбінцы, дзе цяпер зусім няма снегу, часам падаецца, што пахне не Новым годам, а вясной.

— Снег нам абяцаюць, — упэўнена пярэчыць старшыня Віркаўскага сельсавета Іван Гушчын. — Старыя людзі вядуць размову, што паводле народных прыкметаў снежок павінен легчы на Новы год.

У Віркаве і ў яго акрузе святочныя ёлкі ставяць за некалькі дзён да 31 снежня, бо натуральныя лясныя прыгажуні павінны дастаяць да Старога Новага года.

— Раней ёлкі ставілі толькі на свята Нараджэння Хрыстова, — тлумачыць Іван Іванавіч. — А потым іх увогуле забаранялі, пакуль Сталін не паставіў ёлку на Новы год. А што Новы год не адчуваецца, дык гэта няпраўда. Я ўжо мяркую, як мне сыноў сустракаць.

На Новы год дадому прыедзе магілёўскі ліцэіст Міша Гушчын. Юны фізік сёлета атрымаў дыплом першай ступені на міжнародны алімпіядзе ў Маскве.

— Гэта вялікі гонар для мяне, — гаворыць шчаслівы бацька. — Прыедзе сын, як мужыкі павітаемся і абдымемся.

Міша — прыхільнік здаровага ладу жыцця, прынцыпова не ўжывае алкаголь і аддае перавагу гародніне. Таму на святочным стале ў Гушчыных, дзе будзе традыцыйная сельская ежа, улічаць і гастранамічныя інтарэсы маладога пакалення. Тым больш што Гушчын-старэйшы вельмі любіць свой агарод (расліны адказваюць яму тым жа) і забяспечвае сям'ю ўсёй неабходнай вітаміннай прадукцыяй.

А што насуперак сучасным павевам давядзецца шчыльна паесці ўначы — гэта ў Віркаве нікога не палохае. Кажуць, што іх продкі елі два разы на дзень: раніцай перад працай і калі ўжо сонца садзілася. І яшчэ старыя тут кажуць, што калі класціся ў ложак на галодны страўнік — то слабыя дзеці будуць нараджацца.

Чырвоныя ягады — навагодні дэсерт

Растрэсці ўсе, што паелі, у навагоднюю ноч у вяскоўцаў прынята ў клубе. У Нясяце першыя разведчыкі з моладзі ідуць на галоўную плошчу яшчэ да надыходу Новага года, а ўжо пасля 12 гадзін клуб імкліва запаўняецца радасным народам, каб да 5 раніцы весяліцца на дыскатэцы пад віншаванні Дзеда Мароза і Снягуркі.

Староста Нясяты Святлана Паўлаўна Мароз — загадчыца клуба і адказная за навагоднюю весялосць у вёсцы. Таму жанчына больш за 20 гадоў мае аднолькавы сцэнар сустрэчы Новага года: пільны нагляд за дзеяй каля галоўнай вясковай ёлкі ў спалучэнні з кароткачасовымі прабежкамі да сямейнага святочнага стала. Надыход наступнага года выпадае адзначаць толькі маленькім глыткom шампанскага, бо ўсе гуляюць на свяце, а адказная Мароз — на працы.

— Муж ужо прызвычаіўся, — усміхаецца Святлана Паўлаўна. — Хаця і бурчыць часам на маю працу, што мяне вечна няма дома — ні ў святы, ні ў будні.

Відаць, гэта ўсё ж такі перабольшанне. Пакуль жонка рыхтуе святочную праграму, муж дома смажыць дранікі. Супругі чакаюць на свята дзяцей і ўнукаў: для іх Святлана Паўлаўна запоўніла маразільнік рознымі ягадамі. Асарці з працёртых чырвоных ягад з цукрам — як напамін пра цёплае лета.

Староста Нясяты Святлана Паўлаўна МАРОЗ прыгатавала для ўнукаў навагодняе асарці з працёртых чырвоных ягад з цукрам — як напамін пра цёплае лета.

— Я Новы год люблю, — упэўнена сказала Мароз. — Нават нягледзячы на ўсе клопаты. Таму што гэта чыстае і светлае свята, у чаканні радасці.

На пагорку старая сасна і новая царква

Славутасці Віркава — два курганы. Адзін за дзесятак гадоў насыпаў франтавік Іван Радзько, каб пакінуць памяць пра сябе і стварыць помнік усім вяскоўцам, якія загінулі ў час вайны.

Другі — прыродны, на якім яшчэ ў XVIII стагоддзі пабудавалі прыгожую драўляную царкву. Праз дзве сотні гадоў за савецкім часам сюды падагналі трактары, зачапілі званіцу, разбурылі і спалілі будынак. Засталася стаяць сімвалам непахіснасці толькі векавая сасна. Некалькі гадоў таму жыхары Віркава адрадзілі царкву. І нябачна яна створана з сялянскай хаты, але курган зноў стаў святым месцам.

За мінулым часам менавіта на гэтым пагорку клаўся першы снег, і вясёлая дзятва бегла катацца на санках, і ў Новы год таксама. Каля сасны прызначалі сустрэчы і спатканні.

Сёння на вуліцы ля царквы жыве толькі адзін жыхар. Але сустракаць Новы год у гордай адзіноце 82-гадовы Уладзімір Емяльянавіч Карнушэнка не будзе — ён чакае дзяцей у госці.

— Набуду ў краме бутэльку шампанскага, а закуска ёсць свая, — аптымістычна настроены стары. — У маёй гаспадарцы ніякі крызіс, пра які ў тэлевізары распавядаюць, не адчуваецца. Конь ёсць, агарод апрацую, мяса нарыхтаваў, куры нясуць яйкі, пенсію прыносяць своечасова. Так што ўсё ў нас тут добра!

Вясковы гаспадар крызісу не баіцца

Новы 2009-ты год надыходзіць ў час сусветнага фінансавага крызісу. Не трэба хлусіць, што нашу краіну ён не закрануў. І не толькі прамысловыя прадпрыемствы, якія адчуваюць цяжкасці са збытам прадукцыі, але і сельскія гаспадаркі.

— Вядома, крызіс зачапіў і глыбінку, — пацвярджае Анатоль Гертман. — Гарадскія сваякі распавядаюць пра свае праблемы, а ў нашых сельскіх гаспадарак таксама ёсць цяжкасці з рэалізацыяй прадукцыі.

Кажуць, што цяпер складана прадаць вырашчаны рапс, а цана на кукурузу меншая за папярэдне меркаваную. Але вопытныя гаспадары не губляюцца і шукаюць выйсце. Напрыклад, плануюць набыць міні-завод і вырабляць з рапсу біядызель.

З любых крызісаў заўсёды ёсць выйсце, лічаць у беларускіх вёсках. І сёння выйсце для сялян — развіццё падсобных гаспадарак.

— Паглядзіце, у пасляваенныя гады людзі, лічы, бясплатна працавалі ў калгасах, але жылі, — пераконвае Іван Гушчын. — Трымалі жывёлу і працавалі на сваіх гаспадарках. Так і выжывалі.

Сёння, кажа старшыня сельсавета, нават калі ў вяскоўца ёсць толькі карова, то і пры самым сціплым даходзе можна пражыць. Літр малака каштуе ў краме больш за тысячу рублёў, а са сваёй каровы можна мець дзесяць літраў штодзень і рабіць сваю смятану, тварог, сыр і масла. Калі частку малака здаваць дзяржаве, то будуць і дадатковыя грошы.

— А калі яшчэ парася ў хляве стаіць і куры па двары бегаюць, то чалавек пры любых катаклізмах не памрэ з голаду, — запэўнівае Гушчын. — А перспектыва развіцця падсобных гаспадарак далей залежыць ад дзяржавы. Мы, сяляне, спадзяёмся на павелічэнне ў наступным годзе закупачных цэнаў на малако. І калі гэта спраўдзіцца, то нам тут крызіс не страшны! У Віркаве пражывуць!

Здароўе, дабрыня, праца, ураджай і добрыя думкі

— Не бяды! Добры быў год! — так падводзіць вынікі 2008-га года Ганна Іванаўна Лапаціна. — Самая мая галоўная надзея на год наступны — каб было здароўе і ніхто не хварэў. Каб была дабрыня і менш злосці ў людзях. Каб ціха было і не было вайны. Каб жылі дзеці, унукі і праўнукі.

— Мы верым, што Новы год прынясе новыя надзеі, што спраўдзяцца мары і ажыццявяцца планы, — сказала Святлана Паўлаўна Мароз. — Мне найбольш хочацца для сябе і сваякоў здароўя. Ну і, вядома ж, ад усяго астатняга мы таксама не адмовімся.

— Я хачу, каб наш Клічаўскі раён развіваўся, каб захаваліся нашы прадпрыемствы ды ствараліся новыя і давалі людзям працу, — выказаў агульную надзею старшыня Віркаўскага сельсавета Іван Гушчын. — Каб у Расіі прымалі нашу прадукцыю. Каб у наступным годзе было добрае надвор'е і каб на нашых палях вырас ураджай не меншы за сёлетні.

— Светлае і добрае заўсёды павінна быць у галаве і ў душы чалавека, — нагадаў пра вечныя каштоўнасці старшыня Нясяцкага сельсавета Анатоль Гертман. — А калі гэтага няма, то і рэчаіснасць, якой бы цудоўнай і добрай яна ні была, падасца цёмнай і шэрай. Таму, нягледзячы на ўсе жыццёвыя цяжкасці, трэба ўсміхацца і спадзявацца на лепшае. З такімі пачуццямі я і жадаю ўсім сустрэць Новы 2009 год!

Ілона ІВАНОВА.

Клічаўскі раён.

Уладзімір Емельянавіч КАРНУШЭНКА жыве каля славутасці Віркава: на кургане каля векавой сасны вяскоўцы адрадзілі праваслаўную царкву.

ФЕРМЕР ВЫПРАМІЎ 1200 МЕТРАЎ РЭЧКІ ЖЭРАБІЛАЎКІ...

Міхаіла Урублеўскага крызіс не палохае, але ён баіцца...

З Урублеўскім я пазнаёміўся на рынку, калі ён з сынам прадаваў рыбу. Праз тры дні ўжо ехаў на фермерскую гаспадарку «Сасновае» на «Ніве», якой кіраваў Міхаіл Станіслававіч. Пакуль ехалі, я паспеў даведацца, што ў фермера 13,5 га зямлі, што ён гадуе рыбу, што ў гаспадарку ўклаў усе свае грошы — узвёў дамбы, пракапаў каналы... а яшчэ Урублеўскі наракаў на лёс, бо над «Сасновым» навісла пагроза.

Гаспадарка знаходзіцца ў жывапісным месцы: наўкол стаіць сцяной лес і адбіваецца ў вадзяной гладзі — хораша. Калі ў 2002 годзе Урублеўскі атрымаў дзяржаўны акт на зямельны ўчастак, які гарантаваў яму арэнду зямлі на ўсё жыццё, то апантана ўзяўся свой надзел асвойваць — пабудаваў хату, пасадзіў сад, праклаў паўтара кіламетра лініі электраперадач, а найбольш сілаў аддаваў рыбе, якая праз пяць гадоў пачала даваць прыбытак.

І сёння «Сасновае» пачало падымацца ад зямлі, бо сваю рыбу фермер можа прадаваць нават зімой. Вада ў спецыяльным бетонным садку не замярзае і пры 15-градусным марозе.

— Мне ніякі крызіс не страшны, — гаворыць М. Урублеўскі, — бо ўсё сваё. Вырошчваю малькоў, гадую рыбу — кармлю сваім камбікормам, сам рыбу прадаю, то што той крызіс! Без усяго чалавек можа абысціся, але толькі не без прадуктаў.

Гаспадар вазіў па сваіх дамбах і каналах, расказваў, колькі працы і грошай ва ўсё гэта ўкладзена. У яго нават узнікла ідэя заняцца агратурызмам, і Урублеўскі пачаў будаваць домік для гасцей, лазню...

Калі мы ехалі з горада, то фермер падчас размовы рабіў акцэнт на тое, што ўсё зробленае ім ідзе на карысць народа, бо гадуючы рыбу, ён дапамагае дзяржаве насыціць рынак... У прынцыпе, гэта так, але ў фермера (як у кожнага вытворцы) на першым плане свае інтарэсы — як зарабіць грошы. І гэта нармальна.

Робячы націск на дзяржаўны падыход да справы, Урублеўскі тым самым паспрабаваў прыцягнуць увагу да сваёй праблемы, якая мне падалася даволі складанай.

Калі фермер атрымаў дзяржаўны акт на зямлю, то акунуўся ў працу і пачаў на сваёй зямлі наводзіць парадак. Чалавека можна зразумець — ён прыйшоў сюды назаўсёды і ўсё што будзе зроблена, дастанецца дзецям і ўнукам. Філасофія ўласніка, на якой трымаецца заходняя цывілізацыя, і не толькі. Але Міхаіл Урублеўскі, палічыўшы, што дзяржаўны акт дае яму права рабіць на арэнднай зямлі ўсё, што задумае, парушыў закон. У чалавека нават няма праектна-каштарысnай дакументацыі, а ён развярнуў будоўлю. Будаваць нешта на зямлі можна толькі маючы дазвол. А фермер узяў і выпраміў рэчку Жэрабілаўку адлегласцю ў 1200 метраў, пабудаваў на ўскрайку лесу дамок з цэглы для гасцей, цагляную прыбіральню...

Да ўсяго гэтага ў мяне дваістыя адносіны. З аднаго боку, зразумела, што нельга будаваць дамбы і сажалкі, мяняць рэчышча рэк без заключэння экалагічнай экспертызы, без праекта. І нават калі домік для гасцей і ўзведзены на зямлі фермера, але пабудовы ў адпаведнасці з супрацьпажарнымі інструкцыямі павінны знаходзіцца не сярод дрэваў, а за 50 метраў ад мяжы лесу...

Але з другога — Урублеўскі — на мясцовым узроўні адзін з лепшых фермераў у 2005 годзе, які будуе гаспадарку на свае грошы. У «Сасновае» прыязджалі рыбаловы, каб паспаборнічаць... І што, ніхто не ведаў, што ў фермера нават праекта няма і не бачылі, што рака не там цячэ? І вось праз 7 гадоў вырашылі навесці парадак — успомнілі пра закон.

— Я не адмаўляю, што зрабіў парушэнні, але не памыляецца толькі той, хто сядзіць на печы. Думаю, неабходна зыходзіць з рэальнай шкоды, якая была нанесена прыродзе і экалогіі. Наколькі санкцыі, прынятыя адносна мяне, адпавядаюць памерам той шкоды? Ды і ці ёсць яна? Паводле рашэння райвыканкама, я павінен зрабіць праектна-каштарысную дакументацыю на будоўлю сажалак, а інакш усё будзе прыведзена ў першапачатковы стан. Я даведаўся, што на тую дакументацыю неабходна 100—130 млн рублёў. А дзе іх узяць? — сказаў у роспачы фермер.

Ці адпавядае гэтая сума сапраўднасці, я не стаў высвятляць, але ведаю, што замовіць тыповы праект сховішча для яблыкаў у Польшчы будзе каштаваць у разы танней, чым у нас.

Калі да канца гэтага года рашэнне райвыканкама не будзе выканана, то будынкі будуць знесеныя за кошт фермера.

Даводзілася пісаць пра многіх фермераў, і ў кожнага з іх былі нейкія праблемы, але сітуацыя, у якую трапіў Міхаіл Урублеўскі, нардынарная — дужа моцна завязаны вузел.

Уявім, што кожны фермер усё будзе перарабляць на свой капыл, то нічога добрага з гэтага не атрымаецца і законы існуюць, каб усе дзейнічалі ва ўстаноўленых межах. І ўсё ж мне не дае спакою думка: а як павёў бы сябе закон, калі б на месцы фермера апынулася дзяржпрадпрыемства ці сельгаскааператыў? Сталі б будынкі зносіць, рэчку вяртаць у былое рэчышча ці ўсё абышлося б толькі штрафам?

Можа, у гэтым схавана прычына многіх канфліктаў? Але ў любым выпадку праблему, мяркую, трэба вырашаць па-гаспадарску.

Сымон СВІСТУНОВІЧ.

Баранавіцкі раён.

Фота аўтара.

НЕ БУДЗЯЦЬ НА ДОСВІТКУ БАБУЛЬ ПЕВУНЫ

У пенсіянеркі Ларковай, што жыве ў вёсцы Малашкавічы Рагачоўскага раёна, было іх два. А каб весялей ім было, дык жанчына для кампаніі і чатырох курак завяла. І вось ці то для сваіх напарніц, ці то ў знак падзякі гаспадыні за сытнае жыццё тыя пеўні на досвітку такія рулады наладжвалі, так наперабой спявалі, што ў бабулі ажно дух прыхоплівала радасцю, настрой узнімаўся. І вось чарговым ранкам не стала чуваць пеўняў. Гаспадыня падумала, што можа яны голас страцілі ад маразоў, а можа тхор нашкодзіў. Пайшла ў хлявок паглядзець: пуста. Заплакала старая — ды ў міліцыю заяву.

Туды ж звярнулася і пенсіянерка з вёскі Чэрнічы Жыткавіцкага раёна. І ў яе нехта ўкраў усю «ферму»: пеўня і 11 курэй-нясушак. Ці вернуць бабулям скрадзенае, залежыць ад міліцыі. Як кажуць, надзея памірае апошняй.

НЕ ЗАМЫКАЛІ КАБІНЕТЫ — І ВОСЬ «СЮРПРЫЗЫ»

Вярнуўшыся праз колькі хвілін у свой незамкнёны працоўны кабінет, работніца аднаго з упраўленняў Гомельскага аблвыканкама ледзь не страціла прытомнасць: зніклі грошы — тры з паловай мільёны рублёў, сто еўра і адзін долар. Страты панесла і супрацоўніца ўпраўлення дзяржаўнай судова-медыцынскай службовай экспертызы ў выглядзе 50 «зялёных» і 70 тысяч рублёў.

Схапіў «варону» і адзін наведвальнік гасцініцы «Турыст», што ў абласным цэнтры. Пакінуўшы свой каштоўнасці, нават калі ў вяскоўца ёсць толькі карова, то і пры самым сціплым даходзе можна пражыць. Літр малака каштуе ў краме больш за тысячу рублёў, а са сваёй каровы можна мець дзесяць літраў штодзень і рабіць сваю смятану, тварог, сыр і масла. Калі частку малака здаваць дзяржаве, то будуць і дадатковыя грошы.

— А калі яшчэ парася ў хляве стаіць і куры па двары бегаюць, то чалавек пры любых катаклізмах не памрэ з голаду, — запэўнівае Гушчын. — А перспектыва развіцця падсобных гаспадарак далей залежыць ад дзяржавы. Мы, сяляне, спадзяёмся на павелічэнне ў наступным годзе закупачных цэнаў на малако. І калі гэта спраўдзіцца, то нам тут крызіс не страшны! У Віркаве пражывуць!

Здароўе, дабрыня, праца, ураджай і добрыя думкі

— Не бяды! Добры быў год! — так падводзіць вынікі 2008-га года Ганна Іванаўна Лапаціна. — Самая мая галоўная надзея на год наступны — каб было здароўе і ніхто не хварэў. Каб была дабрыня і менш злосці ў людзях. Каб ціха было і не было вайны. Каб жылі дзеці, унукі і праўнукі.

— Мы верым, што Новы год прынясе новыя надзеі, што спраўдзяцца мары і ажыццявяцца планы, — сказала Святлана Паўлаўна Мароз. — Мне найбольш хочацца для сябе і сваякоў здароўя. Ну і, вядома ж, ад усяго астатняга мы таксама не адмовімся.

— Я хачу, каб наш Клічаўскі раён развіваўся, каб захаваліся нашы прадпрыемствы ды ствараліся новыя і давалі людзям працу, — выказаў агульную надзею старшыня Віркаўскага сельсавета Іван Гушчын. — Каб у Расіі прымалі нашу прадукцыю. Каб у наступным годзе было добрае надвор'е і каб на нашых палях вырас ураджай не меншы за сёлетні.

— Светлае і добрае заўсёды павінна быць у галаве і ў душы чалавека, — нагадаў пра вечныя каштоўнасці старшыня Нясяцкага сельсавета Анатоль Гертман. — А калі гэтага няма, то і рэчаіснасць, якой бы цудоўнай і добрай яна ні была, падасца цёмнай і шэрай. Таму, нягледзячы на ўсе жыццёвыя цяжкасці, трэба ўсміхацца і спадзявацца на лепшае. З такімі пачуццямі я і жадаю ўсім сустрэць Новы 2009 год!

Ілона ІВАНОВА.

Клічаўскі раён.

Уладзімір Емельянавіч КАРНУШЭНКА жыве каля славутасці Віркава: на кургане каля векавой сасны вяскоўцы адрадзілі праваслаўную царкву.

З ПЕТЛЯМІ — У ЗОНУ СПАКОЮ

Вайскоўцы Мазырскага пагранатрада ў вёсцы Славечна Ельскага раёна затрымалі мясцовага жыхара, які ў мяху на веласіпедзе перавозіў мяса казулі.

Работнікі Мазырскай міжрайінспекцыі па месцы высветлілі, што качагар Славечанскага ФАПа здабыў жывёлу ў зоне спакою Ельскай лесапаляўнічай гаспадаркі забароненым спосабам — з выкарыстаннем сталёвых петляў. Пры аглядзе домаўладання парушальніка следча-аператыўная група Ельскага РАУС знайшла разабраную тушу казулі, здабытую раней гэтымі ж петлямі. Матэрыялы накіраваны ў пракуратуру.

ЗААПАРКУ АД... БРАКАНЬЕРАЎ

Работнікі Віцебскай аблінспекцыі на Заходняй Дзвіне ў Віцебскім раёне затрымалі наладчыка халоднашліфавальнага абсталявання РУП «ВЗЭП», вадзіцеля прадпрыемства «Гардармост» і вадзіцеля УП «Мазалоўскае ПМС», якія лавілі рыбу забароненымі прыладамі — сеткамі.

Сеткі, праўда, парушальнікі паспелі ўтапіць у рацэ. Канфіскавана амаль 22 кілаграмы рыбы, якая перададзена ў Віцебскі заапарк. Дзеяннямі браканьераў прыродным рэсурсам нанесены ўрон у асабліва буйным памеры — на суму амаль 9 мільёнаў рублёў. Матэрыялы накіраваны ў пракуратуру вобласці для разгляду пытання аб узбуджэнні крымінальнай справы.

Сяргей РАСОЛЬКА.

Калі вы падпісаліся на газету **«Звязда» на I квартал або 1-е паўгоддзе 2009 года** — запаўняйце картку ўдзельніка, выразайце і дасылайце яе **да 5 студзеня** ў рэдакцыю на адрас: **220013, г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10А**.

Падпісчык можа выйграць у якасці прызоў гадзіннікі, майкі, бейсболкі, тэлевізары «Віцязь», печ-ЗВЧ і халадзільнік. Розыгрыш прызоў правядзіцца **8 студзеня 2009 г.**, вынікі публікуюцца ў газеце «Звязда» **да 18 студзеня 2009 г.**

Атрымаць прыз можна ў рэдакцыі **да 20 сакавіка 2009 г.** пры прад'яўленні квітанцыі аб падпісцы на «Звязду» на I квартал або 1-е паўгоддзе 2009 года і пашпарта. Дастаўку тэлевізараў, печы-ЗВЧ і халадзільніка ажыццяўляе рэдакцыя. **Пасля 20 сакавіка** выдача прызоў спыняецца і прэтэнзіі падпісчыкаў не прымаюцца.

Больш падрабязна правілы гульні «Падпішыся на «Звязду» чытайце ў нумары газеты за 4 лістапада 2008 года. Удачы ў гульні!

Тэрмін правядзення гульні — з 04.11.08 па 14.01.09.

Пасведчанне аб дзяржаўнай рэгістрацыі № 1223 ад 30.10.08, выдадзена Міністэрствам гандлю РБ.

10 Картка ўдзельніка — падпісчыка «Звязды» на I квартал або 1-е паўгоддзе 2009 года

Прозвішча, імя, імя па бацьку_____

_____

Падпіска аформлена і аплачана ў_____
(аддзяленне сувязі)

_____**на I кв. або 1-е паўг. 2009 года**

Хатні адрас і тэлефон _____ _____
(індэкс)

_____

_____

Удачы ў розыгрышы!

Ф.СП-1 Міністэрства сувязі і інфарматызацыі Рэспублікі Беларусь

АБАНЕМЕНТ на газету **ЗВЯЗДА** з бясплатнымі ўкладкамі: «ЧЫРВОНАЯ ЗМЕНА», «МЕСТНОЕ САМОУПРАВЛЕНИЕ», «КРАІНА ЗДАРОЎЯ», «ЖЫРАНДОЛЯ», «КУПЛЯЙ ЛЕПШАЕ!» «НАСУПЕРАК ЧАРНОБЫЛЮ»

(індэкс выдання) _____ Колькасць камплектаў _____

на 2009 год па месяцах

1	2	3	4	5	6	7	8	9	10	11	12

Каму _____

Куды _____ (прозвішча, ініцыялы)

_____ _____ (адрас)

(паштовы індэкс) (горад, населены пункт)

ДАСТАВАЧНАЯ КАРТКА на газету **ЗВЯЗДА** з бясплатнымі ўкладкамі: (індэкс выдання) _____

«ЧЫРВОНАЯ ЗМЕНА», «МЕСТНОЕ САМОУПРАВЛЕНИЕ», «КРАІНА ЗДАРОЎЯ», «ЖЫРАНДОЛЯ», «КУПЛЯЙ ЛЕПШАЕ!» «НАСУПЕРАК ЧАРНОБЫЛЮ»

ПВ	месца	літар

Кошт: падпіскі _____ руб.; пераадрасоўкі _____ руб. Колькасць камплектаў _____

на 2009 год па месяцах

1	2	3	4	5	6	7	8	9	10	11	12

Каму _____

Куды _____ (прозвішча, ініцыялы)

_____ _____ (адрас)

(паштовы індэкс) (горад, населены пункт)

Не толькі страчаная выгада, але і новыя магчымасці

— Некаторае падзенне аб'ёмаў вытворчасці ў эканоміцы горада за лістапад ёсць, але сітуацыя не крытычная. Лічу, што па выніках года будуць выкананы і прагнозныя паказчыкі ў прамысловасці, і бюджэт, — адзначыў у гутарцы з карэспандэнтам «Звязды» намеснік старшыні Гродзенскага гарвыканкама Аляксандр СІЎЦОЎ.

Становішча на рынку працы ў абласным цэнтры стабільнае, прапаноў больш, чым зарэгістравана беспрацоўных. Зарплата за лістапад выплачвалася своечасова, неабходныя для абаротных сродкаў крэдыты ў банках прадпрыемствы атрымлівалі.

Сітуацыя, якая называецца сусветным фінансавым крызісам, у першую чаргу, вядома, закранула экспартнаарыентаваныя прадпрыемствы, а таксама тыя, што працуюць на зборачныя канвееры. У прыватнасці, у аб'яднанні «Гродна Хімвалакно», якое працуе ў цеснай кааперацыі з замежнымі машынабудаўнікамі, цяпер заклапочаны тым, каб утрымацца на тых рынках, дзе ў апошнія гады гродзенцы добра замацаваліся. Для гэтага робяцца захады па зніжэнні цаны на поліаміды, тэхнічную нітку.

— Многія прадпрыемствы цяпер актыўна шукаюць новыя рынкі збыту сваёй прадукцыі, сітуацыя патрабуе ўмацавання маркетынгавых службаў, — лічыць Аляксандр Сіўцоў.

Пры гэтым вельмі важна, што практычна ўсе буйныя гродзенскія прадпрыемствы маюць свае прадстаўніцтвы ў Маскве, а ў пачатку наступнага года паміж расійскай сталіцай і горадам над Нёманам будуць адкрыты рэгулярныя паветраныя зносіны. Што, зразумела, будзе зручна не толькі для турыстаў, але і для дзелавых кантактаў.

Дарэчы, інтарэс замежнага бізнэсу да работы ў Гродне ёсць, колькасць зарэгістраваных у свабоднай эканамічнай зоне «Гроднаінвест» суб'ектаў гаспадарання павялічваецца. Праўда, апошнім часам дзелавая актыўнасць крыху замарудзілася.

На думку Аляксандра Сіўцова, цяпер трэба вельмі ўзважана падыходзіць да новага будаўніцтва. На вельмі перспектыўныя, высокапрыбытковыя праекты грошы знойдуцца. Калі ж тэрмін акупнасці — у далёкай перспектыве, то, можа, варта і пачакаць.

— Думаю, што наступны год будзе для эканомікі, у тым ліку і нашага горада, няпростым, але не трэба і драматызаваць сітуацыю, — лічыць Аляксандр Сіўцоў. — Як кажуць, крызіс — гэта не толькі страчаная выгада, праблемы, але і новыя магчымасці, якімі трэба ўмела скарыстацца.

Зрэшты, у працоўных калектывах напярэдадні навагодніх святаў думаюць, безумоўна, не толькі пра выторчасць. Да прыкладу, у ААТ «Гродна Азот» для дзяцей сваіх работнікаў ужо купілі каля дванаццаці тысяч набораў цукерак. Шмат дзе не адмовіліся ад традыцыйных карпаратыўных вечарынак. Але нямала і такіх прыкладаў, калі замовы ў кавярні і рэстараны спачатку паступалі, а потым зніжаліся са спасылкай на складанае фінансавае становішча.

Барыс ПРАКОПЧЫК.

«НАВОШТА ПЛЕСЦІ ЛАПЦІ, ЯКІЯ НІХТО НЕ КУПЛЯЕ?»

Эканамічны крызіс, які гуляе па свеце, не можа абысці і нас. Тут важна, наколькі глыбокім і працяглым ён будзе. Пакуль што на нашых прадпрыемствах крызіс лакальны. Няма масавых скарачэнняў ці нявыплаты зарплаты, а найперш існуе праблема рэалізацыі прадукцыі. Але ж і яна ўзнікла не сёння. На шэрагу прадпрыемстваў у Баранавічах і ў мінулым са збытам было няпроста, а цяпер тым больш.

Выдаткаваныя грошы на сыравіну, зарплату, электраэнергію — а выраблены тавар нікому не патрэбен. Мясныя кансервы губляюць тэрмін захоўвання на складзе, мыйныя парашкі ад часу страчваюць якасць, трыкатажныя вырабы становяцца старамоднымі. Дык які сэнс усё гэта выпускаць?

Не так важна колькі выраблена, важней колькі прададзена (з прыбыткам) і чым хутчэй гэта робіцца, тым больш эфектыўная эканоміка. Абарот — адзін з важнейшых складнікаў яе.

Вось у Баранавічах сёлета чакаецца ў параўнанні з 2006 годам рост аб'ёму вытворчасці на 12,3 працэнта, а гэта ні пра што не гаворыць, бо мы не ведаем, які працэнт вырабленай прадукцыі будзе рэалізаваны.

— Навошта плесці лапці, якіх ніхто не купляе? — спытаў аднойчы кіраўніка абутковай фабрыкі.

— Вось мы ўзялі крэдыт і далей працуем. А спыніць фабрыку і пакінуць людзей без работы і зарплаты — гэта ўжо не толькі эканоміка, — быў адказ.

Бясконцае крэдытаванне стратных прадпрыемстваў падрывае эканоміку краіны і расхалоджвае людзей, якія сядзяць на мізэрнай зарплаце і чакаюць лепшых часоў — а раптам нейкі начальнік усё зменіць да лепшага. Пры рынкавай сістэме, а тым больш у крызісных сітуацыях у выйгрышы мабільнае грамадства, здольнае перабудавацца — гэта датычыць і асобнага чалавека.

— Крызіс — нармальны стан жыцця, — лічыць ***дырэктар Ляхавіцкага малочнага завода Вячаслаў ЖУКОЎСКІ.*** — Не толькі ў эканоміцы ён бывае, але і на асобным прадпрыемстве, а здараецца і ў жыцці чалавека. Мне здаецца, што нам даводзіцца выжываць усё жыццё. Але неабходна заваёўваць рынкі і праяўляць тут актыўнасць, рынкавую агрэсіўнасць, своечасова рэагаваць на сітуацыю, а не чакаць, што гэта за цябе зробіць нехта ў высокім кабінеце. Вось мы ўжо пабывалі ў Малдове і наладзілі там дзелавыя кантакты, а зараз збіраемся ў Маскву. Не скажу, што агульная эканамічная сітуацыя на нас не ўплывае, але са збытам прадукцыі ў малаказавода пакуль што праблемы няма, хоць на некаторых прадпрыемствах нашай галіны ўжо пачалі праяўляцца негатыўныя сімптомы. Яшчэ важна быць надзейным партнёрам — працаваць сумленна, без ашуканства, пастаўляць прадукцыю ў тэрмін, і тады будзе ўзаемны давер. Са сваімі пастаўшчыкамі завод разлічваецца своечасова, з сельгаскааператывамі ў нас наладжаны даверлівыя дзелавыя адносіны. Разам, сумесным намаганням

Распродажы тавараў не спыняцца з надыходам Новага года...

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

Сапраўдны імпульс навагодняму гандлю і арганізацыі распродажаў тавару далі дзве пастановы беларускага Урада ад 1 і 9 снежня, якія зацвердзілі парадак рэалізацыі тавараў па цэнах, якія вызначаюцца з улікам кан'юнктуры сусветнага рынку і рынку на тэрыторыі Рэспублікі Беларусь. Аднак паколькі пастанова ад 9 снежня № 1903 уступіла ў сілу толькі з дня свайго апублікавання, а гэта значыць, з 17 снежня, то ёсць усе падставы меркаваць, што да канца снежня колькасць распродажаў тавараў яшчэ павялічыцца. Не выключана таксама, што распродажы працягнуцца і ў пачатку наступнага года. Згаданыя пастановы будуць дзейнічаць, заўважу, да 1 студзеня 2010 года. Было б толькі жаданне з боку вытворцаў...

Паводле слоў Людмілы Петракоўскай, вопыт работы сталічнага ГУМа заслугоўвае ўвагі: яго дырэктар не спыніў летась распродаж тавараў 31 снежня, захаваўшы святочныя зніжкі і пасля наступлення Новага года. Прычым застаўся вельмі задаволены атрыманым эфектам. Не выключана, што многія мінчане аддалі перавагу ажыццяўленню пакупак у больш спакойнай абстаноўцы, чым у мітусні перадсвяточных дзён.

— Мы маем права вызначыць гандлёвую надбаўку ў памеры ад 5 да 30 працэнтаў звыш цаны вытворцы. Хачу патлумачыць, што гандлёвая надбаўка — гэта той даход, які выкарыстоўваецца для выплаты заработнай платы работнікам, для аплаты камунальных паслуг, арэнды памяшканняў, таму цалкам зняць гандлёвую надбаўку для нас праблематычна, але мы ідзём насустрач пакупнікам і зніжаем гандлёвыя надбаўкі, — патлумачыла Людміла Петракоўская. — Зусім іншая справа — зніжкі, якія робяць вытворцы. Гэтыя зніжкі пакупнікі адчуюць на сваёй кішэні хутчэй, чым змяншэнне гандлёвай надбаўкі, тым больш што наша надбаўка будзе «накручвацца» ўжо таксама на меншую цану. Скажам, нейкая рэч каштуе 100 тысяч рублёў, плюс гандаль дадае максімальную 30-працэнтную надбаўку, значыць рэч прапануецца пакупніку ўжо за 130 тысяч рублёў. А калі вытворца зробіць, напрыклад, 20-працэнтную зніжку, то цана зменшыцца да 80 тысяч рублёў, плюс мы зменшым гандлёвую надбаўку. У гэтым разе суміраваная зніжка і сапраўды будзе адчувальная... Мяркую, што памер зніжак у немалой ступені будзе залежаць ад фінансавай устойлівасці таго ці іншага прадпрыемства. Хтосьці можа дазволіць сабе рэалізоўваць прадукцыю і танней за яе сабекошт. Але ўсе цудоўна разумеюць, што становішча прадпрыемства ў немалой ступені залежыць ад хуткасці тавараваротаў...

На сённяшні дзень лідарамі па зніжэнні цэнаў на сваю прадукцыю з'яўляюцца, напэўна, трыкатажнае прадпрыемства «Палессе», якое зменшыла адпускныя цэны на 50 працэнтаў, і прадпрыемства «Віцязь», якое рэалізуе ў снежні свае тэлевізары з 40-працэнтнай скідкай.

Канцэрн «Белхарчпрам» таксама абяцае пайсці напярэдадні навагодніх святаў на пэўныя зніжкі, зразумела, што размова не ідзе пра тавары, на якія вызначаны фіксаваныя цэны. Так, у сталіцы ўжо пацвердзілі свой намер знізіць цэны Мінскі холадакамбінат, вытворцы мясных вырабаў, малочныя заводы. Журналістам паабяцалі, што пакупнікі будуць прыемна здзіўленыя. Трэба дадаць, што 25 снежня ў Мінску пройдуць навагоднія кірмашы на Кастрычніцкай плошчы і на праспекце Пераможцаў побач з Палацам спорту, дзе можна будзе набыць літаральна ўсё да навагодняга стала, навагоднюю ёлку і нават падарунак пад ёлачку.

Надзея НІКАЛАЕВА.

КУПІ ЛЕПШАЕ!

ТАВАРЫ ПАСЛУГІ ЦЭНЫ

Выпуск № 9 (43)

МАРЫ ПРА КАЛЯДНЫЯ КАНІКУЛЫ

У Беларусі людзі ведаюць, што за любымі святамі заўсёды ідзе праца, таму, у адрозненне ад суседзяў, у нас няма вялікіх калядных выхадных. На гэта я спадзявалася, калі думала, як патраціць частку адпачынку, які ў мяне застаўся напрыканцы года. Усе пасвяткуюць і пойдуць на працу, а мы спакойна выратуем, дзе і як правесці свой законны адпачынак. Але, відаць, сярод нашых суграмадзян даволі шмат людзей, якія не супраць законным чынам наладзіць сабе калядныя канікулы. І зусім не выключаная сітуацыя, калі шпацыруючы па Парыжы ці Празе, можна будзе сустрэць сваіх знаёмых...

Прынамсі, на адпачынку нашы суграмадзяне пакуль не эканомяць. Як і на жаданні правесці святы і прыемна, і з карысцю, наведаўшы музеі і гістарычныя месцы старой добрай Еўропы. Беларускія турфірмы не асабліва прывабліваліклієнтаў абяцаннямі зніжак на туры ў Еўропу — яны і так выдатна карысталіся попытам. Магчыма, падзенне еўра адыграла сваю ролю, і тыя хто шкадаваў 300-400 долараў за тыднёвы аўтобусны тур, вырашылі: а, што тыя грошы... Тыя хто хацеў правесці Каляды ў Еўропе, павінны былі загадзя паклапаціцца пра афармленне візаў: перад святамі наплыў у пасольствы бывае асабліва вялікі. Вынік: усе еўрапейскія напрамкі перад Новым годам карысталіся попытам. Праўда, можна адшукаць туры на тыдзень, з адпраўкай 3 студзеня і пазней, пры гэтым ёсць магчымасць наведаць Берлін, Амстэрдам, Люксембург, ці ёсць яшчэ варыянт, пры якім можна правесці тры дні ў Парыжы... Колькі каштуе такая мара? 300 еўра. За праезд, пражыванне, сняданкі і экскурсійную праграму, але без квіткоў у музеі. Прыкладна на 70 еўра даражэй абыдуцца 8 дзён у Італіі — у турфірме кажуць, што з наступствамі паводкі там паспяхова спраўляюцца і на турызме гэта не адбілася.

Самым папулярным напрамкам у беларусаў з'яўляецца Цэнтральная Еўропа, з заездам у Прагу. Туристы, якія хацелі патрапіць туды ў снежні, на самы чароўны час, калі ў Берліне, Вене, Празе адбываюцца калядныя кірмашы, звярталіся і замаўлялі месцы яшчэ ў лістападзе. З-за таго што шэнгенская віза каштуе нятанна, турысты аддавалі перавагу доўгім праграмам, а не збіраліся паехаць толькі на выхадныя.

Аднак сустрэць Новы год у Кракаве, Таліне ці Вільнюсе яшчэ рэальна для тых, напрыклад, у каго няма праблемаў з візай. Туры на 4-5 дзён, пачынаючы з 30 снежня, абыдуцца ў 190 еўра плюс 60 тысяч (Кракаў-Велічка) і 240 еўра і тыя ж 60 тысяч за Талін і Рыгу. Прасцей, зразумела, накіравацца ў Пецярбург ці Кіеў — беларускія турфірмы абяцаюць і там свята з банкетам (250—280 долараў плюс 50 тысяч). Затое не патрэбны ніякі дазвол на выезд у гэтых напрамках.

Калі меркаваць па наяўнасці месцаў, то актыўныя беларусы для сябе вызначылі: трэба ехаць. Далёка не ўсе лічаць добрым святам тое, якое праводзіцца ля тэлевізара. І калі найбольш запатрабаванай нашымі суграмадзянамі Еўропа ўжо раскупленая, то патрапіць на навагодні пляж у Егіпет, куды не патрэбна віза, пакуль рэальна (пуцёўка ад 600 долараў за «гарачы тур»). Праўда, больш рэальна — з выездам з Масквы, чым з Мінска. А калі больш грошай — то і больш прапаноў па іншых экзатычных краінах.

Аднак калі ехаць усё-такі хочацца, ды не вельмі далёка, застаецца наша сінявокая Беларусь. Пакуль у беларускія санаторыі, аздараўленчыя цэнтры, дамы адпачынку можна набыць пуцёўку на Навагоднія святы і пасля. Прычым колькасць дзён можа вар'іравацца ў адпаведнасці з патрабаваннем. Аднак за адпачынак менавіта ў святочныя дні заплаціць давядзецца больш, таму што кожная падобная ўстанова рыхтуе сваю праграму з банкетам і нават феерверкам. Калі вам назавуць цану каля 300 тысяч беларускіх рублёў на аднаго за 31 снежня і 1 студзеня, то здзіўляцца не трэба. Для тых хто захоча наладзіць сабе з першых дзён Новага года адпачынак з лячэннем, то і гэта магчыма ў санаторыі, толькі пры наяўнасці санаторна-курортнай кніжкі. Яе не стануць патрабаваць, калі вы збіраецеся ў аздараўленчы цэнтр, але паслугі доктара там будуць таксама забяспечаныя. За нумар давядзецца заплаціць у сярэднім 70 тысяч у суткі на аднаго. Дзесяць дзён задавальнення ў беларускіх здраўніцах будуць каштаваць каля 450 умоўных адзінак. Дарэчы, наведванне беларускіх дамоў адпачынку рэальнае і для гасцей, напрыклад, з Расіі, якая будзе адпачываць доўга. Кошты для расіян павялічваюцца, але нязначна. Прынамсі, з чаго нехта ўзяў, што наша краіна павінна каштаваць танна?

Ларыса ЦІМОШЫК.

альбо На пампушкі да Алены

ЁСЦЬ РЭЦЭПТЫК!..

ну вось, дажылі да чарговых навагодніх святаў. Хутка зноў будзем сядзець за сталом, дружна скардзіцца на крызіс і пры гэтым моцна аб'ядацца. Таму давайце загадзя згадаем, што цяпер пост, хоць і не вельмі строгі. Давайце будзем стрыманымі ў харчаванні, дадзім сабе і страўніку адпачыць — згатуем простыя і лёгкія стравы з морапрадуктаў. А наконт крызісу я вам так скажу: ён як насмарк — усё адно пройдзе. Я суцяшаю сябе тым, што нічога не страціла. Як да крызісу нічога не было, так і цяпер няма. Галоўнае, каб усе былі здаровыя! Таму не вешаем носікі, набіраемся сілаў і назапашваем энергію для актыўнай сустрэчы Новага года!

СМАЧНАЯ І ПРОСТАЯ САЛАТА

Нам спатрэбіцца: 1 бляшанка чырвонай фасолі, 1 бляшанка кансерваванай кукурузы, 1 пачак крабавых палачак, 1—2 пакецікі сухарыкаў з часнаком.

Крабавыя палачкі буйна парэзаць, усё астатняе проста дадаць да іх. Для заправы ўзяць у роўных частках маянэз, нятлустую смятану і натуральны ёгурт.

ВІНЕГРЭТ З МАРСКОЙ КАПУСТАЙ

Вазьміце: 300 г марской капусты, 3 бульбіны, 2 морквіны, 3 сталовыя лыжкі алею, 1 галоўку рэпчатай цыбулі, 100 г салёных агуркоў, соль — на смак.

Бульбу і моркву адварыць (асобна), абабраць, нарэзаць скрылькамі або кубікамі. Цыбулю абабраць і нарэзаць кольцамі. Агуркі нарэзаць кубікамі. Злучыць марскую капусту са здробненай агародніной. Заправіць алеем і перамяшаць. Невялікая заўвага: таксама можна яшчэ дадаць і тое, што вы кладзяце дадаткова ў звычайны вінегрэт, акрамя буракоў.

СЕЛЯДЗЕЦ СВЕЖЫ, ЗАПЕЧАНЫ З ЯЙКАМ

Вазьміце: 500 г свежага селядца, 30 г мукі, 50 г алею, 5 яек, 100 г смятаны, 100 г рэпчатай або зялёнай цыбулі, зяленіва, перац, соль.

Філе свежага селядца са скуркай без касцей пасыпаць соллю, перцам, запаніраваць у муцэ і абсмажыць на алеі. Абсмажаную рыбу выкласці на металічнае авальнае блюда або латок для запякання. Сырыя яйкі змяшаць са смятанай і рубленай сырой рэпчатай або нашаткаванай зялёнай цыбуляй і пасаліць. Заліць рыбу гэтай сумессю і запячы ў духоўцы. Пры падачы пасыпаць зяленівам.

АЛАДКІ З РЫБНЫХ КАНСЕРВАЎ

Гэты рэцэпт з тых часоў, калі сайра ў алеі каштавала 21 капейку, а шпроты можна было купіць толькі ў Маскве. Такія аладачкі асабліва любілі гатаваць у студэнцкіх інтэрнатах дзяўчаты. Для іх падыходзяць практычна любыя рыбныя кансервы — у алеі, у тамаце, ва ўласным соку. Вось толькі шпроты на награванне не вельмі добра рэагуюць.

Нам спатрэбіцца: 1 бляшанка рыбных кансерваў (нета 250 г), пучок свежага зяленіва, 2 яйкі, 1 сталовая лыжка смятаны або маянэзу, 2—3 сталовыя лыжкі мукі.

Рыбу з бляшанкі перакласці ў міску. Калі ёсць вялікія косці, іх трэба выняць. Рыбу або расціснуць або паламаць на невялікія кавалачкі. Зяленіва дробна парэзаць і пакласці да рыбы. Умяшаць 2 яйкі, затым смятану (або маянэз) і ў канцы — муку. На сярэднім агні нагрэць у патэльні алей. Лыжкай выкласці на патэльню порцыі рыбнай масы. Першы бок смажыць 2—3 хвіліны пад накрыўкай, пераварнуць. Другі бок абсмажваць паўтары хвіліны без накрыўкі. Падаваць гарачымі.

ЯДОМЫ АНЕКДОТ

Вечар над ракой. Стары рыбак, нічога не злавіўшы, скручвае вуды.

Мармыча: «Калі б рыбалка так не супакойвала, перадушыў бы ўсіх!».

* * *

Тэлефануе адзін мужык другому:

— Вася, хадзем вечарком на рыбалку.

— Не пайду.

— Чаму?

— Ды мне жонка дома піць дазволіла.

Фота Пятра ФАМІНА.

На той бок прылаўка

ЯК НА РЫНКУ ДА СВЯТА НАБЫЦЬ ПРАДУКТЫ ПА ЦЭНАХ, НІЖЭЙШЫХ ЗА РЫНКАВЫЯ?

Зараз самы час пакрысе пачынаць падрыхтоўку да галоўных зімовых святаў, у тым ліку і ў плане набыцця прадуктовага набору да каляднага ці навагодняга стала. Традыцыйна многія з нас наведаюць з гэтай нагоды шматлікія рынкі і сталічны Камароўскі — таксама. Цяпер нейкіх заўважных зрухаў коштаў тут не назіраецца. Наадварот, некаторыя прадукты на рынку можна купіць нават па кошце, меншым за рынкавы. Але пра гэта крыху пазней, а пакуль пройдземся ўздоўж радоў і вітрын з таварамі.

Калі пачаць з мяса, дык філе свініны сёння прапануюць па 20—23 тысячы за кілаграм, шыю — па 20,5—23 тысячы, кумпяк ідзе па 15,5—19 тысяч. Крыху менш просяць за лапатку — 15—17 тысяч за кілаграм, за грудзінку для смажанкі — 12,5—15 тысяч. Свежае сала можна купіць па 6,5—11 тысяч, салёнае — па 13,5—17,5 тысячы рублёў за кілаграм.

Цяляціна прадаецца па 14,5—28 тысяч, ялавічына — 13—26 тысяч рублёў. Трэба сказаць, што цэны не канчатковыя, іх, як кажуць, можна «абскардзіць», гэта значыць, папрасіць прадаўца крыху «скінуць», асабліва ў канцы дня. Сам быў сведкам, калі прадаўшчыца сказала пакупніцы: што ж вы не просіце зніжкі, будзьце смялейшай!

Вараныя каўбасы вышэйшага гатунку каштуюць на рынку 9,5—15,9 тысячы рублёў. Паўвэнджаная каўбаса прадаецца па 13,1—22,8 тысячы, сыравэнджаная — 22,1—37,8 тысячы рублёў. Дзясятак яек ад птушкафабрыкі можна набыць за 2410—3400 рублёў, кілаграм мёду —за 25—35 тысяч. За бутэльку алею давядзецца аддаць ад 4190 да 6620 рублёў.

Грэцкія крупы можна купіць за 2440—2700, рыс — за 3600—5000 рублёў. Манка прадаецца па 2150—2500, гарох—2500—2700 рублёў за кілаграм. Макаронныя вырабы можна набыць па цане ад 2420 да 5110 рублёў, муку вышэйшага гатунку — за 1810—1910 рублёў.

Вельмі нязначна за апошні час падаражэлі селядцы, сёння іх прадаюць па 4010—8400 рублёў за кілаграм. Марожаную гарбушу можна набыць па 8,9—9,5 тысячы, хек — па 10,5—12,9 тысячы, скумбрыю — па 7,9—13,9 тысячы, мінтай — па 6,7—6,9 тысячы рублёў. Жывы карп сёння прапануюць па цане ад 3820 да 6650 рублёў. Свежыя грыбы шампіньёны на Камароўцы цяпер можна набыць за 7,5—8,5 тысячы. Пакунак маянэзу запатрабуе «капіталаўкладанняў» у памеры 1,1—1,7 тысячы рублёў.

Кілаграм бульбы з асабістага падворка абыдзецца ў 800—1500 рублёў; калі браць «другі хлеб» у індывідуальнага прадпрымальніка ці ў юрыдычнай асобы — 690—950 рублёў. Капуста адпаведна ў прыватніка і ў ІП ці юрасобы будзе каштаваць 750—1100 і 550—750 рублёў. Моркву вясковец прадасць вам за 1—1,5 тысячы, прадпрымальнік ці юрасоба — за 760—1000. Баклажаны можна набыць па 5,2—9 тысяч, салодкі перац — па 5,5—11, свежыя агуркі — па 6,5—8 тысяч, памідоры — па 5—7,5 тысячы. Апошнія, дарэчы, крыху патаннелі — колькі дзён таму іх прадавалі на рынку па 5,8—7,5 тысячы рублёў.

За апошні час на рынку істотна патаннелі яблыкі, цяпер іх можна купіць па 1,5—5,5 тысячы рублёў за кілаграм супраць нядаўніх 2,4—5,5 тысячы. Як удакладнілі нам у адміністрацыі Камароўкі, ніжняя цана ў 1500 рублёў датычыцца менавіта айчынных яблыкаў. Імі гандлюе адна фермерская гаспадарка, і такі кошт павінен захавацца да новага года.

Грушы можна набыць па 4,5—7 тысяч, імпартны вінаград — па 4—8 тысяч рублёў за кілаграм. За бананы давядзецца аддаць 2,7—2,9 тысячы. Лімоны апошнім часам патаннелі паўсюдна, відавочна, гэта было звязана з закупачнымі цэнамі. Сёння, у прыватнасці, на Камароўскім рынку за іх просяць 4,6—6 тысяч рублёў за кілаграм. Апельсіны тут каштуюць 3,5—6 тысяч, грэйпфрут — 5—6,5 тысячы, хурма — 4,5—7,5 тысячы, мандарыны можна купіць за 3,8—6 тысяч рублёў за кілаграм.

Але нават пры такіх коштах, калі, як кажуць, ёсць з чаго выбраць, можна яшчэ больш эканоміць пры набыцці пэўных харчовых прадуктаў. Справа ў тым, што на базе ўчастка дробнарознічнага гандлю Камароўскага рынку створана Бюро гандлёвых паслуг. Асноўнымі напрамкамі дзейнасці яго з'яўляюцца рэалізацыя сельскагаспадарчай прадукцыі з выкарыстаннем мінімальных гандлёвых надбавак, стварэнне канкурэнтнага асяроддзя на рынку, заключэнне дагавораў і продаж сельгаспрадукцыі фізічных асобаў, якія жадаюць прадаць лішкі сваёй прадукцыі, зніжэнне цэнаў на гэтую самую прадукцыю і садавіну. Што гэта азначае на практыцы?

Тое, што спажывец можа набыць цыбулю па 650 рублёў за кілаграм супраць цаны ў 1100 рублёў, якая сёння ўсталявалася ў індывідуальных прадпрымальнікаў. А буракі — па 620 рублёў супраць кошту ў 1400 рублёў. Морква ў Бюро гандлёвых паслуг прадаецца па 760 рублёў (у індывідуальных прадпрымальнікаў сёння цана на яе складае 1,1—1,3 тысячы), бульба — па 690 рублёў (800—1300 рублёў). Белакачанную капусту тут можна набыць па 550 рублёў (супраць 700 рублёў), часнок — па 3730 рублёў (4500 рублёў у прадпрымальнікаў), чорную рэдзьку — па 1100 рублёў (2,5—3 тысячы), лімоны — па 4230 (4,6—4,8 тысячы). Як знайсці месца продажу? Пастаянныя наведвальнікі рынку ведаюць, што прыкладна раз у гадзіну па радыёсувязі пакупнікоў запрашаюць наведаць гэты пункт у пераходзе паміж крытым і сезонным рынкамі і эканоміць на пакупках.

Сяргей СТАРЫНАЙ.

Забаяліся халадоў?

Калі жыхар Гродна прыехаў у сваю вёску Лешня, што ў Мазырскім раёне, дзе ён мае прыватны дом, то нават разгубіўся. Нібы выпарыўся ацяпляльны кацёл, секцыя чыгунных батарэй, тры пячныя дзверцы, пяць аконных блокаў і сем міжпакаёвых дзвярэй. Гора ды і толькі.

Відаць, давядзецца шукаць дадатковую крыніцу цяпла і жыхару пасёлка Касцюкоўка, які адносіцца да Чыгуначнага раёна Гомеля. У яго нехта ўкраў пераносную печ. Чухаюць патыліцу і ў КЖУП «Чачэрскае», бо ў вёсцы Бацвінава з недабудаванага дома ўкрадзена пяць секцый чыгунных ацяпляльных радыятараў. Ліхадзеі чакаюць маразоў?

Уладзімір ПЕРНІКАЎ.

Які рэжым працы на галоўным рынку?

Як паведамілі ў адміністрацыі сталічнага Камароўскага рынку, 25 снежня галоўная «харчовая крама» будзе працаваць у звычайным рэжыме — да 19 гадзін.

Звычайна па панядзелках Камароўка зачынена для пакупнікоў, аднак 29 снежня і 5 студзеня рынак можна будзе смела наведваць і рабіць пакупкі. Будзе ён працаваць да 19 гадзін і 7 студзеня. І толькі 1 студзеня рынак будзе зачынены на сандзень.

Збіў і дома разабраў

Беспрацоўны грамадзянін, які рухаўся на асабістым аўтамабілі па дарозе ў паляўнічых угоддзях Любанскага раёна, здзейсніў наезд на самку дзіка, што раптоўна выбегла пад колы, і смяротна траўмаваў яе.

Аднак, у парушэнне Правілаў вядзення паляўнічай гаспадаркі і палявання, пра здарэнне ў органы ўнутраных спраў нічога не паведаміў. Не звярнуўся з гэтай нагоды і да паляўніцтвакарыстальніка. Парушальнік проста завёз тушу дадому, дзе сумесна з пчаляром Любанскага лясгаса разабраў яе. Цяпер па гэтым факце праводзіцца разбор.

Сяргей РАСОЛЬКА.

ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ПОВТОРНОГО ОТКРЫТОГО АУКЦИОНА

Повторный аукцион по продаже недвижимого имущества коммунальной собственности г. Минска и права заключения договора аренды земельного участка для его обслуживания состоится **29 декабря 2008 г.** в 15.00 по адресу: г. Минск, ул. К. Маркса, 39, зал аукционов.

Организатор аукциона: Минский городской территориальный фонд государственного имущества, г. Минск, пр. Независимости, 8, тел. (8017) 200 20 89, каб 227.

На открытый аукцион выставляется:

Предмет открытого аукциона	Здание специализированное для общественного питания (инвентарный номер 500/С-15244) и право заключения договора аренды земельного участка для его обслуживания
Место нахождения недвижимого имущества	г. Минск, пер. Менделеева Д.И. 1-й, д. 50, корп. 2
Начальная цена предмета открытого аукциона, рублей	951 749 550 рублей (в том числе: недвижимое имущество – 241 778 065, право заключения договора аренды земельного участка – 709 971 485)
Сумма задатка для участия в открытом аукционе, рублей	95 174 960 рублей на р/с 3642000000015 в ОАО «АСБ Беларусбанк», г. Минск, код 153001795, УНП 100048181 Минского городского территориального фонда государственного имущества
Продавец недвижимого имущества	Управление образования администрации Партизанского района г. Минска, 220037, г. Минск, ул. Бумажкова, 37, тел. (8017) 294 63 34, 245 79 80
Информация о земельном участке для обслуживания недвижимого имущества	Общая площадь – 0,1793 га (из них 0,1793 га с ограничениями в использовании – водоохранная зона Слепянской водной системы), кадастровый номер земельного участка – 500000000001004107
Арендодатель земельного участка и срок аренды	Минский городской исполнительный комитет, срок аренды – 34 года
Характеристика недвижимого имущества	Общая площадь – 811,5 кв.м. Год постройки – 1960. Отдельностоящее одноэтажное здание в неудовлетворительном техническом состоянии, нет оконных и дверных блоков, стены – кирпичные, разрушена система отопления, холодного и горячего водоснабжения. Длительное время не использовалось
Условия использования недвижимого имущества	Для дальнейшего использования в соответствии с градостроительными регламентами здания под общественную функцию (общественное питание, объект торговли, культурно-бытовое назначение, административно-хозяйственное назначение)
Условия использования земельного участка	Земельный участок отведен для эксплуатации и обслуживания недвижимого имущества

Заявления на участие в открытом аукционе с прилагаемыми документами принимаются по адресу: г. Минск, пр. Независимости, 8, каб. 227 – по рабочим дням, с 20 по 24 декабря 2008 года включительно с 9.00 до 17.00.

Извещение о проведении открытого аукциона было опубликовано в газете «Звязда» 18 ноября 2008 года.

Победитель аукциона в течение 10 рабочих дней со дня принятия Минским горисполкомом решения о предоставлении ему земельного участка обязан внести плату за право заключения договора аренды земельного участка (в случае предоставления рассрочки ее внесения – часть платы) и возместить расходы, связанные с организацией и проведением открытого аукциона, и расходы, связанные с формированием земельного участка, в том числе с государственной регистрацией создания земельного участка. Условия и порядок предоставления рассрочки внесения платы за право заключения договора аренды земельного участка определены решением Минского горисполкома от 5 июня 2008 г. № 1308.

В течение одного рабочего дня со дня оплаты права заключения договора аренды земельного участка, возмещения расходов, связанных с организацией и проведением открытого аукциона и формированием земельного участка, победитель аукциона предоставляет Организатору аукциона копии платежных документов, после чего в течение 10 рабочих дней Продавцом заключается с ним договор купли-продажи недвижимого имущества, а Минским горисполкомом договор аренды земельного участка.

Осмотр объекта на местности участниками аукциона производится Продавцом, конт. тел. (8017) 294 63 34, 245 79 80.

ИЗВЕЩЕНИЕ ОБ ОТКРЫТОМ АУКЦИОНЕ

по продаже двух земельных участков в частную собственность гражданам для строительства и обслуживания жилого дома. Организатор аукциона — Жемчужненский сельский исполнительный комитет Барановичского района Брестской области.

Место расположения земельного участка, адрес, кадастровый номер	Характеристика инженерных коммуникаций	Площадь земельного участка, га	Назначение земельного участка	Начальная цена объекта, руб.	Сумма задатка, руб.	Расходы по формированию регистрации земельного участка и проведению аукциона, руб.
Республика Беларусь, Брестская обл., Барановичский р-н, Жемчужненский с/с, пос. Жемчужный, ул. Лесная, 36. Кадастровый номер 120481503601000300	Участок свободен от застройки, имеется линия электропередач, в радиусе 50 м водопровод, газопровод	0,1251	Для строительства и обслуживания жилого дома	480 000	48 000	549482 кроме того, расходы по размещению извещения о проведении аукциона в СМИ и другие по проведению аукциона
Республика Беларусь, Брестская обл., Барановичский р-н, Жемчужненский с/с, пос. Жемчужный, ул. Лесная, 38. Кадастровый номер 120481503601000302	Участок свободен от застройки, имеется линия электропередач, в радиусе 50 м водопровод, газопровод	0,1252	Для строительства и обслуживания жилого дома	480 390	48 040	536567 кроме того, расходы по размещению извещения о проведении аукциона в СМИ и другие по проведению аукциона

1. Аукцион состоится **5 февраля 2009 года** в 14.00 в здании Дома культуры пос. Жемчужный по адресу: Республика Беларусь, Брестская область, Барановичский район, пос. Жемчужный.

2. Условие аукциона:
- наличие не менее двух участников;
- строительство жилого дома в течение двух лет с момента предоставления земельного участка.

3. Продажа земельного участка производится гражданам Республики Беларусь, постоянно проживающим на территории Республики Беларусь или приравненным к постоянно проживающим, в соответствии с законодательством.

4. Шаг аукциона к начальной цене земельного участка — 15 %.

5. Для участия в аукционе необходимо в сроки, указанные в извещении, предоставить в комиссию по проведению аукциона заявление, к заявлению прилагают:
- заверенную банком копию платежного поручения (квитанция) о внесении задатка;
- копию документа, удостоверяющего личность, (паспорт) покупателя или его доверенного лица;
- доверенность, удостоверенную нотариально, если в аукционе участвует представитель физического лица.

При подаче документов на участие в аукционе граждане, представители граждан предъявляют паспорт или иной документ, удостоверяющий личность.

6. Сумма задатка перечисляется до 28 января 2009 года до 14.30 на расчетный счет 3600211050001 фил. 802 ОАО АСБ «Беларусбанк» код 150501245 УПП 200046491. Адрес банка: Брестская область, г. Барановичи, ул. Притыцкого, д. 140а.

Получатель: Жемчужненский сельский Совет депутатов, 225316, Брестская область, Барановичский район, пос. Жемчужный, ул. Ленина, д. 25.

Победитель аукциона — участник, предложивший наибольшую цену. Аукцион признается несостоявшимся, если заявление на участие подано менее чем двумя участниками, предмет аукциона не может быть продан по начальной цене.

7. Победитель аукциона обязан: оплатить в течение 10 рабочих дней со дня принятия решения о предоставлении земельного участка стоимость объекта продажи и затраты, связанные с подготовкой и проведением аукциона, по оформлению и государственной регистрации создания земельных участков, а также затрат, связанных с размещением извещения о проведении аукциона в средствах массовой информации.

8. Всем желающим предоставляется возможность предварительно ознакомиться с объектами продажи: каждый четверг недели после опубликования настоящего извещения в СМИ по предварительной записи в комиссии по тел.: 43 16 35, 43 01 36.

9. Продажа земельных участков производится без изменения их целевого назначения.

10. Заявления на участие в аукционе принимаются после размещения извещения о проведении аукциона в СМИ в рабочие дни с 5 января 2009 года в комиссии с 8.00 до 13.00 и с 14.00 до 17.00 (сельисполком). Последний день приема документов — 28 января 2009 года до 14.00.

К участию в торгах не допускаются участники, не прошедшие заключительную регистрацию.

11. Участник, ставший победителем аукциона, после окончания аукциона обязан: подписать протокол аукциона в день проведения аукциона; не позднее 10 дней после вступления в силу решения о предоставлении земельного участка возместить расходы по формированию и регистрации земельного участка и затраты на подготовку и проведение аукциона; внести плату за земельный участок; не позднее 12 дней после вступления в силу решения о предоставлении земельного участка произвести регистрацию права частной собственности на земельный участок.

ВЫПІСВАЙЦЕ «ЗВЯЗДУ» НА I КВАРТАЛ І ПЕРШАЕ ПАЎГОДДЗЕ 2009 ГОДА
З БЯСПЛАТНЫМІ ЎКЛАДКАМІ

НАШ ЧАРНОБЫЛЬ
МЕСТНОЕ САМОУПРАВЛЕНИЕ
СВАЯ СПРАВА
Наш культурны асяродак ЖЫРАНДОЛЯ
ЧЫРВОНАЯ ЗМЕНА
КУПІ ЛЕПШАЕ! ТАВАРЫ ПАСЛУГІ ЦЭНЫ
Краіна здароўя

ДЛЯ ІНДЫВІДУАЛЬНЫХ ПАДПІСЧЫКАЎ	63850	10 120 рублёў на месяц 30 360 рублёў на квартал 60 720 рублёў на паўгоддзе
ДЛЯ ВЕТЭРАНАЎ ВАВ І ПЕНСІЯНЕРАЎ	63145	9 570 рублёў на месяц 28 710 рублёў на квартал 57 420 рублёў на паўгоддзе
ДЛЯ ВЕДАМАСНЫХ ПАДПІСЧЫКАЎ	63858	16 170 рублёў на месяц 48 510 рублёў на квартал 97 020 рублёў на паўгоддзе
ВЕДАМАСНАЯ ПАДПІСКА ДЛЯ ЎСТАНОЎ МІНІСТЭРСТВА АДУКАЦЫІ, МІНІСТЭРСТВА КУЛЬТУРЫ І МІНІСТЭРСТВА АХОВЫ ЗДАРОЎЯ	63239	14 740 рублёў на месяц 44 220 рублёў на квартал 88 440 рублёў на паўгоддзе
ПАДПІСКА «ДА ЗАПАТРАБАВАННЯ» (праз кіёскі Мінгарсаюздруку)		
ДЛЯ ІНДЫВІДУАЛЬНЫХ ПАДПІСЧЫКАЎ	63850	8 690 рублёў на месяц 26 070 рублёў на квартал 52 140 рублёў на паўгоддзе
ДЛЯ ВЕТЭРАНАЎ ВАВ І ПЕНСІЯНЕРАЎ	63145	8 180 рублёў на месяц 24 540 рублёў на квартал 49 080 рублёў на паўгоддзе
ДЛЯ ВЕДАМАСНЫХ ПАДПІСЧЫКАЎ	63858	11 640 рублёў на месяц 34 920 рублёў на квартал 69 840 рублёў на паўгоддзе
ВЕДАМАСНАЯ ПАДПІСКА ДЛЯ ЎСТАНОЎ МІНІСТЭРСТВА АДУКАЦЫІ, МІНІСТЭРСТВА КУЛЬТУРЫ І МІНІСТЭРСТВА АХОВЫ ЗДАРОЎЯ	63239	11 010 рублёў на месяц 33 030 рублёў на квартал 66 060 рублёў на паўгоддзе

*Віншуем паважаную і любую **Рэгіну Міхайлаўну ЛЫСКАВЕЦ** з юбілеем.*

Хай кожны год —
як колас жыта
Заўсёды радасны, багаты.
А кожны дзень
табой пражыты
Каб падарункам быў
і святам.

Муж, дзеці, унукі,
вёска Якшыцы.

У **суд Рагачоўскага раёна Гомельскай вобласці** паступіла заява аб прызнанні адсутным без вестак грамадзяніна **Белякова Сяргея Рыгоравіча**, 1 студзеня 1974 года нараджэння, ураджэнца г. Рагачова, апошняе месца жыхарства — г. Рагачоў, вул. Мічурына, 1, апошняе вядомае месца знаходжання — г. Масква.

Просьба да ўсіх грамадзян і юрыдычных асобаў, якія маюць звесткі пра С.Р. Белякова, паведаміць іх суду Рагачоўскага раёна на працягу двух месяцаў з дня апублікавання аб'явы.

У **суд Пухавіцкага раёна Мінскай вобласці** паступіла заява аб прызнанні памерлай **Бурак Ніны Мікалаеўны**, 4 кастрычніка 1950 года нараджэння, апошняе вядомае месца жыхарства якой вёска Зазерка, вул. Чыгуначная, д. 11 Пухавіцкага раёна Мінскай вобласці.

Просьба да ўсіх грамадзян і юрыдычных асобаў, якія маюць звесткі пра Бурак Ніну Мікалаеўну, паведаміць іх суду Пухавіцкага раёна на працягу двух месяцаў з дня апублікавання аб'явы.

Прамая лінія

ПЕНСІІ ЗА ВЫСЛУГУ ГАДОЎ НЕ ЗНІКНУЦЬ

На пытанні чытачоў «Звязды» адказваюць намеснік начальніка галоўнага ўпраўлення пенсійнага забеспячэння і сацыяльнага страхавання Міністэрства працы і сацыяльнай абароны Валерый Валер'евіч КАВАЛЬКОЎ і намеснік начальніка аддзела развіцця пенсійнай сістэмы Сафія Рыгораўна СВЯРДЛОВА.

(Працяг. Пачатак у нумарах за 17 і 18 снежня.)

☎— Патлумачце, калі ласка, ці трэба збіраць даведкі за час працы па сумяшчальніцтве? Ці ёсць сэнс збіраць такія даведкі ў выпадку, калі арганізацыя (а, дакладней, кааператы) не плаціла ўзносы на дзяржаўнае сацыяльнае страхаванне? І па-другое, як разлічваецца індывідуальны каэфіцыент?

Анатоль Уладзіміравіч КАПУСЦІН, *г. Мінск*

— У заробак для вылічэння пенсій уключаюцца ўсе віды выплат у грашовай і натуральнай форме, якія налічваюцца на карысць работніка і з якіх плаціліся ўнёскі на дзяржаўнае сацыяльнае страхаванне. Такім чынам, заробкі за працу па сумяшчальніцтве, і ў тым ліку паводле грамадзянска-прававых дамоваў, пры прызначэнні пенсіі ўлічвацца будуць. Таму пацвярджаць гэтыя выплаты трэба. Аднак збіраць даведкі неабходна за працу (у тым ліку «сумяшчальніцкую») толькі да 1 студзеня 2003 года — пазней за гэту дату звесткі аб зарплаце траплялі на ваш індывідуальны рахунак у Фондзе сацыяльнай абароны насельніцтва.

Разам з тым варта падкрэсліць яшчэ раз: для пенсіі мае значэнне толькі той заробак, з якога рабіліся адлічэнні на дзяржаўнае сацыяльнае страхаванне. Адпаведна, калі кааператыў сацстрах не плаціў, ваша зарплата за час працы ў ім улічвацца не будзе і шукаць пацвярджальныя дакументы сапраўды не мае сэнсу.

Што да другога пытання, то індывідуальны каэфіцыент — гэта суадносіны вашай зарплаты і сярэдняй зарплаты па краіне за пэўны перыяд.

☎— Чаму так мала інфармацыі аб тым, што ў сувязі з «прывязкай» са жніўня 2006 года індывідуальнага каэфіцыента не да сярэдняй зарплаты рабочых і служачых, а да сярэдняй зарплаты па краіне ў цэлым, гэты каэфіцыент можа павялічыцца больш чым на «агульныя» 3,5 працэнта? Прыкладам, пасля падачы заявы ва ўпраўленне па працы і сацыяльнай абароны асабіста мой індывідуальны каэфіцыент узрос на 6,5 працэнта.

Па-другое, чаму падчас паведамленняў аб чарговай індэксацыі працоўных пенсій ніхто не кажа аб тым, выходзячы з якой зарплаты робіцца перараразлік?

І па-трэцяе. У сярэдзіне 1990-х каэфіцыент разлічваўся за 5 гадоў разам, а потым — за тыя ж 5 гадоў, але «месяц да месяца». Ці можна цяпер перараразлічць каэфіцыент за 5 гадоў паводле прынцыпу «месяц да месяца», але выходзячы з сярэдняй зарплаты ў цэлым па краіне?

Леанід Іванавіч КАЗЛЯК, *г. Мінск*

— Варта заўважыць: у пераважнай большасці пенсіянераў у выніку перараразліку індывідуальнага каэфіцыента зыходзячы з зарплаты работнікаў краіны ў цэлым гэты каэфіцыент павялічыўся нават менш чым на 3,5 працэнта. Гэта па-першае.

Па-другое. Дазвольце не пагадзіцца — у публікацыях аб павышэннях пенсій у сувязі з ростам сярэдняй зарплаты па краіне інфармацыя аб памеры зарплаты, з якой робіцца перараразлік, указваецца.

І па-трэцяе. Пенсіі, прызначаныя да 1 студзеня 2000 года, могуць быць перараслічаныя з заробку за любыя 5 гадоў запар з 15 апошніх гадоў працы. Пры гэтым індывідуальны каэфіцыент будзе вызначацца шляхам суадносінаў сярэднямесячнага фактычнага заробку пенсіянера і сярэдняй зарплаты па краіне ў тых жа месяцах, інакш кажучы, «месяц да месяца».

☎— За які перыяд павінен вызначацца індывідуальны каэфіцыент у 2009 годзе? І што будзе ў выпадку, калі ў «патрэбным» перыядзе будуць перапынкі ў працы?

Антаніна Мікалаеўна ЗЯНЬКОВІЧ, *г. Мінск*

— У 2009 годзе пенсіі будуць вылічвацца з заробку за любыя 15 гадоў запар з 25 апошніх гадоў працы. Прычым перапынкі ў гэтых (15-гадовым і 25-гадовым) перыядах улічвацца не будуць.

☎— Мой агульны стаж складае 32, а стаж работы выхавальнікам дзіцячага садка — 25 гадоў. У сувязі з гэтым хацелася б выйсці на датэрміновую пенсію. Ці не маглі б вы хоць бы прыкладна сказаць, якім можа быць памер гэтай пенсіі? Бо мой заробак невялікі, цяпер я атрымліваю каля 350 тысяч рублёў.

Галіна Андрэеўна ШАКІНА, *г. Барысаў*

— На памер пенсіі ўплывае як працягласць стажу, так і заробкі. Прычым, да прыкладу, сёлета бяруцца пад увагу заробкі за любыя 14 гадоў запар з апошніх 24 гадоў працы. На жаль, звестак аб вашай зарплаце за ўвесь гэты вельмі працяглы час мы не маем, а рабіць якія-небудзь нават умоўныя падлікі зыходзячы толькі з памеру вашых цяперашніх заробкаў было б няправільна.

☎— Як маці 5 дзяцей, збіраюся выходзіць на датэрміновую пенсію. Адкажыце, калі ласка, ці змагу я ў такім выпадку працягнуць працу на ранейшым месцы — настаўніцай?

Наталля Іванаўна ГОВАР, *Жлобінскі раён.*

— Прызначэнне і выплата датэрміновай пенсіі па ўзросце жанчыне, якая нарадзіла і выхавала 5 і больш дзяцей да 8-гадовага ўзросту, не абумоўленыя пакіданнем працы. Выплата такой пенсіі будзе рабіцца на агульных падставах.

☎— Ці можа выйсці на пенсію раней за 60 гадоў вадзіцель-дальнабойшчык?

Андрэй Пятровіч СВІРКО, г. Мінск

— Не, права на датэрміновую пенсію для гэтай катэгорыі вадзіцеляў няма, выйсці на заслужаны адпачынак вы зможаце толькі на агульных падставах.

☎— Ці мае права на датэрміновую пенсію тэхнік па штучным асемяненні рэтрацэрвікальным метадам цёлак і кароў?

Іван Сцяпанавіч ПАЎЛЮКАВЕЦ, *Іванаўскі раён*

— Зноў-такі для гэтай катэгорыі работнікаў права на датэрміновую пенсію заканадаўства не вызначае.

☎— Завуць мяне Вольга, тэлефаную з Ляхавіцкага раёна. А цікавіць наступнае: як будзе лічыцца стаж мужчыну-інваліду II групы за працу на няпоўную стаўку? І яшчэ пытанне. Пасля прызначэння пенсіі па інваліднасці зарплата зменшылася. У сувязі з гэтым ці не атрымаецца так, што пенсія па ўзросце будзе меншай за пенсію па інваліднасці?

— Для прызначэння пенсіі бяруцца пад увагу перыяды працы як на поўную, так і на няпоўную стаўку. Галоўнае, каб пры занятасці на няпоўную стаўку заробак не быў меншым за «мінімалку» — у такім разе год працы будзе лічыцца за год стажу. У адваротным выпадку стаж будзе лічыцца з паправачным, памяншальным каэфіцыентам.

І па другім пытанні. Як вядома, пры прызначэнні працоўнай пенсіі па інваліднасці вызначаецца індывідуальны каэфіцыент заробку. Пры прызначэнні ж пенсіі па ўзросце можна або пакінуць гэты каэфіцыент, або разлічыць новы, зыходзячы з працы пасля прызначэння групы. У гэтым выпадку ўсё залежыць ад таго, што больш выгадна самому чалавеку. Такім чынам, калі не знімуць групу, пры пераходзе з пенсіі па інваліднасці на пенсію па ўзросце памер выплат у любым выпадку не зменшыцца.

☎— У 1991 годзе атрымаў права выйсці на пенсію па ўзросце, але афармліся толькі праз год. У сувязі з гэтым, ці павінны перараслічыць маю пенсію?

Мікалай Васільевіч МАРЧАНКА, *Гродзенскі раён*

— Не. Магчымасць павелічэння пенсіі на 1 працэнт заробку за кожныя 2 месяцы часовай адмовы ад атрымання пенсіі па ўзросце на агульных падставах і працяг працы з'явілася толькі з 1 верасня 1998 года. Вы ж, Мікалай Васільевіч, выходзілі на пенсію раней. Адпаведна, на вас гэта норма не распаўсюджваецца.

☎— Адпрацаваў на шклозаводзе больш за 10 гадоў паводле Спіса № 1, а пасля — і паводле Спіса № 2. Наколькі я ведаю, некалі работнікі падобных прафесій маглі выйсці на датэрміновую пенсію. Ці застаецца такая магчымасць?

Ільхам ДЖАМІДАВІЧ, *Бабруйскі раён*

— Гэта магчымасць захавалася. Калі ёсць 10 гадоў спецыяльнага стажу паводле Спіса № 1 і само працоўнае месца пасля 1 студзеня 1992 года было прызнана падчас атэстацыі «шкодным», то на пенсію вы павінны выйсці ў 50 гадоў. А калі назбіралася не менш за палову з неабходнага 10-гадовага спецыяльнага стажу паводле Спіса № 1, то можна афармліцца на датэрміновую пенсію прапарцыянальна стажу, які ёсць. Напрыклад, за 9 гадоў спецыяльнага стажу ў гэтым выпадку можна пайсці на пенсію ў 51, за 8 гадоў — у 52 гады і гэтак далей.

☎— Непакоюць з Мастоўскага раёна, завуць мяне Людміла Міхайлаўна, а пытанне такое: як разлічваецца індывідуальны каэфіцыент у выпадку, калі здарыўся пажар і за частку неабходнага перыяду не захаваліся дакументы?

— У выпадку, калі ў выніку стыхійных бедстваў, аварый ці катастроф дакументы аб заробках не захаваліся, па жаданні самога пенсіянера гэты час не ўключаецца ў неабходны для разліку індывідуальнага каэфіцыента перыяд. А калі дакументы аб заробках захаваліся менш чым за неабходны перыяд «выбаркі» (скажам, сёлета менш чым за 14 гадоў), то заробкі за кожны месяц згубленага часу вызначаюцца па сярэдніх паказчыках зарплаты работнікаў аналагічных прафесій і кваліфікацый у адпаведнасці з пастановай Савета Міністраў ад 24 верасня 1998 года № 1487.

☎— Паводле заканадаўства, пенсіі павінны павышацца 4 разы ў год — у лютым, маі, жніўні і лістападзе. Чаму сёлета перараслік праводзіўся толькі адзін раз? На мой погляд, трэба не чытаць лекцыі аб праблемах пенсійнага фонду ці спасылацца на крызіс, а тэрмінова павялічваць пенсіі — гэта неабходна зрабіць яшчэ ў снежні.

Мікалай Васільевіч МАЛЫШЧЫЦ, *г. Салігорск*

— У Законе «Аб пенсійным забеспячэнні» адсутнічае норма, якая прадугледжвае абавязковыя перараслікі пенсій 4 разы на год. У заканадаўстве вызначаны толькі ўмовы павышэння пенсій. Пры гэтым падставай для павелічэння мінімальных пенсій па ўзросце, сацыяльных пенсій, а таксама надбавак і павышэнняў да іх з'яўляецца рост бюджэту пражыткавага мінімуму ў сярэднім на душу насельніцтва. А падстава для павелічэння пенсій працоўных — рост сярэдняй зарплаты работнікаў па краіне больш чым на 15 працэнтаў адносна зарплаты, з якой быў зроблены папярэдні перараслік.

☎— Ходзяць размовы, што ўжо ў хуткім часе ў Беларусі зменіцца пенсійны ўзрост. Ці так гэта?

Анатоль Міхайлавіч ПЕТРУШЭНКА, *г. Гомель*

— Не сакрэт, што праблема старэння насельніцтва для Беларусі аказалася адной з найбольш вострых. Ужо цяпер доля грамадзян ва ўзросце, што перавышае працаздольны, складае 18 працэнтаў. А ў бліжэйшае дзесяцігоддзе, паводле ацэнак дэмографаў, колькасць пенсіянераў павінна ўзрасці адразу на чвэрць, у той час як колькасць працаздольных грамадзян (патэнцыяльных плацельшчыкаў узносаў на пенсійнае страхаванне) зменшыцца на 10 працэнтаў. У выніку пенсійная нагрузка на эканоміку адчувальна ўзрасце, для фінансавання пенсійных выплат спатрэбяцца значныя дадатковыя сродкі. І ў гэтым плане павелічэнне пенсійнага ўзросту — адзін з самых эфектыўных шляхоў. Па сутнасці давядзецца выбіраць: або змяншаць пенсійны ўзрост, або змяншаць памеры пенсій.

Разам з тым трэба заўважыць, што пакуль пытанне аб павелічэнні пенсійнага ўзросту знаходзіцца толькі ў стадыі абмеркавання. І ніякіх рашэнняў на гэты конт у Беларусі не прымалася.

Сяргей ГРЫБ.

(Працяг будзе.)

Не хочаш, каб у пашпарце былі адбіткі пальцаў? Тваё права!

У Міжнародны дзень мігранта, 18 снежня, у Нацыянальным прэс-цэнтры адбылася прэс-канферэнцыя прадстаўнікоў Міжнароднай арганізацыі па міграцыі (МАМ), Міністэрства ўнутраных спраў і Дзяржаўнага памежнага камітэта.

У гэты дзень МАМ хоча яшчэ раз нагадаць усім дзяржавам свету пра станоўчы ўклад мігрантаў у эканамічны рост і станаўленне краін і просіць не зачыняць перад імі дзверы ў перыяд эканамічнага крызісу, бо такія меры толькі прымусяць мігрантаў звяртацца да паслуг кантрабандыстаў і гандляроў людзьмі, рызыкаваць жыццём пры спробах нелегальна з'ехаць у краіны.

У Беларусі дзейнічаюць некалькі сумесных праграм Міжнароднай арганізацыі па міграцыі і дзяржаўных органаў нашай краіны. Адна з іх — па барацьбе з гандлем людзьмі, якая працуе ў нас з верасня 2002 года.

— Усяго з 1994 года МАМ рэалізавала каля 500 аналагічных праектаў у больш як 85 краінах свету, — паведаміла **Наталля ЖАК, кіраўнік праекта па барацьбе з гандлем людзьмі Прадстаўніцтва МАМ.** — Міжнародная арганізацыя пасадзіла пачыць, што на любы момант у прымусовую працу ўцягнута каля 12 мільёнаў чалавек, а па іншых крыніцах — ад 4 да 27 мільёнаў. Каля 80 % ахвяраў транснацыянальнага гандлю складаюць жанчыны і дзяўчынкі, 50 % з іх — няпоўнагадовыя. Па ацэнках экспертаў, гандаль людзьмі прыносіць да 32 мільярдаў долараў у год. Пастаянна каля 2 мільёнаў дзяцей сутыкаюцца з жахамі сэксуальнай эксплуатацыі, і кожны з іх можа прадавацца ад 100 да 1500 разоў за год! Па звестках ЮНІСЕФ, каля 300 тысяч дзяцей у кожны момант выкарыстоўваюцца ў якасці салдатаў па ўсім свеце...

Аднак звестак па Беларусі Наталля Віктараўна агучыць не змагла, бо «гэтая з'ява носіць крымінальны характар, ды і многія пацярпелыя вельмі напужаныя і не гатовыя расказаць пра тое, што з імі адбылося, а ў большасці краін міграцыйнае заканадаўства і паліцыя разглядаюць ахвяраў гандлю людзьмі як проста нелегальных мігрантаў, ды і шмат пацярпелых, што трапляюць у рабства, на жаль, ніколі не вернуцца».

Другая праграма МАМ у Беларусі называецца «Садзейнічанне ў добраахвотным вяртанні мігрантаў на радзіму» і рэалізоўваецца сумесна з Дзяржаўным памежным камітэтам, МУС і шэрагам грамадскіх арганізацый. Яна дзейнічае ў нас з мая 2007 года: за гэты час былі пракансультаваныя 119 мігрантаў па магчымасці іх добраахвотнага вяртання дадому замест дэпартацыі, а 51 чалавеку былі аказаны поўныя пакеты такіх паслуг па вяртанні — у Пакістан, В'етнам, Афганістан, Бангладэш, Грузію, Турцыю, Кітай, Шры-Ланку, Іран і ва Украіну.

— Праект быў прызнаны паспяховым і мэты ў асноўным дасягнуты, — сказаў **палкоўнік Юрый ФЁДАРАЎ, начальнік упраўлення міжнароднага супрацоўніцтва Дзяржаўнага памежнага камітэта Беларусі.** — Праект павінен быў завяршыцца 31 снежня, але мы працягнулі яго да 30 мая і яшчэ ажыццявім шэраг дадатковых мерапрыемстваў, што не выходзяць за межы праекта.

Міністэрства ўнутраных спраў Беларусі сумесна з МАМ і Еўрапейскай камісіяй у нашай краіне з 2007 года рэалізуюць праект па паступовым пераходзе на біяметрычныя пашпарты. Пра тое, як гэта адбываецца, падзяліўся інфармацыяй **Анатоль ЛАНІН, намеснік начальніка Дэпартамента па грамадзянстве і міграцыі МУС:**

— Пакуль не вырашанае пытанне з кропкай адліку ўвядзення біяметрычных пашпартоў. 28 снежня мінулага года Прэзідэнт зацвердзіў Канцэпцыю стварэння дзяржаўнай сістэмы вырабу, афармлення, выдачы і кантролю пашпартна-візавых дакументаў новага пакалення. Агульны тэрмін мерапрыемстваў, прадугледжаных канцэпцыяй, — 2,5 года з моманту прыняцця рашэння аб біяметрычных дакументах. Чаму няма такога рашэння? Таму што адна з умоў увядзення біяметрычных пашпартоў — узнікненне перашкоды для выезду нашых грамадзян з краіны. На сёння такіх перашкодаў не існуе. Ёсць невялікія цяжкасці, калі чалавек атрымлівае візу ў Вялікабрытанію: яго ў амбасадзе просяць зняць адбіткі пальцаў і сфатаграфавацца. Гэта займае пару хвілін, і я не скажу, што гэта перашкода. Іншая справа, калі краіны свету скажуць, што перасоўвацца цераз мяжу можна толькі па біяметрычным пашпарце. Вось гэта будзе перашкода, і мы пачнём уводзіць і ў нас біяметрычныя пашпарты. А пакуль не трэба спяшацца, бо рэалізацыя пераходу на новыя пашпарты патрабуе вялікіх фінансавых выдаткаў. Падкрэслю, што ўвядзенне біяметрычных пашпартоў, калі будзе прынята такое рашэнне — гэта не другая пашпартызацыя. Іх атрыманне будзе толькі па заяўным прынцыпе і толькі пры жаданні грамадзяніна.

Павел БЕРАСНЕЎ.

ЖЫХАРЫ ПАМЕЖНЫХ РАЁНАЎ ЗМОГУЦЬ ПЕРАСЯКАЦЬ МЯЖУ БЕЗ ВІЗАЎ

З дакладных крыніц

Аб гэтым учора заявіў на брыфінгу для журналістаў начальнік галоўнага консульскага ўпраўлення МЗС Беларусі Андрэй Гіро. Брыфінг быў прысвечаны папярэднім вынікам дзейнасці консульскай службы Беларусі сёлета і планам на 2009 год.

Праўда, калі дакладна будзе гэта свята на мяжы, пакуль невядома, бо цяпер ідзе праца беларускіх дыпламатаў з замежнымі калегамі па завяршэнні адпаведных міжнародных пагадненняў. Паводле словаў начальніка галоўнага консульскага ўпраўлення, магчыма ўжо налета зменяцца правілы замежных паездак для жыхароў памежных раёнаў. А. Гіро ў агульных рысах абазначыў чаканыя наваўвядзенні. Так, у праектах пагадненняў прапаноўваюцца даволі прынцыповыя змяненні. Напрыклад, жыхары памежных раёнаў змогуць перасякаць мяжу без візаў. Але трэба будзе абавязкова мець пры сабе спецыяльны дазвол на шматразовае перасячэнне мяжы. Гэты дазвол будзе мець выгляд дакумента, які неабходна прад'яўляць на мяжы разам з пашпартам. Такая льгота закране толькі жыхароў, якія жывуць у 30-кіламетровай зоне.

Яшчэ адзін прынцыповы момант — дазвол будзе выдавацца на даволі працяглы тэрмін: ад аднаго — максімум да пяці гадоў, у залежнасці ад сітуацыі і абставінаў.

Важная заўвага: гэтыя паездкі нельга будзе выкарыстоўваць у камерцыйных мэтах, інакш кажучы, уладальнік дазволу пры перасячэнні мяжы не мае права перавозіць з сабой тавары, якія падлягаюць дэкларанаванню.

Як вядома, летась Беларусь асіметрычна адрэагавала на павышэнне цэнаў на шэнгенскія візы. Гэта мера датычылася Польшчы, Літвы, Латвіі і Эстоніі. Ці апраўдала сябе такая практыка, спыталі мы ў А. Гіро. На яго погляд, гэта быў крок у правільным накірунку. Нагадаем, напрыканцы мінулага года шэнгенская віза стала каштаваць для беларусаў 60 еўра. Можна было адказаць сіметрычна і ўсталяваць аналагічную цану за беларускую візу для грамадзян вышэйназваных краін. Але Беларусь зрабіла цану аднаразовай гасцявой ці дзелавой візы на тэрмін знаходжання да 30 дзён для жыхароў Польшчы, Літвы, Латвіі і Эстоніі ў памеры 25 еўра. У выніку сёлета колькасць беларускіх візаў для гасцей з Літвы і Латвіі не скарацілася, нават узрасла. Што датычыцца Польшчы, то колькасць выдадзеных беларускіх візаў павялічылася на 50-60 працэнтаў у параўнанні з мінулым годам. З іншага боку, істотна — больш чым удвая, скарацілася паездкі беларускіх грамадзян у Польшчу. Высокая цана шэнгенскай візы — адна з прычын. Такім чынам, удалы асіметрычны адказ дазволіў нам захаваць папярэдні ўзровень кантактаў з замежнымі партнёрамі. Акрамя гэтага цана 25 еўра за візу была вельмі станоўча ўспрынятая нашымі суайчыннікамі, якіх лёс закінуў у Польшчу, Літву, Латвію і Эстонію, сказаў А. Гіро. Бо гэта дазволіла ім наведваць этнічную радзіму ў ранейшым рэжыме.

Сёлета таксама пачалася работа па прасоўванні беларускай ініцыятывы аб заключэнні пагаднення з Еўрапейскім саюзам аб спрашчэнні візавых фармальнасцяў. Але пра якія-небудзь вынікі пакуль казаць рана.

Па-ранейшаму сёлета шмат увагі беларускіх консулаў займалі справы нашых суайчыннікаў, якія трапілі за мяжой ў непрыемныя гісторыі, напрыклад, дарожныя аварыі. Такіх выпадкаў і здарэнняў сёлета было даволі шмат. Больш за тысячу грамадзян Беларусі знаходзяцца за кратамі ў розных замежных краінах. Яны таксама маюць патрэбу ў падтрымцы. Геаграфія краін, дзе давялося дапамагаць нашым суграмадзянам, шырокая. Але пераважна гэта Расія, Польшча, Украіна, Францыя, Егіпет, Чэхія, Турцыя і шэраг іншых.

Леанід ЛАХМАНЕНКА.

ФОНД «МИНСКОБЛГОСИМУЩЕСТВО»

«29» декабря 2008 года в 15.00 по адресу: г. Минск, ул. Чкалова, 5 проводит повторный аукцион

по продаже объекта, находящегося в собственности Крупского района, и права заключения договора аренды земельного участка, необходимого для обслуживания недвижимого имущества

На аукционные торги выставляется предмет аукциона, включающий:

Здание склада (инв. № 613/С-7546), расположенное по адресу: Минская область, Крупский район, пос. Крупский, ул. Вокзальная, одноэтажное, 1990 года постройки, общей площадью 367,3 кв.м, имеется бетонная рампа 194 кв.м, и **право заключения договора аренды земельного участка**, площадью 0,0609 га, сроком на 10 лет, отведенного для обслуживания здания склада.

Начальная цена предмета аукциона 36 588 601 рубль (в том числе: объект – 36 568 191 рубль и право заключения договора аренды земельного участка – 20 410 рублей).

Сумма задатка для участия в аукционных торгах 3 000 000 руб.

Продавец имущества: Коммунальное производственное унитарное предприятие «Крупский деревообрабатывающий комбинат», расположенный по адресу: Минская область, г. Крупки, ул. Чапаева, 2, тел (801796) 55 1 54.

Арендодатель земельного участка: Крупский районный исполнительный комитет.

ПОБЕДИТЕЛЬ ОБЯЗАН:

1. Крупский райисполком принимает решение о представлении победителю аукциона земельного участка в течение 2 рабочих дней со дня проведения аукциона.

2. Победитель аукциона в течение 2 рабочих дней со дня проведения аукциона возмещает расходы, связанные с организацией и проведением аукциона, а также расходы, связанные с формированием земельного участка, вносит плату, взимаемую за право заключения договора аренды. После внесения победителем аукциона названных платежей продавец имущества заключает договор купли-продажи недвижимого имущества, а Арендодатель земельного участка – договор аренды земельного участка.

3. Оплата за объект недвижимости должна быть произведена победителем аукциона по 31 декабря 2008 г.

Порядок проведения аукциона определен постановлением Совета Министров Республики Беларусь от 26 марта 2008 г. № 462.

Фонд «Минскоблгосимущество» (организатор аукциона) имеет право снять предмет аукциона в любой момент до даты проведения аукциона.

Подробное извещение о проведении аукциона опубликовано **в газете «Крупскі веснік» от 9 августа 2008 г. № 61.**

Все **расчеты по сумме задатка** производятся путем перечисления их на расчетный счет фонда «Минскоблгосимущество» № 3642000000028 в ОАО «АСБ Беларусбанк» в г. Минске, код 795, ул. Мясникова, 32, УНН 100128686.

Заявки на участие в аукционе принимаются ежедневно в рабочие дни с 8.00 до 13.00 и с 14.00 до 17.00 по адресу: г. Минск, ул. Чкалова, 5, к. 312, тел. 224 57 09. Последний день подачи заявок 24 декабря 2008 г. до 13.00.

КУП «Минский областной центр учета недвижимости» по поручению Смиловичского посисполкома Червенского р-на

ПРОВОДИТ ОТКРЫТЫЙ АУКЦИОН

по продаже земельных участков в частную собственность гражданам РБ для строительства и обслуживания одноквартирных жилых домов в г.п. Смиловичи:

№ лота	Адрес земельного участка, кадастровый номер	Пл. зем. участка (га)	Наличие инженерных сетей	Начальная цена (бел. руб.)	Задаток (бел. руб.)	Расходы по документации (бел. руб.)
1	ул. Песочная, уч. № 19, 625855700001001322	0,1503	В непосредственной близости имеются сети электроснабжения, газоснабжения, готовится документация на прокладку водопровода	1 681 601	165 000	560 983
2	ул. Песочная, уч.№ 20, 625855700001001323	0,1485		1 661 462	165 000	560 983
3	ул. Песочная, уч. № 21, 625855700001001321	0,1432		1 602 165	160 000	560 983
4	ул. Солнечная, уч. № 24, 625855700001001319	0,1494		1 671 532	165 000	573 898
5	ул. Солнечная, уч. № 26, 625855700001001320	0,1488		1 664 819	165 000	560 983

Задаток перечисляется на р/с 3012020200010 в Октябрьском отделении ОАО «БПС-Банк», г. Минск, МФО 153001357, УНП 690324015, КУП «Минский областной центр учета недвижимости». Победитель аукциона обязан в течение 10 рабочих дней после утверждения протокола о результатах аукциона внести плату за земельный участок, возместить расходы связанные с подготовкой документации. Все желающие могут ознакомиться с документацией и земельными участками. Порядок проведения аукциона оговорен в условиях его проведения. Аукцион состоится **20.01.2009 г.** в 12.00 по адресу: г. Минск, ул. Чкалова, 5, к. 326. Заявления на участие и необходимые документы принимаются по **14.01.2009 г.** до 17.00 по вышеуказанному адресу.

Контактный телефон (8 017) 224 61 34. Наш сайт в интернете: www.rlt.by.

КУП «Минский областной центр учета недвижимости», УНП 690324015.

Бяседныя песні

ОЙ, ЗІМА, ЗІМА

І мароз адступае, калі гучыць-разносіцца песня. І людзі прасвятляюцца, духоўна ўзносяцца, калі спяваюць. І звычайная бяседа становіцца прамяністым святам, калі абрамляецца песенным вянком. Трэба спяваць! Асабліва на навагодняй бяседзе. Думкамі, усім пачуццёвым станам у навагоднюю ноч мы праграмуем сваю перспектыву. І наша сумесная песня адгукнецца ў наступным годзе радаснымі дзеямі, шчаслівымі імгненнямі...

Да свята заўсёды рыхтуюцца. Дбаем пра пачастункі, напоі. А духоўна-інтэлектуальная аснова навагодняй сустрэчы? Яна ж не абмяжоўваецца толькі падарункамі ды тостамі. І ніколі не трэба забываць пра эмацыйны характар бяседы.

Аднак у апошнія дзесяцігоддзі клопат пра навагоднюю весялосць, песні амаль усе бяседнікі перакінулі на тэлебачанне. І яно забаўляе нас. То на адной праграме, то на другой, трэцяй... шукаем духоўнага паратунку. Гэтак спадзяёмся паяднаць застольнікаў... А потым цэлы год не можам выправіць духоўную ўраўнаважанасць. Асабістую. І агульную. Бо не нашымі душамі яднаўся навагодні рэй...

І заўсёды на дапамогу прыходзіць песня. І не адна. Свая, родная. І сяброў, суседніх народаў. Няхай навагодняя ноч рознакалярова асветліцца ад сумеснага спеву, ад шчырасці нашых духоўных памкненняў.

— Ой, зіма, зіма, ты марозная,
Нашто ж ты каня, эй, замарозіла?

Каня белага, сівагрывага,
Хлопца й молайца, эй, чорнабрывага.

А ў таго хлопца кучары ўюцца,
За яго кудры, эй, дзяўчаты б'юцца.

— Вы ж не біцеся, не сварыцеся,
За мае кудры, эй, памірыцеся.

А мае кудры ўюцца не для вас,
Ёсць ў мяне дзяўчына — лепшая ад вас.

Яна мяне ў бой выправажала,
Яна мае кудры пазавівала.

Другі радок кожнай страфы паўтараецца. Звычайна назва народнай песні падаецца па першым радку, але называюць і скарочана. Як і ўсе фальклорныя творы, так і песня «Ой, зіма, зіма» бытуе ў варыянтах. Змяшчаецца тэкст, які запісаў Уладзімір Раговіч на Століншчыне. Некаторыя эстрадныя гурты першую страфу песні робяць прыпевам.

Падрыхтаваў Міхась ШАВЫРКІН.

Прафесійныя даты

Ваеннай контрразведцы — 90

Учора, у дзень 90-годдзя ваеннай контрразведкі і напярэдадні суботняга Дня супрацоўніка органаў дзяржаўнай бяспекі ў клубе імя Ф.Э. Дзяржынскага адбылося ўрачыстае пасяджэнне, на якім быў прадэманстраваны дакументальны фільм, прысвечаны ваеннай контрразведцы Беларусі, прайшло ўзнагароджанне лепшых райаддзелаў органаў бяспекі і святочны канцэрт.

Паводле словаў начальніка ўпраўлення ваеннай контрразведкі КДБ Аляксея Захарава, у найбліжэйшы час «мы без працы не застанёмся». Ваенная контрразведка — гэта бяспека ўзброеных сілаў дзяржавы. Менавіта апошнія з'яўляюцца першым аб'ектам увагі замежных спецслужбаў, цікавасць якіх толькі ўзрастае па меры росту ўсведамлення Беларуссю сваёй суверэннасці. «Ваенны контрразведчык абавязкова павінен любіць радзіму, пажадана — валодаць энцыклапедычнымі ведамі і хацець займацца справай, якая патрабуе вялікіх сілаў», — сказаў Аляксей Захараў.

— Камітэт дзяржбяспекі як адзін з інстытутаў дзяржаўнай улады Рэспублікі Беларусь прайшоў складаны гістарычны шлях, але захаваў найлепшыя традыцыі спецслужбы, патэнцыял, які здольны забяспечваць абарону нацыянальных інтарэсаў краіны, — адзначыў перад урачыстасцямі старшыня Камітэта дзяржаўнай бяспекі Вадзім Зайцаў. — Што датычыцца ваеннай контрразведкі, то яна вырашае не толькі пытанне ўласна контрразведчага забеспячэння ваенных арганізацый і спыненне замахаў замежных спецслужбаў, але і эфектыўна змагаецца з праявамі тэрарызму, наркатрафіку праз аб'екты, размешчаныя на тэрыторыі Беларусі, бярэ актыўны ўдзел у выкананні агульных задач камітэта — барацьбе з карупцыяй і многімі іншымі відамі небяспечных злачынстваў. На сёння ваенная контрразведка — найбольш баяздольны атрад чэкістаў... Я хацеў бы пажадаць усім работнікам органаў бяспекі горача любіць сваю Радзіму, быць адказнымі людзьмі і выконваць тыя функцыі, якія паспяхова вырашалі нашы папярэднікі ў больш складаных умовах...

Святлана БАРЫСЕНКА.

ЦІ ВЕРНЕЦЦА ДАДОМУ МАЛЫ АРЛЕЦ?

Беларускім арнітолагам стала вядома, што ў Егіпце загінулі некалькі дзясяткаў птушак: 27 малых арляцоў і 30 белых буслоў. Вельмі верагодна, што арляцы маглі быць беларускімі, а буслы — тым больш, паведамілі мне ў грамадскай арганізацыі «Ахова птушак Бацькаўшчыны». І прычына масавай гібелі птушак таксама застаецца невядомай.

Супрацоўнік АПБ Аляксандр Вінчэўскі патлумачыў, якая небяспека ўвогуле чакае крылатых прадстаўнікоў жывёльнага свету падчас іхняй міграцыі на зімоўку ў цёплыя краіны: «Атручванне, паляванне, сутыкненне з лініямі электрапередач (ЛЭП) і ветравымі генератарнымі ўстаноўкамі. Страчванне месцапражывання, калі на шляху міграцыі зменена важная тэрыторыя. Птушкі маглі загінуць ад знясілення, бо не здолелі папоўніць свае рэзервы там, дзе рабілі прыпынкі яны і іхнія продкі тысячу гадоў таму». Здзіўленне беларускіх арнітолагаў выклікае факт, што загінулі не толькі гэтыя лунаючыя птушкі, і кулікі, і асаед знойдзены таксама мёртвымі.

Паводле Чырвонай Кнігі Беларусі, на нашай тэрыторыі водзіцца 3200—3800 пар малых арляцоў. Наогул, арлец распаўсюджаны на еўрапейскай тэрыторыі ад Прыбалтыкі да паўночнай часткі Грэцыі. Асноўным месцам зімоўкі птушкі з'яўляецца Афрыка. Але ляцяць гэтыя прадстаўнікі сямейства шуляковых і ў Індыю, Іран, Малую Азію і Індакітай. Зразумела, калі б хоць адна птушка з загінулых была акальцавана, можна было б меркаваць, навакольны свет якой краіны панёс страту. Мінулым летам мне давялося назіраць за гняздом малога арляца, бачыць паводзіны птушаняці ў моманты падлёту і кармлення яго птушкамібацькамі. Праседжваў на дрэве па 5-8 гадзін, каб зрабіць некалькі характэрных фотаздымкаў. Асабліва цікава было назіраць за птушанём 8-9-тыднёвага ўзросту, перад самым яго вылетам, з распасцёртымі крыламі над гняздом. Размах крылаў у такім узросце можа дасягаць цэлага метра. Птушка гэтая вельмі асцярожная і нават калі не бачыць небяспекі, шчаўчок затвора фотаапарата добра чуе і за 15-20 метраў. Таму фотаздымкі з дарослымі птушкамі заўсёды рэдкія. Міжволі думаю, раптам бяда напаткала менавіта гэтых арляцоў. І з нецярпеннем чакаю вясны, каб пераканацца, што я памыляюся.

Анатоль КЛЯШЧУК, фота аўтара.

Інфарм-укол

БЕГ АД ЦУКРОВАГА ДЫЯБЕТУ

Плаванне, бег, язда на веласіпедзе, скокі праз скакалку, бег па лесвіцы і г.д. — усё гэта азначае добрае самаадчуванне і дазваляе пазбегнуць сардэчна-сасудзістых захворванняў па многіх прычынах, адна з якіх звязана з узроўнем глюкозы.

Глюкоза прымушае мускулы працаваць і спрыяе паглынанню гэтага спажыўнага рэчыва клеткамі. Пры актыўнай фізічнай нагрузцы глюкоза лепш выкарыстоўваецца і не застаецца ў крыві.

Перавагі фізічных заняткаў:

— у арганізме выпрацоўваецца неабходная колькасць інсуліну;

— правільна расходуецца глюкоза;

— забяспечваецца кантроль за масай цела;

— назіраецца адчуванне актыўнасці;

— выпрацоўваюцца рэчывы, звязаныя з добрым настроем;

— трэніруецца сэрца.

Майце на ўвазе, што таптанне каля пліты, уборка кватэры раз на тыдзень не вырашаюць пытанне належнай колькасці фізічнай актыўнасці. Калі мы гаворым пра хаду, гэта значыць, што хадзіць трэба хутка, без перапынку, па 30 хвілін не менш за 5 разоў на тыдзень.

Майце на ўвазе, што добрае функцыянаванне арганізма і ўсе перавагі фізічнай дзейнасці магчымыя толькі ў тым выпадку, калі цела атрымлівае харчаванне. Пажадана да заняткаў з'есці, напрыклад, лёгкі сандвіч з сокам, а па завяршэнні апошніх — фрукты з вялікім утрыманнем валокнаў.

ІНТЫМ ДЛЯ ДОБРАГА НАСТРОЮ

Задавальненне запаўняе мозг эндарфінам — рэчывам, якое паступае ў кроў і распаўсюджвае эфект расслаблення, прафілактуе дэпрэсіўны настрой.

Людзі, якія вядуць рэгулярнае палавое жыццё, адрозніваюцца эмацыянальным балансам. Як сцвярджаюць замежныя спецыялісты, пры высокім лібідо паляпшаецца і пачуццё ўласнай годнасці. Акрамя таго, падчас заняткаў сэксам спальваецца дастатковая колькасць калорый. А страта масы — гэта добры спосаб для збалансавання ўсіх гармонаў, што спрыяе добраму выкарыстанню глюкозы клеткамі.

Святлана БАРЫСЕНКА.

Краіна здароўя

Выпуск № 58 (114)

Прэч з вачэй маіх, ячмень!

Павека зачасалася, пачырванела і прыпухла... Зірк у люстэрка: так і ёсць — выскачыў ячмень. Апошні — дастаткова распаўсюджаная з'ява. Напэўна, няма такога чалавека, які б не меў сумніўнага задавальнення перахварэць на ячмень хоць раз у жыцці, а некаторыя ўмудраюцца хадзіць з запаленымі павекамі па некалькі разоў на год.

Ячмень — гнойнае запаленне валасянога мяшэчка веек або сальнай залозы павека. Спачатку з'яўляецца хваравітая чырванаватая прыпухласць, на працягу некалькіх дзён яна павялічваецца, а зверху ўзнікае жаўтавата-белы гнайнічок, які прыкладна праз тры-чатыры дні раскрываецца. Бывае, што інфекцыя пераходзіць з аднаго вока на другое або ў адным месцы «вырастае» адразу некалькі гнайнічкоў.

Медыкі адзначаюць, што ячмень можа сігналізаваць аб непаладках у імуннай сістэме. Часам запаленне правакуецца цукровым дыябетам, анеміяй, авітамінозам, захворваннямі страўнікава-кішачнага тракта. Да з'яўлення ячменю можа прывесці пападанне ў вока пылінак, парушынак, перхаці, а таксама выкарыстанне нясвежых ручнікоў, хусцінак або няякаснай касметыкі, праціранне вачэй нямытымі рукамі. Нярэдка балючая «гарошына» выскаквае ў выніку прастуды вачэй, асабліва ад моцнага халоднага ветру або скразняку. Пад выглядам ячменю могуць хавацца дробныя кісты або пухліны, таму калі ўпэўненасці ў тым, што гэта сапраўды ячмень, няма, — лепш звярнуцца да ўрача.

Ну, а калі гэта «ваш даўні знаёмы», то хуткую дапамогу можна аказаць сабе ў хатніх умовах.

Для пачатку адмоўцеся ад вострага жадання «пракалоць» або «выціснуць». Медыцыне вядомыя сумныя выпадкі «барацьбы» з ячменем, якія заканчваліся заражэннем крыві або нават менінгітам. Таму — не рызыкуйце!

Перш-наперш, калі ячмень толькі пачынае з'яўляцца, паспрабуйце прыпячы месца будучага ячменю. Тут можна выкарыстаць медыцынскі спірт, ёд або зялёнку. Будзьце асцярожнымі, каб рэчыва, якім вы будзеце прыпякаць балячку, не трапіла ў вока. Падчас прыпякання хворае вока трэба прыплюшчыць. Лепш за ўсё скарыстацца ватнай палачкай — яна дастаткова тонкая, каб не патрапіць у вока. Для таго, каб знішчыць інфекцыю, трэба патрымаць праспіртаваную ватку на хворым месцы на працягу 10—20 хвілін.

Ячмень многія рэкамендуюць праграваць. Гэта сапраўды дапамагае пазбавіцца ад яго, але ёсць адзін нюанс. Калі пачаць грэць ячмень да таго, як раскрыецца гнайнік, вы рызыкуеце толькі ўзмацніць запаленне. Лепш пачынаць праграванне тады, калі ячмень ужо раскрыўся і з'явіўся гной. У хатніх умовах лепшай грэлкай у гэтым выпадку будзе варанае яйка — абгарніце яго мяккай тканінай, каб не апячы скуру павека і прыкладзіце да хворага месца. Праводзіць працэдуру трэба па некалькі разоў на дзень.

Сярод народных спосабаў барацьбы з ячменем — сагравальныя кампрэсы і прымочкі з раслінных кампанентаў.

- Прыкладзіце да вока сурвэтку, змочаную ў цёплай вадзе, або кампрэс са слабага настою рамонку (таксама падыдзе разведзены сок алоэ, настоі васілька, лопуху і календулы).
- Дапаможа і цёплая прыпарка з мякішу булкі, звараная у малацэ (100 г мякішу змяшаць з 200 мл малака, вытрымаць у каструлі на слабым агні 10—15 хвілін, дадаць у атрыманую масу чайную лыжку парашку з лісця трыпутніку).
- Нядрэнна спраўляецца з ячменем і кроп: 1 ст. лыжку здробненага кропу заліце 2 шк. кіпеню, дайце настояцца, крыху астудзіце, працадзіце і рабіце кампрэсы на павекі.
- Можна паспрабаваць і такі варыянт: прыкладаць да хворага месца падагрэтае льняное насенне ў марлевым мяшэчку.
- Яшчэ адзін арыгінальны народны рэцэпт, які абяцае назаўсёды пазбавіць ад гэтай хваробы: з'ядаць па 5—6 сухіх маленькіх жоўтых кветак піжмы. На дзень трэба прымаць вышэйзгаданую дозу 4—5 разоў, запіваючы вадой. Паўтараць, пакуль ячмень не сыдзе.

Медыкі раяць лячыць ячмень, як і любое іншае запаленне, антыбіётыкамі. Можна выкарыстаць стары праверан альбуцыд або вочныя мазі з антыбіётыкамі. Апошнія пажадана закладваць перад сном, бо пасля таго, як мазь размяркуецца пад ніжнім павекам, вы будзеце бачыць прадметы як праз матавае шкло, што не вельмі зручна.

Калі, нягледзячы на прынятыя захады, захворванне прагрэсуе, тэрмінова звярніцеся да ўрача-афтальмолага.

Можа здарыцца так, што ячмень не раскрыецца, а проста знікне — гэта нармальна. А каб ён не выскачыў зноў, умацоўвайце свой арганізм: больш бывайце на свежым паветры, старайцеся не перагаладжвацца, часцей ужывайце садавіну і гародніну, прымайце полівітаміны, імунастымулятары.

Падрыхтавала Вольга ЦЫБУЛЬСКАЯ.

Галоўны нарколаг Мінска: прадмет па прафілактыцы п'янства і алкагалізму неабходна ўвесці ў абавязковую школьную праграму

Мэтавай групай павінны стаць навучэнцы 7—11 класаў. У гэты час у іх арганізмах, якія шчэ не сфарміраваліся, адбываецца гарманальны выбух, падчас якога з'яўляецца цяга да спіртнога, адзначыў Сяргей Малочка.

На думку С. Малочкі, такая форма санасветпрацы з дзецьмі і падлеткамі як эпізадычныя лекцыі па антыалкагольнай прапагандзе, даўно састарэла. У такой падачы інфармацыю падлеткі проста не ўспрымаюць.

Цяпер на ўліку ў Мінскім гарадскім клінічным наркалагічным дыспансеры знаходзяцца 5200 падлеткаў. Суадносіны хлопчыкаў і дзяўчынак — 5:1.

У Мінску штогод павялічваецца колькасць жанчын, якія пакутуюць ад алкагалізму. «За апошнія пяць гадоў тэмпы росту жаночага алкагалізму — 7 працэнтаў у год, мужчынскага — 3—4 працэнты».

Цяпер на ўліку ў наркалагічным дыспансеры знаходзяцца каля 46 тысяч чалавек. Аднак, паводле слоў спецыяліста, у поле зроку медыкаў трапляюць ад 10 да 20 працэнтаў людзей, якія злоўжываюць спіртнымі напоямі. Такім чынам, узгаданую лічбу трэба памнажыць мінімум на 5, максімум — на 10. Пры гэтым, падкрэсліў С. Малочка, калі 30 гадоў таму суадносіны жанчын і мужчын, якія пакутуюць ад алкагалізму і знаходзяцца на ўліку, было 1:10, у 90-х гадах мінулага стагоддзя — 1:5, то ў 2008-м ужо 1:4.

Нарколагі лічаць, што часцей за ўсё жанчыны пачынаюць піць з-за сямейных неладаў, якія заканчваюцца разводам. Лічыць жанчын намнога цяжэй, чым мужчын. За выключэннем тых, у каго яшчэ захавалася сям'я або ёсць хаця б тэарэтычная магчымасць аднавіць сямейныя адносіны.

Наогул за апошняе дзесяцігоддзе колькасць мінчан, якія назіраюцца ў нарколагаў, павялічылася ў сярэднім у 1,5 раза.

Вольга ГРЫГОР'ЕВА, «Мінск—Навіны».

ОАО «Минский приборостроительный завод»

ПРОВОДИТ ОТКРЫТЫЙ АУКЦИОН ПО ПРОДАЖЕ:

Лот 1 Радиально-сверлильный станок 2А53
Начальная цена 1 200 000 бел. руб. с НДС

Лот 2 Токарно-винторезный станок 1К625
Начальная цена 1 400 000 бел. руб. с НДС

Лот 3 Широкоуниверсальный фрезерный станок мод. 676
Начальная цена 1 300 000 бел. руб. с НДС

Лот 4 Широкоуниверсальный фрезерный станок мод. 676П
Начальная цена 2 500 000 бел. руб. с НДС

Лот 5 Плоскошлифовальный станок мод. 71М
Начальная цена 850 000 бел. руб. с НДС

Лот 6 Ножницы ручные рычажные — 2 шт.
Начальная цена 120 000 бел. руб. с НДС каждый

Лот 7 Ножницы гильотинные
Начальная цена 1 600 000 бел. руб. с НДС

Лот 8 Ножницы гильотинные
Начальная цена 420 000 бел. руб. с НДС

Лот 9 Горизонтально-расточной станок
Начальная цена 8 100 000 бел. руб. с НДС

Лот 10 Станок для изготовления фланцев из уголков КО-0027
Начальная цена 1 400 000 бел. руб. с НДС

Лот 11 Стол регулировщика — 10 шт.
Начальная цена 90 000 бел. руб. с НДС каждый

Лот 12 Продольно-строгальный станок 7212
Начальная цена 12 400 000 бел. руб. с НДС

Лот 13 Верстак слесарный с электрооборудованием ВС-24 — 4 шт.
Начальная цена 100 000 бел. руб. с НДС каждый

Лот 14 Вертикально-сверлильный станок МН18Н-45
Начальная цена 1 600 000 бел. руб. с НДС

Лот 15 Пресс ручной винтовой
Начальная цена 350 000 бел. руб. с НДС

Лот 16 Пресс механический КЛ-2126
Начальная цена 2 250 000 бел. руб. с НДС

Лот 17 Пресс однокривошипный открытый КЛ-2128Е
Начальная цена 700 000 бел. руб. с НДС

Лот 18 Пневмопресс
Начальная цена 200 000 бел. руб. с НДС

Лот 19 Пресс гидравлический Д-2430Б
Начальная цена 1 100 000 бел. руб. с НДС

Лот 20 Вальцы для гибки конусов
Начальная цена 400 000 бел. руб. с НДС

Лот 21 Линия гальванического покрытия п/п
Начальная цена 150 000 бел. руб. с НДС

Лот 22 Сверлильно-фрезерный станок для п/п Compact 23-2/4p
Начальная цена 22 700 000 бел. руб. с НДС

Лот 23 Установка для зачистки плат
Начальная цена 250 000 бел. руб. с НДС

Лот 24 Станок для рихтования
Начальная цена 450 000 бел. руб. с НДС

Лот 25 Станок для механической зачистки деталей
Начальная цена 300 000 бел. руб. с НДС

Лот 26 Рольганг — 2 шт.
Начальная цена 600 000 бел. руб. с НДС каждый

Лот 27 Бетоносмеситель — БГ-100
Начальная цена 200 000 бел. руб. с НДС

Всю необходимую информацию можно получить
по адресу: г. Минск, пр. Независимости, 58.
Контактный телефон 8 (017) 293 94 33. Факс 331 41 97.
Аукцион состоится 22 января 2009 г. в 13.00
по адресу: г. Минск, пр. Независимости, 58.
Заявления на участие и необходимые документы принимаются
по 21 января до 16.00.

УНП 100363840

КУРС НА СТОПРАЦЭНТНУЮ «МАБІЛІЗАЦЫЮ»?

У буйных гарадах свой сотавы тэлефон ёсць ужо ў кожнага другога вучня малодшых класаў

«Мабільны тэлефон: небяспека ўяўная ці рэальная?», «Мабільныя тэлефоны больш небяспечныя, чым курэнне і азбеставы пыл», «Новыя страхі наконт мабільнай сувязі», « Пацукі пацвердзілі: выпраменьванне мабільнікаў калечыць мозг», «Мабільнікі правакуюць развіццё рака» — такімі загалоўкамі літаральна стракаціць рускамоўны сектар інтэрнэта.

Дыскусіі наконт шкоднасці мабільных тэлефонаў для здароўя чалавека вядуцца ўжо даўно. Аднак на жаданне людзей займець свой мабільнік, ды яшчэ і падключыцца адразу да розных аператараў, яны ніяк не ўплываюць. За апошнія некалькі гадоў развіццё мабільнай сувязі набыло проста глабальны маштаб, а мабільнік заняў месца незаменнага спадарожніка, які суправаджае свайго ўладальніка ўсе 24 гадзіны ў суткі. Брытанскія даследчыкі ўжо назвалі мабільны тэлефон «наркотыкам новага пакалення». У выніку праведзенага англійскімі сацыёлагамі даследавання, 40 працэнтаў удзельнікаў апытання прызналіся, што «ўвогуле не могуць жыць без сваіх мабільных тэлефонаў», 17 працэнтаў імкнуцца пастаянна трымаць «трубу» калі не ў руках, то ў кішэні, а 8 працэнтаў бяруць мабільнік па начах нават з сабой у ложак.

Асобную нішу сярод карыстальнікаў мабільнай сувязі, прычым вельмі актыўных, складаюць дзеці і падлеткі, якіх спецыялісты адносяць да групы павышанай рызыкі негатыўнага ўздзеяння на здароўе электрамагнітнага выпраменьвання ад сотавага тэлефона. Згодна з даследаваннямі расійскіх спецыялістаў, выкарыстанне мабільных тэлефонаў дзецьмі можа цягнуць за сабой пагаршэнне памяці, хранічную стому, зніжэнне ўвагі і разумовых здольнасцяў, быць прычынай раздражняльнасці, парушэнняў сну і нават прыводзіць да такіх сур'ёзных наступстваў, як развіццё хваробы Альцгеймера, пухлін мозга, дэпрэсіўнага сіндрому і іншых.

Рэспубліканскі навукова-практычны цэнтр гігіены Міністэрства аховы здароўя Рэспублікі Беларусь правёў даследаванне па вызначэнні распаўсюджанасці сотавых тэлефонаў сярод беларускіх дзяцей і падлеткаў. Апытана больш як 5000 школьнікаў і дашкольнікаў — жыхароў Мінска і абласных цэнтраў. Даследаванне праводзілася ў 2007-2008 гадах, што дало магчымасць параўнаць, наколькі інтэнсіўна праходзіць у нашай краіне «мабілізацыя» дзіцячай аўдыторыі.

— У ходзе даследавання, якое праводзілася РНПЦ гігіены, было выяўлена некалькі даволі цікавых фактаў. Так, высветлілася, што большасць дашкольнікаў ужо маюць вопыт размовы па сотавым тэлефоне. Праўда, дзеці чатырохшасці гадоў, якія наведваюць старэйшыя і сярэднія групы дашкольных устаноў, маюць сотавыя тэлефоны толькі ў выключных выпадках, калі ёсць патрэба ў неадкладнай сувязі выхавальніка з бацькамі дзіцяці, напрыклад, пры наяўнасці хранічных захворванняў. А ўласныя сотавыя тэлефоны з'яўляюцца ў дзяцей ужо з першага класа, — расказала журналісту **«Звязды» навуковы супрацоўнік лабараторыі комплексных праблем фізічных фактараў асяроддзя пражывання чалавека Марыя ДОЙНІКАВА.** — На жаль, колькасць карыстальнікаў сотавых тэлефонаў сярод школьнікаў працягвае імклівa павялічвацца. За апошні год колькасць дзяцей ва

У групе старшакласнікаў працягласць адной тэлефоннай размовы можа дасягаць 40-60 хвілін, асабліва гэта датычыцца старшакласніц.

ўзросце ад 7 да 10 гадоў — уладальнікаў сотавых тэлефонаў — вырасла, заўважу, ажно ўдвая! Кожны другі вучань малодшых класаў з'яўляецца ўладальнікам уласнай крыніцы электрамагнітнага выпраменьвання. Сярод вучняў сярэдніх класаў колькасць уладальнікаў мабільных тэлефонаў вагаецца ад 89 да 91 працэнта, а ва ўзроставай групе ад 15 да 18 гадоў дасягае ўжо 97 працэнтаў. Пры гэтым варта дадаць, што жаданне мець свой сотавы тэлефон ёсць амаль ва ўсіх вучняў малодшых і сярэдніх класаў, якія пакуль што іх не маюць.

— Вы назвалі мабільны тэлефон уласнай крыніцай электрамагнітнага выпраменьвання...

— Сотавы тэлефон — гэта фактычна малагабарытны прыёмапераддатчык, які максімальна набліжаны да галавы карыстальніка. Пры тэлефоннай размове пад уздзеянне электрамагнітнага выпраменьвання падпадаюць перыферычныя рэцэптарныя зоны вестыбулярнага і слыхавога аналізатараў і сятчатка вока. Выкарыстанне мабільнага тэлефона дзіцём тоіць у сабе вялікую патэнцыйную небяспеку, паколькі дзіцячы арганізм найбольш адчувальны да электрамагнітнага поля і мае схільнасць да назапашвання шкодных рэакцый ва ўмовах паўторнага апраменьвання. Прасцей кажучы, галаўны мозг дзяцей больш актыўна паглынае электрамагнітную энергію. Вось чаму для дзяцей карыстанне мабільнай сувяззю трэба абмяжоўваць.

Падчас даследавання нас цікавіла, а якую ролю ў сваім жыцці адводзяць дзеці мабільнаму тэлефону, як яны яго выкарыстоўваюць, колькі часу выдаткоўваюць штодзень на тэлефонныя размовы. Высветлілася, што дзяўчаты размаўляюць па сотавым тэлефоне больш за юнакоў: гэта датычыцца і колькасці размоў, і часу, які яны выдаткоўваюць на тэлефонныя размовы. Прычым іх тэлефонныя размовы доўжацца намнога больш, чым размовы паміж юнакамі. Дзеці да 12 гадоў размаўляюць па мабільніку ў сярэднім ад 5 да 20 хвілін штодня, радзей па 30-50 хвілін, прычым працягласць іх размоваў часцей за ўсё не перавышае 3-х хвілін. Актыўна карыстацца паслугамі сотавай сувязі падлеткі пачынаюць з 14-15 гадоў. У групе старшакласнікаў працягласць адной размовы можа дасягаць ужо 40-60 хвілін, асабліва гэта датычыцца старшакласніц. За дзень агульная працягласць тэлефонных размоў можа складаць у суме 1,5-2 гадзіны. І гэта ў той час, як з пункту погляду фізіялогіі даказана, што сумарная электрамагнітная нагрузка на дарослага карыстальніка сотавага тэлефона не павінна перавышаць адной гадзіны ў дзень! А працягласць адной тэлефоннай размовы павінна быць у межах трох хвілін з інтэрваламі паміж размовамі не менш за 15 хвілін. Між іншым, апытанне паказала, што больш як 3 хвіліны доўжыцца большасць усіх тэлефонных размоваў.

Фота Марыны БЕГУНКОВАЙ.

Дзяўчаты часцей за юнакоў адзначаюць непрыемныя адчуванні пасля працяглай размовы па сотавым тэлефоне, аднак на павышаную стамляльнасць юнакі скардзяцца ўдвая часцей за дзяўчат.

— Няўжо такая балбатлівасць праходзіць для дзяцей бясследна?

— Зразумела, што нас гэта пытанне таксама цікавіла. Дзеці да 12 гадоў па прычыне рэдкага карыстання мабільнікам па яго прамым прызначэнні амаль не скардзяцца на самаадчуванне і настрой пасля размовы па сотавым тэлефоне. Тут трэба патлумачыць, што малодшыя школьнікі выкарыстоўваюць свой сотавы ў значна большай ступені для гульняў, а не для размоў. І толькі невялікая колькасць дзяцей скардзіліся на прыліў гарачыні, пацівасць і пачырваненне вуха.

Значна часцей на пагаршэнне самаадчування скардзіліся вучні 9-11 класаў. Пасля 10-30 хвілін размовы па сотавым тэлефоне пагаршэнне самаадчування адзначылі 21 працэнт апытаных і 16 працэнтаў спасаліся на незвычайныя адчуванні накшталт прыліву гарачыні да твару, узбуджэнне, патлівасць, частае сэрцабіццё, галаўны боль, галавакружэнне, боль у вуху. Дзяўчаты часцей за юнакоў адзначалі непрыемныя адчуванні пасля працяглай (ад 10 да 30 хвілін) размовы па сотавым тэлефоне, аднак на павышаную стамляльнасць юнакі скардзіліся ў два разы часцей за дзяўчат.

Апытанне таксама паказала, што «адчуванне цяпла» ў вобласці дакранання тэлефона да вушной ракавіны адчувалі 48,4 працэнта апытаных старшакласнікаў і 8,6 працэнта дзяцей сярэдняга школьнага ўзросту.

Нас цікавіў і такі момант: дзе нашы дзеці захоўваюць свае мабільныя тэлефоны. Апытанне паказала, што хлопчыкі носяць свой сотавы ў кішэні штаноў і радзей — у кішэні на грудзях або ў чахле на поясе ці ў сумцы. Дзяўчаты—старшакласніцы носяць мабільнік пераважна ў сумцы або ў кішэні штаноў і зрэдку — у кішэні курткі. Вучні ж малодшых класаў часта носяць тэлефон на шнурку на грудзях, у кішэнях адзення, а вось ў рукзаку — толькі нямногія. Напэўна, бацькам трэба патлумачыць сваім дзецям, што мабільныя тэлефоны трэба захоўваць як мага далей ад цела, не ў кішэнях, не на поясе і ўжо дакладна не насіць на грудзях у якасці ўпрыгажэння. Лепшае месца для мабільніка — сумка ці рукзак. Нават калі мы не карыстаемся сваім мабільным тэлефонам, ён пастаянна адпраўляе сігналы злучэння на бліжэйшую базавую станцыю (такіх спробаў робіцца па некалькі за хвіліну) і выпраменьвае электрамагнітнае поле. А ў моманты, калі базавая станцыя знаходзіцца на вялікай адлегласці, тэлефон адпраўляе сігналы максімальнай магутнасці.

Некаторыя спецыялісты раяць увогуле не карыстацца мабільнымі тэлефонамі да 16 гадоў, але наўрад ці сучасныя бацькі будуць прыслухоўвацца да такіх парадаў. Калі неабходнасць ведаць месцазнаходжанне дзіцяці прымушае бацькоў набываць яму мабільны тэлефон, то дзіця мусіць выконваць простыя патрабаванні — тэлефонная размова не павінна перавышаць адну хвіліну. Лепш увогуле выкарыстоўваць мабільны тэлефон толькі для неадкладнай сувязі з бацькамі. Нельга карыстацца мабільнай сувяззю ў кабіне ліфта, у падземным пераходзе або ў метро. Чым больш «напружваецца» тэлефон у пошуках сігналу ад базавай станцыі, тым больш ён выпраменьвае. На ноч трэба выключаць мабільны тэлефон або класці яго на адлегласць не меншую за метр ад галавы. Зразумела, што вызначаныя правілы бяспечнага карыстання мабільным тэлефонам павінны быць агульныя для ўсіх: і для дзяцей, і для дарослых. І бацькі павінны быць для сваіх дзяцей прыкладам...

Надзея НІКАЛАЕВА.

КАЛІ БЛІЗКІЯ БАЧАЦЬ ТОЛЬКІ ДНО БУТЭЛЬКІ...

Алкагалізм — праблема ўсёй сям'і. Жонкі, дзеці, бацькі кожны дзень знаходзяцца побач з п'яным чалавекам. У іх развіваюцца комплекс віны, раздражнёнасць, неўраўнаважанасць, неадэкватныя рэакцыі на паводзіны іншых людзей. Аднак блізкія доўга не ўсведамляюць гэтага, бо лічаць асноўнай прычынай сямейных праблемаў дзейнага алкаголіка.

Што толькі ні рабіла Алена, каб прымусіць свайго мужа кінуць піць. Пагражала, плакала, маліла. Вылівала гарэлку, прымушала пісаць распіскі, што ён больш і кроплі ў рот не возьме. Не пускала з дому ў кампанію, якая, на яе думку, спойвала мужа. Пасля купляла гарэлку сама і кантралявала норму. Аднак мужу ўсё роўна ўдавалася недзе напіцца. Адчай Алены павялічваўся. Яна марыла, што з нараджэннем дзіцяці ён кіне піць. Радасць была нядоўгай: пасля першага месяца цвярозасці муж зноў запіў. Хлусіла яго начальніку, не казала бацькам, хавала ад суседзяў. Было вельмі сорамна, хацелася б, каб усё было як у людзей, але не атрымоўвалася. Муж часта скандаліў, падымаў іх уначы. Не даваў спаць. Чамусьці менавіта тады яму станавілася цікава, як вучыцца яго сын, чаму Алена так позна вяртаецца з працы. Ён крычаў і яна крычала. Часам Алена з сынам і маленькай дачкой сярод ночы ішлі начаваць да суседзяў, бо знаходзіцца дома было немагчыма.

Ранкі пачыналіся з таго, што муж пагрозліва альбо ўмольна прасіў грошай на бутэльку. Яна, ці ў чарговы раз пашкадаваўшы, ці проста каб адчапіўся, давала. Сям'я жыла фактычна на зарплату жанчыны: муж падчас запояў не працаваў. Алена выглядала нервовай, стомленай і апатычнай да ўсяго. Часу ні на сябе, ні на дзяцей не хапала. Жыццё, здавалася, страціла ўсе свае фарбы, акрамя чорнай...

Таварыства сваякоў алкаголікаў

У тых, хто прыходзіць на сход Ал-Анона (ананімнае таварыства сваякоў і сяброў алкаголікаў) праблемы розныя. У некага хворы бацька, нехта мае дачку, што рэгулярна прыходзіць дамоў п'яная, хтосьці ў дадатак да свайго алкагалізму меў алкаголікаў сярод блізкіх. Сюды прыходзяць людзі рознага ўзросту, з рознай адукацыяй, сацыяльным становішчам. Адна з наведвальніц заўважыла: «Алкаголь косіць і прыбіральшчыкаў, і дэпутатаў. Для яго розніцы няма»...

— Мяне прывёў сюды мой унутраны стан. Усярэдзіне ў мяне быў хаос, які пагаршаўся тым, што паўтаралася гісторыя, якую я бачыла ў сваёй сям'і, — распавядае Наталля. — Спачатку я думала, што гэта проста трапляюцца такія хлопцы. Маўляў, гэта яны такія, а не я іх такіх выбіраю. У 26 год я зразумела, што час ідзе, а я хаджу па коле. А калі я зразумела, што больш не магу так працягваць, стала звяртацца па дапамогу, стала чытаць і ў адной з кніг даведалася пра садружнасці АА і Ал-Анон. Праз інтэрнэт знайшла Ал-Анон. Тут я атрымала інфармацыю, што калі дзіця вырасла ў сям'і, дзе адзін з бацькоў або абодва хварэюць на алкагольную залежнасць, то часцей за ўсё ён або знаходзіць сабе такога самага залежнага мужа, або ў яго самога выяўляецца залежнасць.

У Беларусі групы Ал-Анон з'явіліся ў 1991 годзе. Зараз па рэспубліцы налічваецца каля 20 груп. Зараз па праграме «12 крокаў» працуюць аб'яднанні ананімных наркаманаў, гульцоў і г.д.

Таццяна, калі першы раз прыйшла на сход і пачула слова «бог», падумала, што гэта нейкая секта, а пасля махнула рукой: «Няхай гэта і секта, абы толькі дапамагла...»

— Пасля я зразумела, што першае ўяўленне было падманным. У мяне некалькі сяброў былі ў розных сектах, таму я ведала ўсю гэтую сістэму: туды звычайна завабліваюць прыгожымі словамі. Мяне ж ніхто не агітаваў. У секце выманьваюць грошы, тут жа ўнёскі цалкам добраахвотныя. Пасля наведвання сектаў мае сябры сталі больш жорсткія. У голасе з'явіўся метал, а я, наадварот, паспакайнела...

Вось ужо на працягу 17 год Таццяна наведвае групу Ал-Анон.

Наведванне сходаў абсалютна бясплатнае. Ал-Анон не належыць да нейкай царквы, веры, палітычнай партыі. Таварыства не звязанае з іншымі грамадскімі арганізацыямі ці таварыствамі.

«Мы не ўдзельнічаем у палеміцы па пытаннях, якімі б яны ні былі. У Ал-Анона ёсць толькі адна мэта — дапамагчы сем'ям алкаголікаў. Мы дапамагаем, выконваючы самі 12 крокаў, даючы прытулак і суцяшэнне сем'ям алкаголікаў, разумеючы і падбадзёрваючы саміх алкаголікаў», — кажуць члены Ал-Анона.



На сходах Ал-Анона ў сваіх выказваннях нельга крытыкаваць, даваць парады прысутным. Важна разглядаць толькі самога сябе, свае дзеянні і свае памылкі. Падчас аповеду вас ніхто не перабівае, не каментуе, не дае парадаў, гэта можна зрабіць у прыватнай размове падчас перапынку. Члены Ал-Анона, як і таварыства Ананімных Алкаголікаў, называюць адно аднаго па імені. Тут не абавязваюць расказваць пра месца працы, адукацыю і г.д. Усё сказанае на сходзе ў яго межах і застаецца. Ананімнасць — асноўны прынцып Ал-Анона.

Таварыства існуе толькі на добраахвотныя ахвяраванні сваіх членаў. Грошы ідуць на набыццё літаратуры, арэнду памяшкання і г.д. Групы не маюць замацаванага кіраўніцтва, вертыкальнай улады. Вядучы сходу выбіраецца агульным галасаваннем на пэўны тэрмін. Ім можа стаць любы член Ал-Анона.

12 крокаў да папраўкі

Першапачаткова важна зразумець, што алкаголік — гэта хворы чалавек.

— Хвароба вельмі складаная: фізічная, псіхічная, разумовая, паражае ўсяго чалавека, цалкам. Адкуль яна ўзялася — не важна, — кажа Вольга. — Ва ўсіх па-рознаму. Хіба веданне аб прычынах захворвання нешта мяняе? Нас больш цікавіць, як яго лячыць. Я думаю, алкагалізм пасяляецца на зручнай для яго глебе. Гэта праява нейкіх больш глыбокіх асабістых праблемаў. У кожнага яны свае. Паступова алкагалізм захоплівае чалавека так шчыльна, што чалавек не можа з ім управіцца. Алкагалізм кіруе жыццём і тым, хто п'е. Чалавек п'е, таму што ён захварэў. Раней я меркавала па сабе: я выпю, а раніцой мне не было дрэнна, як бывае алкаголікам. Таму і лічыла, што гэтак жа адчуваюць сябе ўсе. А раз п'юць, значыць, гэта распушчанасць. Чалавек абяцае больш не піць, раскайваецца, а пасля гэтага зноўку запівае. Мне падавалася гэта верхам цынізму і абсалютнай непавагай у дачыненні да мяне, хлуснёй і здрадай. Гэта я зараз разумею, што не піць алкаголік ужо не можа.

Праграма ачуньвання ў Ал-Анане базуецца на 12 крокаў, першы з якіх: «Мы прызналі бяссілле перад алкаголем, прызналі, што згубілі кантроль над сабой». Насамрэч блізкія людзі алкаголікаў такія ж хворыя, як і самі алкаголікі. За час жыцця побач яны прызвычаіліся жыць у пастаянным страху і напружанні.

— Я зразумела, што стан алкаголіка і паводзіны яго сваякоў — гэта люстэрка. Алкаголік сабою не валодае, у яго цяга да спіртнога, і гэтак жа не валодае сабою блізкі чалавек, — расказвае Наталля. — У яго таксама цяга — даведацца, што

Калі ў вас ёсць праблемы, звяртайцеся:
Тэл. 8 (029) 550-54-24
e-mail: al_anon@open.by
адрас: 220050, Мінск а/я 458

адбываецца з алкаголікам, неяк паўплываць на яго, кантраляваць. Блізкія настолькі прызвычайваюцца жыць у гэтым алкагольным чадзе, што калі ён рассейваецца, напрыклад, алкаголік перастае піць на нейкі час, яны не ведаюць, як жыць у іншых умовах. Яны ў разгубленасці, бо не ўмеюць жыць і ладзіць з цвярозым чалавекам. Самі таго не ўсведамляючы (!), пачынаюць правакаваць алкаголіка на запой, ствараючы тыповыя для дзейнага алкаголіка сітуацыі. На што той з радасцю адгукаецца — запівае ў чарговы раз, і ўсё вяртаецца на кругі свае. Зразумець гэта сваякам вельмі цяжка! Вядома, яны аспрэчваюць гэтае сцвярджэнне.

Калі Вольга ўпершыню прыйшла на сход, то адчула вялізную палёгку, таму што тут былі людзі, якія яе разумелі.

— Гэтым людзям у Ал-Аноне не трэба было тлумачыць, чаму я крычала, напрыклад, біла посуд, абражала свайго мужа. Яны мяне разумелі і падтрымлівалі, не ў тым сэнсе, што, маўляў, малайчына, правільна рабіла, а ў тым, што ім было блізка тое, пра што я кажу, яны не асуджалі мяне. Яны мяне выслухоўвалі. А я ўсмоктвала інфармацыю, парады, досвед чалавечы — як жыць з дзейным алкаголікам, як выходзіць з крызісных станаў. Я ўжо не была адна, былі аднадумцы, завязаліся сяброўскія стасункі. Я пачала вучыцца будаваць адносіны з людзьмі, выбірацца з адзіноты і замкнёнасці. І, вядома, моцную падтрымку я знайшла ў тым вялізным досведзе дзясяткаў людзей, дзясяткаў жыццяў, якім я магу скарыстацца. Ал-Анон дапамагае навучыцца жыць з дзейным алкаголікам, з цвярозым алкаголікам (алкагалізм — хвароба пажыццёвая, алкаголік ніколі не навучыцца піць памяркоўна — гэта ўтопія). Бо часам жыць з цвярозым алкаголікам аказваецца куды цяжэй, чым з тым, які п'е. Нярэдка жонкі ў роспачы кажуць: «Лепш бы ты піў». Гэта значыць, проста не піць — мала, трэба мяняць усяго сябе, усё сваё жыццё — і алкаголіку, і яго блізкім. Бывае, што алкаголік становіцца цвярозым, а жонка працягвае ранейшае жыццё. Яна не перабудоўваецца на цвярозыя рэйкі, бо проста не ўмее паіншаму.

Ал-Анон, напрыклад, вучыць не пакрываць п'янства мужа, гэта значыць не гаварыць яго працадаўцу, што ён хворы, не браць яму бальнічны, не аддаваць замест яго даўгі, не пагражаць бясконца развадам, а сказаць толькі адзін раз — у тым выпадку, калі гэта не шантаж, а сапраўднае імкненне развесціся. Гэта называецца «жорсткая дапамога». У такім выпадку алкаголік хутчэй усвядоміць свае праблемы і пачне шукаць іх вырашэнне.

Ал-Анон — гэта адзін з варыянтаў вырашэння праблемы блізкіх людзей алкаголікаў. Самае галоўнае — жаданне бачыць гэтую праблему і імкненне адчуняць.

Настасся ЗАНЬКО.

«КРЫЗІС — ГЭТА НЕ ТОЛЬКІ ПРАБЛЕМЫ, ГЭТА — І ШАНЦЫ»...

Міхаіл КАВАЛЁЎ:

Як вядома, беларуская эканоміка ў вышэйшай ступені адкрытая: практычна амаль 2/3 валавога ўнутранага прадукту мы прадаём за мяжу, і яшчэ больш увозім у краіну. Таму, лічыць эксперт «Звязды», дэкан эканамічнага факультэта БДУ, прафесар Міхаіл Кавалёў, першая праблема, якая ў апошнія гады востра стаяла перад нашай эканомікай — незбалансаванасць таго, што мы купляем за мяжой, і таго, што прадаём.

— Па таварах гэтая незбалансаванасць у пэўныя перыяды ў гадавым вылічэнні перавышала 4 мільярды долараў ЗША, — кажа прафесар. — Для Беларусі гэта дастаткова вялікая сума.

— Міхаіл Міхайлавіч, калі заходзіць гаворка пра адмоўны баланс, многія схіляюцца да думкі, што на гэта істотна ўплываюць высокія цэны на нафту і газ?

— Гэта і так, і не так. Да цэнаў на нафту наша эканоміка практычна неадчувальная з пункту погляду гандлёвага балансу: колькі мы заплацілі за нафту, практычна столькі ж атрымліваем за прададзеныя на Захад нафтапрадукты, яшчэ і застаецца прыкладна 6 мільёнаў тон нафты для ўнутранага спажывання. Да цэнаў на газ, сапраўды, наша эканоміка адчувальная, і на гандлёвым балансе рост цэнаў на «блакітнае паліва» адбіваецца дрэнна. Аднак значны ўклад у адмоўны гандлёвы баланс гэтага года ўнёс занадта імклівы рост дабрабыту насельніцтва. З аднаго боку, грашовыя даходы насельніцтва самі па сабе раслі хутчэй за ВУП, з другога — у гэтых умовах норма збяражэнняў не павысілася і застаецца, як заўсёды, дзесьці на ўзроўні 3,5-4 працэнтаў ад грашовых даходаў: гэта значыць, з атрыманых 100 тысяч рублёў у банк мы нясём толькі прыкладна 4 тысячы. Гэта надзвычай мала. Менш — толькі ў ЗША, грамадзяне якіх прызвычаіліся жыць у доўг, і ў іх норма збяражэнняў у асобныя перыяды наогул адмоўная. Больш за тое, замест таго, каб разгарнуць кампанію і паспрабаваць павялічыць норму збяражэнняў, мы актыўна пачалі крэдытаваць тых, хто мала атрымлівае. Ёсць класічны лозунг: «Старыя зберагаюць, маладыя тратяць». Дык вось, старыя хоць нешта прыносілі ў банкі, а маладыя гэтыя грошы тут жа забіралі ў якасці крэдыту. Гэта было б добра, калі б грошы накіроўваліся на набыццё халадзільнікаў «Атлант», тэлевізараў «Гарызонт» і г. д., але, на жаль, яны ішлі на імпартныя аўтамабілі, тэлевізары, пральныя машыны, на паездкі ў Турцыю ці Егіпет. Фактычна банкі стымулявалі працэс спажывецкага крэдытавання насельніцтва імпартнымі таварамі. У выніку гэта прывяло да таго, што адмоўнае гандлёвае сальда давялося экстранна закрываць грашыма, якія пазычылі за мяжой. Прычым у апошнія гады напярэдадні крызісу надоўга крэдытаў не давалі. Атрымалася, што рэспубліка, якая мела малы знешні доўг, назбірала доўг большы за 15 мільярдаў долараў, з якіх каля 65 працэнтаў — кароткатэрміновыя даўгі, гэта значыць працягласцю да года. І іх мы павінны ў асноўным вярнуць да лета наступнага года. Таму канец гэтага, пачатак наступнага года будзе напружаным. У нармальнай сітуацыі было б лёгка перакрэдытаваць гэтыя даўгі, і Беларусі было б не так складана нарошчваць свой экспарт. Але ва ўмовах сусветнага фінансавага крызісу попыт на сусветных рынках на нашы тавары, нават такія неабходныя, як калійныя ўгнаенні, нафтапрадукты, на жаль, скарачаецца. Гэта прывядзе да таго, што ў канцы гэтага года і ў першым квартале наступнага валютная выручка будзе змяншацца, а даўгі ж трэба аддаваць.

— Вы заўважылі, што попыт на тавары на сусветных рынках падае, і гэта сур'ёзна зачапіла і нашых вытворцаў: запасы гатовай прадукцыі істотна павялічыліся. За 11 месяцаў нерэалізаваная прадукцыі пылілася на складах каля 63,5 працэнта ад сярэднямесячнага аб'ёму.

— Запасы запасам не роўныя. Ёсць запасы, якія пры больш энергічнай палітыцы за мяжой, больш эфектыўнай рабоце таваразрыхтоўчых сетак можна будзе рэалізаваць. Аднак ёсць запасы, напрыклад, гадзіннікі, якія наўрад ці ўжо будуць рэалізаваныя. У гэтай сітуацыі неабходна быць вельмі ўважлівымі да кан'юнктуры рынку і не ўкладаць рэсурсы ў прадукцыю, якая заведама можа быць прададзеная. Зразумела, што ў сітуацыі, калі падае попыт на знешніх рынках, трэба па прынцыпе таго ж Кітая стымуляваць попыт на ўнутраных рынках разумнай палітыкай імпартазамяшчэння. Яна павінна заключацца не ў тым, што мы як натуральная гаспадарка, будзем вырабляць літаральна ўсё, а ў тым, што ўсю крэдытную палітыку банкаўскай сістэмы накіруем на прывілеяванае крэдытаванне набыцця айчынных тавараў унутры краіны, пачынаючы ад МТЗ і заканчваючы халадзільнікамі, тэлевізарамі, мэбляй. Неабходна тую актыўнасць, якую банкі праявілі ў аўтакрэдытаванні, развярнуць зараз на крэдытаванне айчынных тавараў. На жаль, іншага выйсця зараз няма.

Па-другое, у падобнай сітуацыі, як рэкамендуе эканамічная тэорыя, трэба павялічыць інвестыцыйныя выдаткі дзяржавы, неабходна больш будаваць, у тым ліку жыллё. Ні ў якім разе нельга скарачаць крэдытаванне будаўніцтва жылля, гэта менавіта той лакаматыў, які выцягвае эканоміку з крызісу і шматразова апрабаваны іншымі. У сённяшніх умовах важна будаваць тое, ад чаго ў наступным будзе аддача — гэта дарогі, жыллё.

— Міхаіл Міхайлавіч, як выратаваць эканоміку, — планаў такіх прапануецца шмат. Расійскае кіраўніцтва, да прыкладу, заявіла пра тое, што дапамога дзяржавы айчынным прадпрыемствам павінна стаць прыярытэтнай.

— Я лічу, што лепш падтрымліваць не прадпрыемствы, а тых, хто купляе айчынныя тавары. Тады большую дапамогу атрымае той, хто вырабляе тавары, што карыстаюцца попытам у беларускага насельніцтва. Ва ўмовах росту стаўкі рэфінансавання і росту кошту крэдытаў крэдыты на жыллё, на набыццё айчынных спажывецкіх тавараў, трактароў фермерамі павінны выдавацца з вялікімі льготамі. І ва ўмовах крызісу частку працэнтнай стаўкі можа прафінансаваць Нацбанк.

— Шматлікія эксперты парознаму ацэньваюць час, які спатрэбіцца для выхаду з цяперашняга крызісу. На гэты конт у вас ёсць нейкае меркаванне?

— Я думаю, што крызіс будзе не такім кароткім. Ёсць прагнозы, што да канца наступнага года — у першай палове 2010 свет паціху пачне выходзіць з крызісу. Мяркую, ніяк не раней. У значнай ступені гэта будзе залежаць ад таго, наколькі скардыянавана краіны свету будуць змагацца з крызісам. На жаль, нарада дваццаткі расчаравала ўвесь свет: акрамя агульных слоў — нічога канкрэтнага, і, па сутнасці, кожная краіна змагаецца з крызісам па-свойму, абараняючы свае нацыянальныя рынкі. Баюся, што адзіная сусветная валюта можа быць заменена серыяй рэгіянальных валют.

— Долар сыходзіць?

— Так, з доларам ёсць сур'ёзныя праблемы. Але адна сусветная валюта лепш, чым пяць з пункту гледжання пераадолення сусветнага глабальнага крызісу. Аднак, на жаль, краіны гэта павінны рабіць, таму што дамовіцца ў маштабах усяго свету не атрымліваецца.

— У такім разе, што чакае нас?

— Я упэўнены, што крызіс — гэта не толькі праблемы, гэта — і шанцы. Апошнія дзесяцігоддзі дзяржавы паказалі, што мы можам выкарыстаць гэты шанц. Доля Беларусі на сусветных рынках вельмі малая, і ў гэтай блытаніне ёсць магчымасць не толькі ўтрымацца, але і пашырыць свае пазіцыі на сусветных рынках. Трэба толькі дзейнічаць дакладна, прадумана і, галоўнае, хутка. Многія нашы дзеянні спазняюцца.

— Аднак Урад ужо да канца года плануе прыняць новыя нарматыўныя акты па спрашчэнні адміністратыўных працэдур і лібералізацыі эканомікі.

— На мой погляд, нашай эканоміцы патрэбная не столькі лібералізацыя, колькі дэбюракратызацыя. Многія праблемы ўзнікаюць з-за таго, што апарат чыноўнікаў працуе неэфектыўна і стварае праблемы. Мы толькі што мелі праблему з прадпрымальнікамі, якія завозяць тавары з Расіі. Гуткі з імі паказваюць, што прадпрымальнікаў палохаюць не столькі пытанні размытнёўкі, колькі наступнае: у нас усё можа быць арганізавана так, што прывядзе да значных стратаў часу і фінансавых рэсурсаў. Я думаю, што ва ўмовах крызісу і неабходнасці канцэнтрацыі дзяржаўных рэсурсаў на інвестыцыях, неабходна істотна знізіць выдаткі на ўтрыманне бюракратычнага апарату. Адзіны спосаб эфектыўнай дэбюракратызацыі — гэта істотнае скарачэнне бюракратыі.

Ігар ШЧУЧЭНКА.

Леанід ЗАІКА: «ЭНЕРГЕТЫЧНАГА ШОКУ НЕ БУДЗЕ»

Аб стане і перспектывах рэальнага сектара эканомікі нашай краіны ва ўмовах сусветнага фінансавага крызісу і павышэння цэнаў на расійскі газ карэспандэнт «Звязды» гутарыць з незалежным беларускім эканамістам, кіраўніком аналітычнага цэнтра «Стратэгія» Л.Ф. Заікам.

— Леанід Фёдаравіч, памятаеце, колькі было напрыканцы 2006 і 2007 гадоў змрочных прагнозаў з боку асобных вашых калег-эканамістаў аб непазбежным калапсе беларускай эканомікі з-за павышэння Расіяй цэнаў на прыродны газ? І што? Вытрымалі і нават не слаба нарасцілі аб'ёмы вытворчасці і экспарту. Не буду называць вядомыя лічбы.

— Так, энергетычнага шоку не здарылася, не адбылося і абвалу эканомікі, якія прадказвалі некаторыя «эканамісты-аптымісты». Летась выдаткі нацыянальнай вытворчасці выраслі ўсяго на 1,8 працэнта, што сведчыць аб паспяховай тады рэакцыі эканомікі на высокія цэны на энерганосьбіты.

Тым не менш, хачу сказаць, што тады спецыялісты небеспадстаўна апасаліся ды і зараз апасаюцца рэакцыі эканомікі на высокія энергетычныя цэны. Дакладна прадказаць гэтыя рэакцыі — даволі складаная справа. Але ў выпадку павышэння ў 2009 годзе нават удвая цэнаў на газ (калі ўзяць пад увагу ўцечку інфармацыі з нетраў Газпрама) то, натуральна, істотна ўзрастуць і выдаткі нашай прамысловасці. Іншае пытанне — наколькі?

— Відаць, гэта будзе залежаць ад канчатковай цаны за тысячу кубаметраў газу. Як вам здаецца, ці змогуць нашы перамоўшчыкі пераканаць кіраўніцтва Расіі і Газпрама паступіць у цане? Бо цэны ў свеце на энерганосьбіты, тую ж нафту, знізіліся ў тры разы.

— Хацелася б, але я не ўпэўнены ў поспеху нашых перамоўшчыкаў. І не таму, што яны не маюць важкіх аргументаў. У газавых перамовах шмат нябачных падводных плыняў і рыфаў. Апошнім часам значна ўзрос эканамічны эгаізм Крамля. Ён — галоўны гандляр газам, і ў гэтых умовах застаецца толькі прапаноўваць і адстойваць нашы варыянты рашэнняў энергетычных і іншых здзелак і разлічваць на сваё ўменне лавіраваць. Але не будзем спяшацца з канчатковымі вывадамі, давайце паглядзім, чым скончацца запланаваныя на панядзелак перамовы Аляксандра Лукашэнкі і Дзмітрыя Мядзведзева ў Маскве.

Як вынікае з папярэдніх заяў даведчаных прадстаўнікоў расійскай палітычнай і эканамічнай эліты, цэны на газ для нашай краіны ў 2011

Фота Пятра ФАМІНА.

годзе будуць амаль такія, як і для Польшчы. Гэта значыць — еўрапейскія. Карацей, цэны будуць няўхільна расці. У 2009 годзе яны, не выключаю, могуць дасягнуць і нават перасягнуць 200-доларавы рубеж за тысячу кубаметраў. Бо цяперашняя эканамічная і фінансавая сітуацыя ў свеце пазбавіла Расію значнай долі золата-валютных рэзерваў, яе эканоміка закульгала, абвастрыліся многія гаспадарчыя праблемы.

Ёсць і палітычная матывацыя імкнення Крамля сарваць больш грошай за газ. Нядаўна, нагадаю, кіраўнік расійскага ўрада Уладзімір Пуцін у адказах на пытанні ў прамым тэлеэфіры паабяцаў, што нягледзячы на глабальны фінансавы і эканамічны крызіс, расійская дзяржава не адмаўляецца ад узятых раней сваіх абавязацельстваў па развіцці медыцыны, адукацыі, пенсійнага абслугоўвання і г. д. Урад выканае ўсе планы па выплатах сацыяльных дапамог, рэфармаванні жыллёва-камунальнай гаспадаркі. Таксама У. Пуцін паабяцаў не дапусціць зніжэння ўзроўню заработнай платы. На ўсё гэта патрэбны велізарныя грошы — многія мільярды долараў.

— Шкада, калі саюзнікі не пойдуць на кампраміс. Што нас чакае ў выпадку замацавання ў дагаворы аб пастаўках газу крамлёўскай цэны?

— Не драматызуйце сітуацыю. Ведаеце, усё ж і 200 долараў за тысячу кубаметраў — гэта не 400 долараў, як для многіх краін Еўропы. Энергетычнага шоку ў наступным годзе ў Беларусі ў любым выпадку не прадбачыцца. У нашых сілах змякчыць наступствы павышэння цэнаў на газ нават больш чым удвая, калі пастарацца, вядома. Магчымасці нацыянальнай эканомікі дазваляюць зрабіць гэта. Хаця, на мой погляд, прымальная цана не больш за 140 долараў.

— Многім прадпрыемствам краіны хацяў б выжыць, не дапусціць вялікага падзення вытворчасці. Якія тут могуць быць варыянты?

— Сапраўды, часу для адаптацыі беларускай эканомікі ў вельмі няпростай цяперашняй сітуацыі застаецца ўсё менш, а таму трэба думаць і думаць над тым, як далей працаваць у агрэсіўных умовах. Я заўсёды быў праціўнікам узнікнення новых бюракратычных структур, але сёння лічу мэтазгодным стварэнне Антыкрызіснага савета з удзелам міністраў эканамічнага блоку, капітанаў індустрыі, банкіраў, прадстаўнікоў улады, бізнэсу, навукоўцаў. Я б нават запрасіў на працу і замежных спецыялістаў.

— І якія б вы паставілі мэты перад гэтым саветам, была б ваша воля?

— Пачаць з распрацоўкі дакладнага плана мерапрыемстваў па супрацьдзеянні і зніжэнні наступстваў знешніх удараў. Так, у міністэрстве эканомікі зрабілі свой антыкрызісны план, я прааналізаваў яго. План мне здаўся, хай прабачаць супрацоўнікі Мінэканомікі, даволі ўмоўным і не зусім канкрэтным.

Павышэнне канкурэнтаздольнасці таксама аб'ектыўна вылучаецца ў разрад першачарговых мэтаў. Яе не дасягнуць без рэзкага і разумнага зніжэння выдаткаў у вытворчасці, якія ў нас значна вышэйшыя, чым у заходніх краінах. Невялікі экскурс у нядаўняе мінулае. У 1990 годзе матэрыяльныя выдаткі ў айчыннай прамысловасці склалі па цяперашнім часе «непрыгожую» лічбу — 75 працэнтаў! Яна істотна не мянялася да мінулага года. Потым, як кажуць, працэс пайшоў. Але зніжэнне выдаткаў на адзінку прадукцыі ўсё адно

«Калі моцна захапіцца зніжэннем выдаткаў, то па нашай славянскай звычцы прыгожа адрапартаваць «на гару» можна пагоршыць якасць прадукцыі.

ідзе марудна, неадэкватна выклікам часу. А час не чакае, як вядома. Бо ад балансу выдаткаў у многім залежыць канчатковая цана прадукту.

Праблема цэнаўтварэння сёння як ніколі патрабуе асаблівай ўвагі, бо тут можна і перагнуць палку. Калі моцна захапіцца зніжэннем выдаткаў, то па нашай славянскай звычцы прыгожа адрапартаваць «на гару» можна пагоршыць якасць выпускаемай прадукцыі, што вельмі непажадана і можа адгукнуцца потым стратай традыцыйнага рынку яе збыту. Увогуле сёння неабходны пастаянны манітарынг унутраных і знешніх цэнаў. Бо паўсюдна ідзе жорсткая канкурэнцыя гандлёвых марак, прамысловых брэндаў, мяняецца механізм стварэння новых тавараў і цаны на іх. Працэс становіцца больш хуткім і творчым. Гэта раней рынак фарміраваў цэны, а цэны — рынак. Цяпер самому вытворцу вельмі важна правільна разлічыць ці, калі хочаце, угадаць прымальную цану на свой тавар.

Наспела падрыхтоўка і рэалізацыя рэспубліканскай праграмы па стварэнні новых працоўных месцаў. Тут трэба задзейнічаць усе рэзервы, асабліва ў рэгіёнах, дзе выбар працы, мякка кажучы, невялікі. Чым не справа для Антыкрызіснага савета?

— Нармальная логіка падказвае, што ва ўмовах глабальнага фінансавага крызісу і дадатку да яго ў выглядзе верагоднага павышэння ў два разы цэнаў на газ перш за ўсё трэба засяродзіцца на людзях, прадпрыемствах ці, інакш кажучы, на рэальным сектары эканомікі, які нас усіх корміць. Тая ж логіка паадказвае, што і без перамен не абысціся. Як вы лічыце?

— Я параіў бы на ўсіх узроўнях уважліва паглядзець на тое, як умела прадпрыемствы выкарыстоўваюць сродкі, узятыя ў банках. Скажу шчыра, што лічбы росту крэдытных плыняў мяне насцярожваюць. Летась прадпрыемствы атрымалі крэдытаў на 41 працэнт больш, чым у папярэднім годзе. Гэта прыкладна 4,18 млрд дол ЗША. Грошы, па меркаваннях Беларусі, немалыя. Але ўзнікае пытанне: чаму, каб павялічыць у мінулым годзе валавы ўнутраны прадукт на 8,1 працэнта, спатрэбілася дадатковае крэдытаванне аж на 41 працэнт? Ведаеце, так эфектыўная эканоміка не працуе. Гэта сведчыць аб наяўных дыспрапорцыях эканамічных параметраў, якія трэба хутчэй ліквідаваць.

Увогуле ўладзе, у тым ліку і мясцовай, варта было б узяць за правіла ўсяляк садзейнічаць любой законнай эканамічнай дзейнасці насельніцтва, якая давала б магчымасць зарабляць на хлеб. З гэтай нагоды трэба аператыўна выдзяляць зямельныя ўчасткі і памяшканні пад вытворчасць, да мінімуму звесці фармальнасці і бюракратычныя працэдуры пры адкрыцці ўласнай справы. Хоча чалавек працаваць сам на сабе — няхай працуе. Дапамагайце і ні ў якім разе не стрымлівайце яго. Гэта лепш, чым потым плаціць дапамогу па беспрацоўі.

Зніжэнне падаткаў можа стаць істотнай падтрымкай рэальнага сектару эканомікі. Яму сёння нялёгка ды і заўтра прасцей не будзе. Хаця ўвогуле дырэктарскія клопаты застануцца ранейшымі: рэнтабельная вытворчасць, новыя рабочыя месцы, зарплата персаналу, падаткі дзяржаве.

— Зарплаты і падаткі будуць у многім залежаць ад поспехаў гандлю з Расіяй. Што можа паўплываць на эканамічнае супрацоўніцтва з ёй у наступным годзе?

— Я не думаю, што яно моцна палепшыцца ці істотна пагоршыцца. Мы вельмі завязаныя на Расію, ды і яна мае свае стратэгічныя інтарэсы ў Беларусі. Хоць гандляваць з Расіяй будзе больш складана. Яна ўжо сёлета, так бы мовіць, перагандлявала нас на 10 млрд дол ЗША.

Нам трэба мець на ўвазе, што цяпер Расія ўваходзіць у вельмі складаны этап развіцця. Сёлета заканчваецца лепшы перыяд яе найноўшай гісторыі — калі цаны долары і мільярды долараў ад продажу газу дазвалялі ўраду моцна не напружвацца. А калі шмат шалёных грошай, то і шмат карупцыі і крадзяжу. Спецыфіка сённяшняй Расіі і ў тым, што там уласнасць падзелена паміж кланамі чыноўнікаў і алігархаў. Яны навучыліся прапускаць атрыманыя за энерганосьбіты мільярды долараў праз бюджэт і дзяржаўныя закупкі, якія прыносяць фантастычныя прыбыткі тым, хто мае дачыненне да заключэння кантрактаў, правядзення тэндараў, аўкцыёнаў, карацей, стаіць каля кармушак, у тым ліку і нафтагазавай. Гэты добра адладжаны механізм па ўзбагачэнні чыноўніцтва і вялікага бізнэсу «дахуюць» асобныя палітыкі. Замкнёнае кола. Невыпадкова Д. Мядзведзеў абвясціў рашучы бой карупцыі. Цікава, што з гэтага атрымаецца.

Увогуле ў Расіі расце канцэнтрацыя ўлады Крамля, які ўсё актыўней вядзе прасоўванне нацыянальных інтарэсаў за мяжой. Краіна выходзіць на новую траекторыю руху. Такое ўражанне, што надыходзіць час прыняцця неардынарных рашэнняў у адносінах Мінска з Масквой.

Гутарыў
Леанід ЛАХМАНЕНКА.

ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ АУКЦИОНА

по продаже объектов, находящихся в республиканской собственности, и на право заключения договора аренды земельного участка для обслуживания недвижимого имущества

Аукцион состоится **29 декабря 2008 г.** в 16.25 по адресу: г. Могилев, ул. Первомайская, 62, к. 106.

Организатор аукциона: фонд «Могилевоблимущество», 212030, г. Могилев, ул. Первомайская, 62.

Продавцы недвижимого имущества: по лоту № 1 – государственное опытное лесохозяйственное учреждение «Костюковичский опытный лесхоз», 213640, Могилевская область, г. Костюковичи, ул. Кулешова, 101, тел. 8(02245)55453; по лотам №№ 2, 3 – Белорусский государственный концерн по нефти и химии, 220116, г. Минск, ул. Дзержинского, 73, тел. 8(0225)433012 (по лоту № 2) и тел. 8(0222)222198, 391826 (по лоту № 3).

Заявления на участие в аукционе принимаются ежедневно в рабочие дни с 8.00 до 13.00 и с 14.00 до 17.00 по адресу: г. Могилев, ул. Первомайская, 62, к. 104. Последний день подачи заявлений на участие в аукционе с прилагаемыми к ним документами **24 декабря 2008 г.** до 16.00. Заключительная регистрация участников аукциона **29 декабря 2008 г.** с 14.00 до 14.50.

Контактные телефоны организатора аукциона: 223375, 311185, 229022.

№ лота	Сведения о предметах аукциона							
	Информация о недвижимом имуществе			Информация о земельных участках			Начальная цена продажи предмета аукциона, тыс. руб.	Сумма задатка, тыс. руб.
	Наименование и краткая характеристика	Место нахождения	Начальная цена продажи недвижимого имущества, тыс. руб.	Площадь, га	Срок аренды, лет	Начальная цена продажи права заключения договора аренды земельных участков, тыс. руб.		
1	**Лесопильный цех** площадью 1851,05 кв.м, **навес–склад** площадью 580,0 кв.м, **оборудование: электротельфер** грузоподъемностью 2,5 т, **две кранбалки** грузоподъемностью 2,5 т, и 3,2 т, **вентилятор ВЦП 8** мощностью двигателя 7,5 кВт, **три бревнотаски** мощностью двигателя по 11 кВт каждый, **циклон** диаметром 2 м	Могилевская область, Костюковичский район, г. Костюковичи, пер. Юбилейный, д. 16	122 198,865	0,9785	50	32 981,820	155 180,685	15 500,0
2	**Здание административно-бытового корпуса** местного предприятия промышленного железнодорожного транспорта двухэтажное кирпичное общей площадью 540 кв.м	г. Бобруйск, ул. Шинная, 4-б	41 918,862	0,0432	99	6 658,070	48 576,932	4 800,0
3	**Капитальные строения** (здания, сооружения, передаточные устройства), **машины, оборудование, транспортные средства, инвентарь и деревья плодовые** базы отдыха «Надежда», находящиеся в безвозмездном пользовании по договору у открытого акционерного общества «Могилевский завод искусственного волокна»	Могилевская область, Могилевский район, район д. Межисетки	1 540 229,443	5,2617 и 0,3600	50	11 785,45	1 552 014,893	150 000,0

Краткая характеристика имущества, входящего в состав лота № 8:

Капитальные строения (здания, сооружения, передаточные устройства): склад инвентаря № 3 площадью 338,2 кв.м; здание насосной станции над артезианской скважиной № 1 площадью 8,2 кв.м; здание для игр площадью 219,6 кв.м, здание спального корпуса площадью 142,6 кв.м; здание водолечебницы площадью 650,1 кв.м; здание столовой площадью 456,1 кв.м с дорогой с асфальтобетонным покрытием с площадкой от въездных ворот до столовой площадью 1392,7 кв.м и цветочницей бетонной перед зданием столовой; здание клуба площадью 198,9 кв.м с покрытием спортивных площадок из плит рездора площадью 422 кв.м; здание трансформаторной подстанции № 1 площадью 14,4 кв.м; здание хлораторной площадью 14,6 кв.м; здание насосной станции № 2 площадью 11,1 кв.м; склад инвентаря № 2 площадью 113 кв.м; здание овощехранилища площадью 78,9 кв.м; здание склада № 1 площадью 100,2 кв.м с дорогой с асфальтобетонным покрытием к складу инвентаря № 1 площадью 200 кв.м; здание котельной площадью 214,8 кв.м с площадкой с асфальтобетонным покрытием перед котельной площадью 427 кв.м; здание спального корпуса № 2 площадью 796,9 кв.м; здание спального корпуса № 1 площадью 794,3 кв.м с дорожкой от столовой до спортплощадки асфальтовой площадью 566 кв.м, дорожкой с асфальтированным покрытием вдоль корпусов площадью 438 кв.м и бетонным сооружением на месте построения; здание административно-лечебного корпуса одноэтажное площадью 423,2 кв.м с дорожкой асфальтовой площадью 160,4 кв.м от спальных корпусов к основному и дорожками, площадками из железобетонных плит по территории базы площадью 40 кв.м, 98,8 кв.м, 76 кв.м, 35 кв.м, 31,5 кв.м, 54 кв.м и 40,5 кв.м; дом № 2 финского типа площадью 60,9 кв.м; дом № 1 финского типа площадью 61,2 кв.м; здание трансформаторной подстанции № 2 площадью 24,7 кв.м; мост пешеходный через р. Лахва; артезианская скважина № 1 глубиной 50 м; башня водонапорная металлическая емкостью 21 куб.м; септик 3-секционный; забор деревянный решетчатый протяженностью 253 п.м; ограждение артезианских скважин – металлическая сетка протяженностью 152,5 п.м; артезианская скважина № 2 глубиной 77 м; электрическая сеть протяженностью 2403,8 м (в том числе кабельная линия электропередачи от опоры ВЛ-10 до ТП-1, кабельная линия электропередачи от опоры ВЛ-10 до КТП, воздушная линия электропередачи, электроосвещение по территории базы отдыха); водопроводная сеть протяженностью 753,6 м (в том числе сеть водопроводная от колодца ВК 5 к водонапорной башне и к домикам); канализационная сеть протяженностью 734,8 м (в том числе канализационная сеть от водонапорной башни до КК27, канализационная сеть от КК37 до КК39); тепловая сеть протяженностью 665,8 м (в том числе тепловая сеть к домикам); две емкости для жидкого топлива площадью 4,3 и 23 кв.м. Машины, оборудование, транспортные средства, инвентарь: котел факел-08лж, стерилизатор ГП-40-03, комплексная подстанция, котел отопительный чугунный – 3 шт., горелка ТР-1М, электрообогревательное устройство, ковер 2х4 м, ковер 3х4 м, электросамовар, микшерный пульт, усилитель PS-600, сверлильный станок 2М112, дымосос Д3.5, персональный компьютер МПІ430VX/16/НМД1-1.2G/3.5 Р-133, принтер EPSON LX-1050, снегоход «БУРАН», насос для воды центробежный АИРВОА2 КМ 8/18 – 4 шт., стиральная машина КП-125-01 УХЛУ, видеокассетный проигрыватель, холодильник «Минск-215», электронасосный агрегат с электродвигателем 2ЭЦВ6-16-70, два трансформатора ТМ 25/10-65, дизель-генератор ДЭС-60р, трансформатор ТСМ-100, киноаппаратура КМ-17, шкаф холодильный ША-1,12, холодильная установка, электрокотел варочный секционный, электроплита 4-камфорная ЭП-2М, горелка с электрощитом – 2 шт., многоярусная печь хлебная, привод ПУ-0,6, универсальный привод ПУ-06, моечная машина ММУ-500, тренажер-стимулятор, биомеханический стимулятор, ингалятор «ТНОМЕХС-2» (Республика Польша) – 4 шт., аппарат для магнитотерапии АВИМП, аппарат УВЧ-50-01, электростимулятор «Стимул», аппарат УЗТ-303Л, электрокардиограф ЭК1К-01, аппарат АМПЛИ-ПУЛЬС-5, аппарат электротепловибропункТуры РЭФИ, аппарат для диагностики УЗТ-101, аппарат для диагностики «Тонус», аппарат для диагностики «Электросон» ЭС-10-5, комплект массажный, устройство для разогрева парафина «Азопир» – 2 шт., ванна ВОД-56, спортивные городки, карусели детские – 6 шт., качели спортивные, кафедра водолечебная, стол однотумбовый – 5 шт., мягкий уголок «Ульянка» – 4 шт., сетка футбольная (комплект из двух единиц), электронасос для перекачки агрессивной жидкости АЭКО 272356, установка компрессорная УК-40-2м, пианино, холодильная установка, стоматологическая установка ПМ2000С, водоподогреватель ПВВ-12. Деревья плодовые: яблони – 40 шт., груши – 16 шт., сливы – 5 шт.

Земельный участок, входящий в состав лота № 3, расположен в водоохранной зоне реки Лахва, и имеет ограничения в использовании, с перечнем которых можно ознакомиться у организатора аукциона.

Условия для победителя аукциона по лоту № 2:

получение в установленном порядке разрешения райисполкома на проведение проектно-изыскательских работ и разработки строительного проекта на строительство объекта в срок, не превышающий двух лет;

получение заключения по вводу объекта в эксплуатацию в Бобруйской горрайинспекции природных ресурсов и охраны окружающей среды.

Полная информация о недвижимом имуществе, условиях участия в аукционе и порядке его проведения ранее была опубликована:

по лоту № 1 – в газете «Звязда» 30 октября 2008 г.;

по лотам №№ 2 и 3 – в газете «Звязда» 18 ноября 2008 г.

Задатки перечисляются на расчетный счет фонда «Могилевоблимущество» № 3642900001315 в филиале № 700 – Могилевское областное управление ОАО «СБ «Беларусбанк», код 536, УНП 700052050.

Срок заключения (государственной регистрации) договора купли-продажи и договора аренды земельного участка не позднее 31 декабря 2008 г.

Оплата за предмет аукциона осуществляется денежными средствами по безналичному расчету.

Победитель аукциона возмещает фактические затраты на подготовку и проведение аукциона, а также средства, затраченные организацией по землеустройству на осуществление государственной регистрации изменения земельного участка, из которого изымается часть, или прекращения существования изъятого земельного участка.

Усходні гараскоп на наступны тыдзень

Рыбаў наведаюць творчыя ідэі, а Блізнятам час змяняцца

ВАЕН. Любімая работа можа стаць крыніцай жыццёвых сілаў, тым больш што адносіны з калегамі па працы і начальствам будуць добразычлівымі і гарманічнымі. Калі ў сераду вам будуць дакучаць дробныя няўдачы — не адчайвайцеся і старайцеся дасягнуць пастаўленай мэты. У пятніцу з-за самаадзейнасці рызыкуеце загнаць сябе ў кут.

ЦЯЛЕЦ. Падчас зносінаў будзе важна не толькі выказацца, але і прыслухацца да важкіх аргументаў суразмоўцы. Настройцеся на супрацоўніцтва з калегамі, а не на супрацьстаянне. Не зацыклівайцеся на стэрэатыпах, якія могуць перашкодзіць планам на будучыню. Пастарайцеся не назапашваць надзённыя справы, інакш у пятніцу яны могуць ператварыцца ў адну вялікую праблему, вырашыць якую ўжо будзе не пад сілу.

БЛІЗНЯТЫ. Некаторыя погляды на жыццё з цягам часу і вашым духоўным развіццём старэюць, таму збярыце сілы і — змяніцеся. Так, трансфармацыя можа быць не вельмі прыемнай, але затое вы навучыцеся панаваць над сітуацыяй. Верагодны некаторыя перамены ва ўласным доме. Нарэшце вы дасягнеце ўзаемаразумення з роднымі.

РАК. Асцярожнасць — вось дэвіз тыдня. З-за пераацэнкі ўласных магчымасцяў рызыкуеце нашкодзіць сваёй дзелавой і прафесійнай рэпутацыі. У другой палове тыдня можаце адкрыць штосьці новае ў дзелавым партнёрстве, атрымаўшы дапамогу і вызваленне ад мінулых даўгоў — перш за ўсё, вядома ж, эзатэрычных.

ЛЕЎ. Можаце паглыбіцца ў мары. Усё б нічога, але яны будуць не самай практычнай накіраванасці, некаторыя наогул могуць быць вельмі дзіўнымі — а на гэтым тыдні тое, аб чым будзеце доўга думаць, можа і не спраўдзіцца. Так што не зашкодзіць некаторая асцярожнасць, бо не факт, што вынік вам спадабаецца. Падзеі, якія адбудуцца ў сярэдзіне тыдня, могуць пазбавіць ад аднаго-двух застарэлых комплексаў.

ДЗЕВА. З'явіцца магчымасць для максімальна паспяховай рэалізацыі задумаў. Верагодна неадназначная сітуацыя на рабоце і ва ўзаемаадносінах з дзелавымі і фінансавымі партнёрамі. Давяздецца прымаць адказныя рашэнні — спачатку падумайце, а толькі потым рашуча дзейнічайце, каб не дапусціць памылак. Сітуацыі будуць складвацца непаўторныя, а часам нават дзіўныя.

ШАЛІ. Пастарайцеся зменшыць свае амбіцыі. Будзеце вельмі нястрыманымі ў эмоцыях, каб хтосьці ўспрыняў іх усур'ёз. У той жа час з'явіцца шанц аб'яднаць вакол сябе сяброў і аднадумцаў. Неабходна адэкватна ацаніць рэальнае становішча і знайсці канструктыўныя метады для яго паляпшэння.

СКАРПІЁН. Пажадана спакойна і без мітусні займацца службовымі і хатнімі справамі. Ваша праца будзе заўважана і ацэнена па справядлівасці. Магчыма, атрымаеце прапанову аб службовым павышэнні ці нават прапанову заняць пасаду кіраўніка. Пажадана трымацца як мага далей ад авантур: яны не прынясуць жаданага поспеху. Асабліва асцярожна абыходзьцеся з чужымі грашыма.

СТРАЛЕЦ. Давядзецца прыкласці нямала намаганняў, каб утрымаць сітуацыю пад кантролем. Прычына — залішняя эмацыянальнасць. Спакойней рэагуйце на сюрпрызы. Серада абяцае падняць настрой настолькі, што станоўчых эмоцый хопіць да канца тыдня.

КАЗЯРОГ. Намячаюцца нядрэнныя перспектывы, але неабходна будзе прайсці нейкае выпрабаванне. Вакол вас будзе складвацца творчая і радасная атмасфера. Аднак дасягненне пастаўленых мэтаў запатрабуе рэальных, хоць і цалкам пасільных намаганняў. Ваш добры настрой дапаможа ў цяжкую хвіліну і іншым людзям.

ВАДАЛЕЙ. Будзе проста неабходна ўраўнаважыць свае і грамадскія інтарэсы. Пашырце кола зносінаў — тады дзелавыя сустрэчы дазволяць павялічыць сферу ўплыву, ад

СКАНВОРД

Склаў Андрэй МІХАЙЛАЎ.



ПРАВЕРЦЕ, КАЛІ ЛАСКА, АДКАЗЫ

Сканворд (18 снежня) Па гарызанталі: Строп. Каралева. Хам. Стол. Боб. Фара. Кіт. Крок. Маяк. Лір. Рубка. Апалін. Хам. Гара. Ірыс. Карадаг. Абора. Карабін. Грот. Манарх. Руно. Зала. Ракаў. Храм. Баабаб. Рэха. Лаз. Ламбард. **Па вертыкалі:** Пражэктар. Якар. Бохан. Абоз. Рота. Ліхтар. Лайба. Асіна. Дама. Пакт. Рамка. Хмара. Роба. Гонар. Бэз. Крыло. Алах. Бра. Крым. Бал. Шах. Ікра. Гітара. Кабзар. Бук. Рызіна. Кантрабас. Ноўгарад.

20 снежня

Дзве даты

1932 год — прынятая пастанова ЦВК і СНК БССР «Аб абвяшчэнні Беларускай ССР краінай суцэльнай пісьменнасці».

1917 год — была створана Усерасійская надзвычайная камісія (ВЧК) па барацьбе з контррэвалюцыяй і сабатажам на чале з Ф. Дзяржынскім. У гэты ж дзень у 1920 годзе створаны Замежны аддзел ВЧК — ведамства знешняй разведкі Савецкай Расіі.

Цытата дня:

«Дурань часта церпіць няўдачу таму, што складанае лічыць простым; а разумны чалавек — таму што простае лічыць складаным».
Джон Чэртан Колінз (1848—1908), англійскі крытык.

22 снежня — ГАННА ЗІМОВАЯ

Свет і сусвет чалавека

22 снежня — дзень зімовага сонцастаяння — прыродная з'ява, у час якой у Паўночным паўшар'і самы кароткі дзень і самая доўгая ноч. У народнай міфалогіі лічылася, што ў гэты дзень Сонца канчаткова памірае, а ў ноч з 24 на 25 снежня яно «перанародзіцца» і дзень пачне паступова павялічвацца. У народзе казалі: «Сонца паварочвае на лета, а зіма — на мароз».

● Святая Ганна, маці Прасвятой Багародзіцы, малодшая дачка святара Матфана з Віфлеема, выйшла замуж за святога Іаакіма, родам з Галіі. Толькі пасля дваццаці гадоў гарачых малітваў анёл абвясціў ім аб зачацці Дачкі, якую будзе блаславіць увесь чалавечы род. Зачацце адбылося ў Іерусаліме, дзе пазней і нарадзілася Прасвятая Дзева, якую назвалі Марыяй. Праведнай Ганне моляцца пры бяздзетнасці, а ў царкоўным праваслаўным календары ёсць свята ў гонар Зачацця праведнай Ганнаю Прасвятой Багародзіцы.

● У гэты дзень забаранялася брацца за вялікую і цяжкую працу, асабліва цяжарным жанчынам, пры гэтым ім абавязкова трэба было пасціцца: «На зачацце святой Ганны цяжарным бабам пост».

● Паступова наладжвалася санная дарога, таму прыгаворвалі: «На Ганкі запрагай каня ў санкі», «На Ганкі сядайце на санкі».

● У некаторых рэгіёнах Беларусі ў гэты дзень выконвалі абрад «пераварочвання». Раніцай гаспадары абходзілі падворак і ўсё, што можна было, перакульвалі або пераварочвалі: хатнюю жывёлу ставілі галавой да дзвярэй, перасыпалі зерне, прыгатаванае для сяўбы, і г.д. Усе гэтыя дзеянні былі скіраваны на тое, каб «перавярнуць» гаспадарку на новае лета — «на лета і да росту».

Аксана КАТОВІЧ, Янка КРУК.

Фота Алены ЖАЛКЕВІЧ.

У мінскім Палацы культуры і спорту чыгуначнікаў прайшла выстава навагодняй фларыстыкі. Цудоўныя кампазіцыі з дроту, сухацветаў не толькі беларускіх, але і афрыканскіх, сталі цудоўным падарункам для родных на святы.

Гандляваў... школьніцай

У Мінску ўзбуджана крымінальная справа ў дачыненні да 22-гадовага беспрацоўнага, які «зарабляў» з дапамогай 14-гадовай школьніцы — быў яе сутэнёрам.

Раней судзімы за крадзеж мінчанін зноў трапіў у поле зроку праваахоўнікаў. На гэты раз у дачыненні да яго вялося расследаванне па факце схілення да спажывання наркатычных сродкаў, псіхатропных рэчываў і іх прэпаратаў. Тут і высветлілася дадатковая акалічнасць: устаноўлена, што падазроны з чэрвеня па лістапад выкарыстоўваў для занятку прастытуцыяй вучаніцу восьмага класа. У дачыненні да яго і на падставе гэтага факта ўзбуджана крымінальная справа.

Ігар ГРЫШЫН.

Zамор'е

ГАДЗІННІК МАНДАРЫНА?

Мясцовыя спецыялісты былі ўпэўнены, што магільня, якую лічаць адным з помнікаў дынастыі Мін, заставалася некранутай на працягу 400 гадоў.

Падчас здымак дакументальнага фільма аб даследаванні старажытных кітайскіх магільняў у рэгіёне Гуансі археолагі і журналісты выявілі мініяцюрны швейцарскі гадзіннік. Калі археолагі счышчалі пясок і гліну з паверхні дамавіны, ад яго адляцеў нейкі прадмет маленькага памеру, які бразнуўся аб камяні з металічным гукам. Спачатку навукоўцы прынялі гэты прадмет за кольца, але калі яго ачысцілі ад пылу, высветлілася, што гэта мініяцюрны гадзіннік, на ўнутраным боку якога выгравіравана «Swiss» («Швейцарыя»). Стрэлкі спыніліся ў 10:06. Пасля знаходкі гадзінніка было вырашана прыпыніць раскопкі. У хуткім часе з Пекіна павінны прыбыць даследчыкі, якія дапамогуць разабрацца, калі і пры якіх абставінах гадзіннік патрапіў у магільню.

НА ЧЫНОЎНІКАЎ НАЦКАВАЛІ ПРУСАКОЎ

Пратэстуючы супраць антысанітарных умоў пражывання, жыхары аднаго з маргінальных мікрараёнаў Аркасітас, што на поўдні Мадрыда, запусцілі ў будынак раённай управы процьму прусакоў.

Стаміўшыся ад бяздзейнасці мясцовых уладаў, якія нічога не рабілі супраць засілля ў жылых будынках грызуноў і прусакоў, дзясяткі жыхароў мікрараёна Аркасітас прайшлі маршам пратэсту. У шматлікіх удзельнікаў маршу былі з сабой слоікі са злоўленымі прусакамі, і калі да маніфестантаў выйшлі супрацоўнікі раённай управы, пратэстоўцы выпусцілі насякомых у будынак.

Раён Аркасітас з'явіўся ў канцы 50-х гадоў мінулага стагоддзя. Тут у самаробных халупах сяліліся перасяленцы з поўдня Іспаніі, якія прыязджалі ў сталіцу на заробкі. У пачатку 70-х халупы былі заменены на сучасныя будынкі, пабудаваныя для маламаёмасных, у асноўным, за кошт дзяржавы. З пачатку цяперашняга дзесяцігоддзя ў мікрараёне селяцца выхадцы з Лацінскай Амерыкі і Паўночнай Афрыкі. З 60-х гадоў у Аркасітас дзейнічаюць так званыя Асацыяцыі суседзяў, якія націскаюць на мясцовую адміністрацыю з мэтай паляпшэння ўмоў жыцця ў гэтым мікрараёне.

ЯПОНЦЫ СТВАРЫЛІ ЖАХЛІВУЮ ДЗЯЎЧЫНКУ-РОБАТА

У Токіо японскія навукоўцы прадэманстравалі публіцы робата са знешнасцю пяцігадовай дзяўчынкі. «Рыплі R-1» валодае мяккай сіліконавай скурай, мадэль забяспечаная 50 сэнсарамі і маторамі, якія дазваляюць ёй рухацца і рэагаваць на тое, што адбываецца навокал, капіруючы паводзіны чалавека.

Робат, створаны навукоўцамі з Осакі, умее нават моргаць — па словах стваральнікаў, гэта самы «людскі» андроід з усіх, якія цяпер існуюць. Рыплі была створаная, каб дапамагаць састарэлым і інвалідам — напрыклад, яна можа падаваць рэчы. Карпарацыя Cyberdyne мае намер ужо ў бліжэйшы час паставіць вытворчасць мадэлі на паток. Паводле меркаванняў навукоўцаў, знешнасць пяцігадовай дзяўчынкі павінна палегчыць узаемадзеянне з робатам. Аднак, як адзначае брытанскі таблоід The Sun, выглядае юнае стварэнне жахліва — малая нібы выйшла з японскага фільма жахаў.

Рыплі R-1 — «малодшая сястра» Рыплі Q-1, створаны у 2005 годзе. Прафесар Хірошы Ісігура, які распрацаваў андроіда, лічыць, што калі-небудзь людзі будуць падманвацца, прымаючы робатаў за сабе падобных. Рыплі «можа ўзаемадзейнічаць з людзьмі, яна адказвае на дотыкі. Гэта вельмі радасна, аднак перад намі несумнеўна яшчэ вялікі шлях, які неабходна прайсці», — расказвае прафесар. Па словах Ісігура, пакуль што распазнаць робата можна за 5—10 секунд. Аднак «пры дбайным выбары сітуацыі» ён здольны прыкідвацца чалавекам аж да 10 хвілін, расказвае стваральнік.

«ВАДКІЯ КОСТКІ» ЎЖО НЕ ФАНТАСТЫКА

Новы хімічны састаў, які нагадвае па вонкавым выглядзе зубную пасту, здольны стаць новым рашэннем для ўзнаўлення або замены касцявой тканкі чалавека, распрацавалі медыкі Вялікабрытаніі.

Новы раствор, названы «вадкімі косткамі», уводзіцца ў пашкоджаны ўчастак прыроднай касцявой тканкі чалавека шляхам шпрыцавай ін'екцыі, дзе ён паспяхова застывае, ствараючы субстанцыю, якая па трываласці і ўласцівасцях амаль ідэнтычная сапраўдным косткам. Распрацоўшчыкі кажуць, што іх тэхналогія дазваляе не толькі аднаўляць касцявую тканку, але таксама можа быць выкарыстаная для адраснай дастаўкі стваламых клетак у зададзеную зону. Створаная кампанія RegenTec і ўніверсітэт займаюцца пошукам шляхоў камерцыялізацыі сваёй распрацоўкі. Новая тэхналогія таксама дазваляе пазбегнуць пераломy саслабелых костак і абараніць суседнія вобласці. Спецыялісты адзначаюць, што пасля зацвярдзення штучнай косткі, матэрыял створыць аднастайнае няпорыстае асяроддзе, якое валодае той жа цеплаправоднасцю, што і сапраўдныя косткі, таму тэмпературны баланс у арганізме пасля ін'екцыі не будзе парушаны, што захавае ад разбурэння клеткі цела, якія знаходзяцца паблізу.

САМЫЯ ДЗІЎНЫЯ НАВІНЫ 2008 ГОДА

Або самыя моцныя, самыя маленькія і самыя бязглуздыя

Брытанская газета The Daily Telegraph склала рэйтынг самых папулярных у чытачоў артыкулаў, якія публікавала ў гэтым годзе. Больш за ўсё чытачы цікавіліся нататкамі пра «чалавека-дрэва», самую маленькую дзяўчынку ў свеце і непрыстойную эмблему брытанскага Гандлёвага ўпраўлення.

1. ЧАЛАВЕК-ДРЭВА

Аповед пра інданезійскага рыбака, чыя скура з-за хваробы пакрылася выродлівай «карой», упершыню патрапіў на старонкі газет яшчэ ў 2007 годзе. Аднак чытачы працягвалі ўважліва сачыць за лёсам Дэдэ і пасля. Дзякуючы дапамозе амерыканскага доктара, мужчына з вострава Ява змог часткова пазбавіцца ад нарастаў, пачаў самастойна хадзіць і навучыўся трымаць ручку. Зараз ён спадзяецца знайсці жонку — папярэдняя сышла ад яго, калі ён захварэў.

2. МАЛЕНЬКАЯ, АЛЕ ШЧАСЛІВАЯ

Йоці Амге з Індыі ўжо 15 гадоў, але яе рост складае ўсяго 33 сантыметры, а вага — 5 кілаграмаў. Урачы сцвярджаюць, што яна больш не вырасце, аднак саму Йоці яе мініяцюрны целасклад не бянтэжыць. Яна ходзіць у школу разам з вялікімі аднагодкамі (хоць ёй прыходзіцца сядзець за спецыяльна выраб-

ленай мініяцюрнай партай) і лічыць сябе самай звычайнай дзяўчынкай.

3. «ТРЫ ВЯСЁЛЫЯ ЛІТАРЫ» ЗА 14 ТЫСЯЧ ФУНТАЎ

Супрацоўнікі брытанскага Гандлёвага ўпраўлення выдаткавалі на распрацоўку новага лагатыпа для сваёй арганізацыі 14 тысяч фунтаў стэрлінгаў, хоць за гэтыя грошы проста напісалі тры літары са сваёй абрэвіятуры (OGC). Жартаўнікі тут жа выявілі, што, калі павярнуць новую эмблему на 90 градусаў, яна ператворыцца ў непрыстойны малюнак.

4. САМЫЯ РАЗДРАЖНЯЛЬНЫЯ ФРАЗЫ

Даследчыкі Оксфардскага ўніверсітэта склалі спіс 10 выразаў, якія выклікаюць у брытанцаў найбольшае раздражненне. Першае месца заняў выраз «у рэшце рэшт». Непісьменным словазлучэнням «даволі ўнікальны» і «асабіста я» дасталіся другое і трэцяе месцы ў ганебным спісе.

5. ЛЕАПАРД, ЯКІ ЗАДРАЎ КРАКАДЗІЛА

Унікальная серыя фотаздымкаў, якая захавала бойку леапарда з кракадзілам у афрыканскай саване, імгненна разляцелася па інтэрнэце. Гіганцкая кот-

ка накінулася на кракадзіла і пасля крывавай пяцізхвіліннай сутычкі здолела задушыць яго.

6. «ПЛАСТЫЧНАЯ АПЕРАЦЫЯ» З ДАПАМОГАЙ АЛЕЮ

Карэянка, шалёна захопленая пластычнай хірургіяй, знявечыла сябе да непазнавальнасці, запампаваўшы пад скуру твару харчовы алей замест ботаксу. Апублікаваныя ў газетах здымкі выклікалі бурную рэакцыю ў грамадстве, і ў выніку чуллівыя грамадзяне сабралі ёй грошы на аперацыю па выратаванні твару.

7. ПАЛЁТ ПІНГВІНАЎ

Фенаменальны поспех меў рэпартаж BBC аб выяўленні ў Антарктыдзе пінгвінаў, здольных лятаць. Карпарацыя паказала ўнікальныя кадры таго, як гэтыя птушкі ўзімку здзяйсняюць доўгія пералёты, каб нацешыцца сонцам у джунглях Амазонкі. Рэпартаж пра цуд эвалюцыі выйшаў у эфір першага красавіка і, натуральна, быў жартам.

8. ЛІК ПІ Ў ЯЧМЕННЫМ ПОЛІ

Незвычайны круг палеглага ячменю быў знойдзены ўлетку ў графстве Уілтшыр. У малюнку дыяметрам 45 метраў, як высветлілася, закадзіраваныя першыя дзесяць знакаў ліку Пі — 3,141592654. Чытачы з вялікай цікавасцю разглядалі таксама галерэю з 10 самых незвычайных кругоў на палях Вялікабрытаніі.

9. ЦНАТЛІВАСЦЬ ЗА МІЛЬЁН ЕЎРА

Рафаэла Фіка, удзельніца італьянскага рэаліці-шоу, патрапіла ў газеты ўсяго свету, абвясціўшы, што прадасць сваю цнатлівасць любому, хто гатовы заплаціць выкласці за гэта круглую суму. Фотамадэль заявіла, што плануе выдаткаваць грошы на набыццё дома ў Рыме і на аплату курсаў акцёрскага майстэрства.

10. СЭКС З ТЫСЯЧАЙ МАШЫН

57-гадовы Эдвард Сміт, які пакутуе на «механафілію», не пасаромеўся абмеркаваць свае сэксуальныя схільнасці з газетчыкамі. Цяпер яго «сяброўка» — гэта аўтамабіль «Фальксваген-Жук». А самым сваім незвычайным эксперыментам Сміт называе сэкс з верталётам. З жанчынамі ён не сустракаўся ўжо 12 гадоў.

Шчырыя віншаванні і найлепшыя пажаданні любячай матулі, клапатлівай бабулі і цётачцы **Ганне Андрэеўне АСІНСКАЙ** з Астрашыцкага Гарадка з нагоды 85-годдзя.

Бачыць твар твой
з маршчынкамі мілы
Мы б хацелі цяпер і заўжды.
Хай жа Божухна
дасць табе сілы
І не шле анякай бяды.
Родныя.

Шчырыя прывітанні і найлепшыя пажаданні ў жыцці з нагоды надыходзячага Новага года ***адна-курснікам Мсціслаўскага будаўнічага вучылішча № 92 групы № 17 Магілёўскай вобласці выпуску 1970 г.***

Уладзімір Антонавіч КОРЗАН з Шаркоўшчыны.

СЁННЯ

Сонца

	Усход	Захад	Даўжыня дня
Мінск —	8.25	15.49	7.24
Віцебск —	8.23	15.31	7.08
Магілёў —	8.16	15.39	7.23
Гомель —	8.04	15.44	7.40
Брэст —	8.39	16.05	7.26
Гродна —	8.31	16.15	7.44

Месяц

Апошняя квадра.
Месяц у сузор'і Шаляў.

Імяніны

Пр. *Амбросія, Антона, Івана, Міхаіла, Нікіфара, Ніла, Паўла, Сяргея.*

К. *Багумілы, Дамініка, Ігната, Тэафіла, Яўгена.*


Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

ХАТНЯЯ ЭНЦЫКЛАПЕДЫЯ

РЫХТУЕМСЯ ДА СВЯТА

Святочны дэкор

На святочным стале ўсё павінна быць выдатным — і ежа, і сервіроўка, тым больш на навагоднім стале, бо, як сцвярджае легенда, гэта дапаможа «прыцягнуць» у дом удачу і багацце.

Новы год — свята асабліве, таму без чыстага, накрухмаленага настольніка не абысціся. Цырату, няхай і вельмі прыгожую, лепш схаваць далей. Калі ў вас ёсць толькі адзін настольнік — белы, не засмучайцеся. Гэта тое, што трэба! З белым выдатна спалучаюцца іншыя колеры. Адзін з магчымых варыянтаў — спалучэнне белага і залатога. У вас напэўна знойдзецца сервіз з белага фарфору з залатой паласой. Расстаўце на стале талеркі, а на іх пакладзіце белыя сурвэткі, скручаныя трубачкай з металічнымі пазалочанымі кольцамі. Калі кольцаў для сурвэтак няма, склейце іх з кардону і абкруціце залатой фольгай. Пад салатнікі і блюды са стравамі можна выразаць ажурныя сняжынкі, а пад іх пакласці таксама фольгу.

Зрэшты, сурвэткі (як і настольнікі) могуць быць і кантрастнымі па колеру — чырвонымі, зялёнымі, сінімі і г.д. Важна, каб колер сурвэтак спалучаўся з колерам посуду.

Аднак дэкор святочнага стала выбарам настольніка і сурвэтак не абмяжоўваецца. Вазьміце на заметку яшчэ некалькі ідэй:

❄ традыцыйныя прадметы сервіроўкі можна замяніць незвычайнымі. Напрыклад, у якасці блюда для садавіны скарыстайце невялікія круглыя ці авальныя люстэркі;

❄ прысмакі падайце ў кардонках, абклееных рознакаляровай паперай, а каб яны выглядалі яшчэ святочней, упрыгожце іх мішурой і невялікімі ёлачнымі цацкамі ці кавалачкамі лімона і мандарына;

❄ кулінары ўсяго свету ўзялі на ўзбраенне ідэю: на дно келіхаў класці свежыя ці замарожаныя ягады. На навагоднім стале яркія ягады малін ці клубніц у келіхах будуць адпавядаць святочнаму настрою. А калі вы вып'еце віно, гэтыя ягады стануць канчатковым смакавым акордам. Пакласці ягады ў келіхі трэба загадзя, бо нават пустыя з ягадамі яны вельмі ўпрыгожаць стол.

РАІМ ПРЫГАТАВАЦЬ

Фруктовы торт

Напярадзе нас чакае самая смачная ноч у годзе. Гаспадыні стараюцца здзівіць сваіх гасцей і блізкіх рознымі прысмакамі. А паколькі наступны 2009 год — год Быка, а быкі, як вядома, вегетарыянцы, то і на стале павінна быць паболей страў з агародніны, зеляніны, садавіны.

Для цеста: *1 шк. цукру, 3 яйкі, 1 шк. мукі, соль на смак.*

Для начынкі: *500 г тварагу, 1 шк. цукру, 100 г масла, 2 ст. лыжкі жэлаціну, грэцкія арэхі, 1 пакецік паўфабрыкату жэле, любыя фрукты (бананы, ківі, мандарыны).*

Разатрыце дабяла яйкі з цукрам, дадайце муку, соль, усё старанна перамяшайце. Цеста пакладзіце ў раз'ёмную форму, змазаную маслам, выпякайце бісквітную аснову на працягу 20 хвілін.

Для прыгатавання начынкі творог разатрыце з цукрам і размяканым маслам. Заліце цёплай вадой жэлацін, дайце яму разбухнуць, пастаўце на слабы агонь, каб жэлацін растаў. Астудзіце, выліце ў творожную масу. Дадайце здробненыя арэхі і, па жаданні, цукаты, старанна перамяшайце. Гатовую масу вылажыце на бісквіт. Зверху ўпрыгожце торт кружочкамі банана і ківі, долькамі мандарынаў. Заліце ўсё жэле, прыгатаваным з паўфабрыкату. Гатовы торт пастаўце ў халадзільнік.

-2546-

РАПТАМ СПАТРЭБІЦЦА

Куды паставіць ёлку

Жывая, духмяная, прыбраная ёлка, безумоўна, дорыць нам адчуванне свята, чараўніцтва і нават магіі. Лічыцца, што яркія бліскучыя цацкі адганяюць злых духаў, а розныя прысмакі, наадварот, дапамагаюць задобрыць і прывабіць добрых істот. Як бачыце, ёлка не такая ўжо і простая, як здаецца на першы погляд. Нават модная сёння кітайская навука фэн-шуй адводзіць важнае месца таму, як выглядае ёлка і асабліва — дзе яна стаіць. Правільнае месцазнаходжанне гэтага магічнага дрэва ў пакоі можа прынесці ў дом дастатак, зрабіць кар'еру, выканаць іншыя самыя запаветныя жаданні.

Лепш за ўсё, вядома, калі навагодняя ёлка стаіць у цэнтры — у гэтым выпадку яна дорыць максімум усяго добрага, г.зн. аддае нам усю карысць, якую толькі можна, аб'ядноўвае людзей вакол сябе, дапамагае ім дружна дасягаць пастаўленых мэтаў. Аднак не заўсёды ёсць магчымасць заняць ёлкай цэнтральную частку пакоя. Калі ўмовы кватэры не дазваляюць гэта зрабіць, прыслухайцеся да іншых парад.

Ёлка, якая стаіць насупраць дзвярэй, дапамагае гаспадарам жыльля адчуць сваю значнасць, дасягнуць кар'ернага росту, адчуць упэўненасць. Калі вашу сям'ю праследуюць непаразуменні і сваркі, пастаўце ёлку злева ад дзвярэй і ўпрыгожце яе чырвонымі і залацістымі шарыкамі, залатой мішурой. Дальні левы куток пакоя звязвае з матэрыяльным дабрабытам, таму можаце спадзявацца на паляпшэнне фінансавага стану пры ўмове, што ёлку паставіце туды і павесіце на яе бліскучыя манеткі. Калі ж вас цікавіць развіццё вашай асобы, раскрыццё творчага патэнцыялу, то навагодняя прыгажуня павінна стаяць недалёка ад уваходных дзвярэй, лепш злева ў бліжэйшым ад уваходу кутку.

Блізкія, інтымныя адносіны святочная ёлка дапаможа асвяжыць, калі будзе стаяць у дальнім правым кутку. Калі ж ваша ёлачка прызначана парадаваць дзяцей, яе месца справа, але не ў кутку, а ўздоўж правай сцяны.

ПАДКАЗКІ БЫВАЛЫХ

Навагоднія хітрасці

❄ Выбіраючы елку, звярніце ўвагу на тое, каб дрэўца было свежым. У свежай елкі галінкі эластычныя — паламаць іх цяжка, у сухой галінкі ломяцца з трэскам.

❄ Каб елачка прастаяла даўжэй, яе трэба крыху падсячы, абчысціць канец ад кары і паставіць у ваду, апусціўшы на 8—10 см. У ваду дадаць чайную лыжку агароднага ўгнаення ці таблетку аспірыну з чайнай лыжкай цукру і невялікай колькасцю солі ці чайную лыжку гліцэрыны.

❄ Гурманы лічаць, што лепшае шампанскае тое, што не змяшчае цукру. Вядома, гэта брут. Аднак... усё ж выбірайце на свой густ.

У ідэале бутэльку падаюць у металічным вядзерцы з лёдам, дзе тэмпература каля 7—9 °С. Пераахалоджваць напітак не варта: не раскрыюцца смакавыя адценні. Наліваюць шампанскае ў высокія тонкія бакалы, каб бурбалкі газу не выпарваліся надта хутка. Трымаць бакал трэба за ніжні край ножкі: так шампанскае застанецца халаднаватым і не нагрэецца ў вашай руцэ.

❄ Сімвал будучага года — Бык. Ён увасабляе працавітасць і сямейнасць. Гэтая вялікая і моцная жывёліна валодае спагадлівасцю і бясконцай дабрынёй, яна паважае сямейныя каштоўнасці, не церпіць мітусні, таму Новы год лепш сустракаць дома. У святочным адзенні трэба адмовіцца ад празмернага бляску і яркіх колераў. Колеры наступнага года — цёплыя і спакойныя: розныя адценні жоўтага, карычневага, аранжавага. Паклапаціцеся і аб тым, каб у пакоі, дзе вы будзеце святкаваць, прысутнічалі рэчы з натуральных матэрыялаў.

-2547-

НАДВОР'Е на заўтра

Геамагнітныя ўзрушэнні



...у суседзяў

ВАРШАВА	+1..+3°С	КІЕЎ	-7..-5°С	РЫГА	+2..+4°С
ВІЛЬНЮС	-1..+1°С	МАСКВА	-8..-6°С	С.-ПЕЦЯРБУРГ	-1..+1°С

Усміхнёмся!

— Што з табой здарылася?

— Тэрарысты... Яны захапілі мой страўнік і патрабуюць піва...

☺

І аб набалелым... Печань!

☺

— Ты прыйдзеш на маё вяселле?

— Калі?

— У пятніцу.

— Ты з кім жэнішся?

— З табой.

— Тады прыйду.

☺

Што нам, мужчынам, не падабаецца ў хатняй працы, дык гэта яе аднастайнасць:

прыбраў ложак, выцер пыл, прапыласосіў... І праз паўгода пачынай усё зноў!

☺

— Д'Артаньян, а колькі ў вас было жанчын?

— Шмат,васпан, шмат... Чатыры!

— Усяго?..

— Не! Гэта не ўсё! Я ўзгадаў яшчэ адзін выпадак... Пяцьдзесят шэсць!

☺

— Я чула, ваша Сара замуж выходзіць.

— Так. Выходзіць патроху...

— Чуеш, як цябе... маўр! Ты мужык спрактыкаваны, я вось хачу параіцца з табой па сямейным пытанні...

ЗВЯЗДА
БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА
ЗАСНАВАЛЬНІКІ: Савет Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Палата прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Савет Міністраў Рэспублікі Беларусь
РЭГІСТРАЦЫЙНЫ НУМАР 1.

Галоўны рэдактар У. НАРКЕВІЧ. РЭДАКЦЫЙНАЯ КАЛЕГІЯ: І. БАРАНОЎСКІ, С. ГРЫБ, У. ЗДАНОВІЧ (намеснік галоўнага рэдактара), Н. КАРПЕНКА, Л. ЛАХМАНЕНКА, Т. ПАДАЛЯК, С. ПРОТАС (намеснік галоўнага рэдактара), С. РАСОЛЬКА, Л. РЫЖАНКОВА (першы намеснік галоўнага рэдактара), Л. СВІДРЫЦКАЯ, А. СЛАНЕЎСКІ (намеснік галоўнага рэдактара), В. ЦЕЛЯШУК, І. ШЧУЧЭНКА.

НАШ АДРАС: 220013 г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10-а.

ТЭЛЕФОНЫ: прыёмнай – 287 19 19 (тэл./факс); аддзелаў: пісьмаў — 287 18 64, падпіскі і распаўсюджвання — 287 18 36, 287 18 51, юрыдычнага — 287 19 68, сакратарыята — 292 05 82, адказных за выпуск дадаткаў: «Чырвоная змена» — 292 44 12; «Мясцовае самакіраванне» — 292 21 03, упасных карэспандэнтаў: у Брэсце: 20 37 98, Віцебску: 43 23 74, Гродне: 43 25 29, Гомелі: 74 13 92, Баранавічах: 7 26 02, Магілёве: 32 74 31; бухгалтэрыі: 292 22 03; прыём рэкламы тэл./факс: 287 17 79, *e-mail: reklama@zvyazda.minsk.by*, рэдактар рэкламнага аддзела — тэл./факс 292 04 52.

http://www.zviazda.by;

e-mail: info@zvyazda.minsk.by

Аўтары апублікаваных матэрыялаў нясуць адказнасць за падбор і дакладнасць фактаў. Іх меркаванні не заўсёды супадаюць з меркаваннем рэдакцыі. Рэдакцыя па сваім меркаванні адбірае і публікуе адрасаваныя ёй пісьмы. Перадрук матэрыялаў, апублікаваных у «Звяздзе», толькі з дазволу рэдакцыі.

Матэрыялы, пазначаныя гэтым значком, носяць рэкламны характар. Адказнасць за змест рэкламы нясуць рэкламадаўцы.

Газета аддрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку».
Мінск, пр. Незалежнасці, 79. Выходзіць 250 разоў на год.
Тыраж 32.333 Індэкс 63850. Зак. № 7068. Нумар падпісаны ў 19.30.
М 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12
П 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12